POLOTSK STATE UNIVERSITY • ПОЛАЦКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ

1581

DOCENDO DISCIMUS

# ПОЛОЦКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ УНИВЕРСИТЕТ:

## ИСТОКИ, ИСТОРИЯ СТАНОВЛЕНИЯ И ДЕЯТЕЛЬНОСТЬ

*(к 40-летию основания)*

Новополоцк
ПГУ
2008

# ПОЛАЦКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ:

## ВЫТОКІ, ГІСТОРЫЯ СТАНАЎЛЕННЯ І ДЗЕЙНАСЦЬ

*(да 40-годдзя заснавання)*

Наваполацк
ПДУ
2008

УДК 378.4(091)(476.5-21)
ББК 74.584(4Беи)738.1г
П49

Рэкамендавана да выдання
Вучоным саветам ПДУ (пратакол № 6 ад 29.02.08)

АЎТАРЫ:
Т.В. Ганчарова, Т.М. Глазырына, Т.А. Грудніцкая, Дз.У. Дук, У.А. Лобач,
А.В. Кулеш, У.С. Філіпенка, С.Б. Філіпенкава, М.М. Шляймовіч,
А.А. Шышкоў, А.І. Шэндэль

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ:
Дз.М. Лазоўскі (галоўны рэдактар),
Дз.У. Дук (адказны за выпуск, намеснік галоўнага рэдактара),
Э.М. Бабенка, У.С. Філіпенка, Т.М. Глазырына, Т.А. Грудніцкая

П49 **Полацкі дзяржаўны універсітэт** : вытокі, гісторыя станаўлення і дзейнасць (да 40-годдзя заснавання). – Наваполацк : ПДУ, 2008. – 312 с. : фота
ISBN 978-985-418-662-7.

Юбілейнае выданне прысвечана 40-годдзю Полацкага дзяржаўнага універсітэта. Гісторыя вышэйшай навучальнай установы прадстаўлена ў шырокай рэтраспектыве часу – з моманту заснавання папярэдніка ПДУ – езуіцкага калегіума (акадэміі) у 1581–1820 гг. Кніга ўтрымлівае матэрыялы, якія характарызуюць навуковую, спартыўную, культурную і міжнародную дзейнасць універсітэта, станаўленне структуры і матэрыяльнай базы. Пры падрыхтоўцы выдання выкарастаны крыніцы Дзяржаўнага занальнага архіва ў г. Полацку, архіва ПДУ, музея навукі і асветы Полаччыны, фотаматэрыял з асабістых архіваў супрацоўнікаў ПДУ.

Кніга прызначана для студэнтаў, навуковых супрацоўнікаў, шматлікіх выпускнікоў універсітэта і ўсіх зацікаўленых у вывучэнні гісторыі адукацыі і культуры Полаччыны.

**УДК 378.4(091)(476.5-21)**
**ББК 74.584(4Беи)738.1г**

**ISBN 978-985-418-662-7**

© УА «Полацкі дзяржаўны універсітэт», 2008

# Шаноўныя сябры!

У 2008 г. Полацкі дзяржаўны універсітэт святкуе сваё 40-годдзе. Заснаваны ў 1968 г., універсітэт прайшоў шлях ад філіяла Беларускага політэхнічнага інстытута (1968 г.), філіяла Беларускага тэхналагічнага інстытута імя С.М. Кірава (1969 г.), Наваполацкага політэхнічнага інстытута (1974 г.) да Полацкага дзяржаўнага універсітэта (1993 г.). Сёння ПДУ – гэта класічны універсітэт еўрапейскага тыпу, які размешчаны ў двух гарадах – Наваполацку і Полацку. Гісторыя універсітэта пачыналася ў 1968 г. з адкрыцця тэхнічных спецыяльнасцяў для будаўнічых і прамысловых патрэб маладога горада Наваполацка – буйнейшага цэнтра нафтахімічнай прамысловасці былога СССР. У 1993 г., з пераўтварэннем НПІ ва універсітэт класічнага тыпу, пачалі адраджацца традыцыі гуманітарнай адукацыі, якія плённа развіваюцца ў наш час.

Універсітэт з'яўляецца спадкаемцам традыцый адукацыі Полацкай зямлі з 1581 г., калі ў г. Полацку быў заснаваны езуіцкі калегіум. У 1812 – 1820 гг. калегіум меў статус акадэміі з правамі універсітэта і з'яўляўся першай вышэйшай навучальнай установай на беларускіх землях. У старажытных мурах калегіума навучаліся і выкладалі многія знакамітыя асобы, якія зрабілі значны ўнёсак у справу развіцця айчыннай і еўрапейскай адукацыі і навукі.

Полацкі дзяржаўны універсітэт з'яўляецца пераемнікам лепшых здабыткаў адукацыйных традыцый Полацкай зямлі. Адраджэнне вышэйшай адукацыі ў Полацку пачалося з 2003 г., калі адбылася ўрачыстая перадача карпусоў былой акадэміі Полацкаму дзяржаўнаму універсітэту. Сёння ў рэканструяваных карпусах XVIII ст. размяшчаецца гісторыка-філалагічны факультэт з сучасным матэрыяльна-тэхнічным забеспячэннем.

Полацкі дзяржаўны універсітэт сёння – гэта 1250 работнікаў установы (з іх – 445 чалавек прафесарска-выкладчыцкага складу), больш чым 8 тысяч студэнтаў, якія навучаюцца на 10 факультэтах: геадэзічным, інжынерна-будаўнічым, гісторыка-філалагічным, машынабудаўнічым, радыётэхнічным, спартыўна-педагагічным, тэхналагічным, фінансава-эканамічным, юрыдычным, падрыхтоўкі да вышэйшай школы. Ва універсітэце працуюць 19 прафесараў, дактароў навук, 145 дацэнтаў, кандыдатаў навук, ажыццяўляецца набор па 38 спецыяльнасцях агульнатэхнічнага і гуманітарнага профіляў.

Гісторыю ПДУ немагчыма ўявіць без шматгадовай плённай працы ветэранаў універсітэта, многія з якіх і сёння сваім прыкладам натхняюць маладое пакаленне на новыя творчыя здзяйсненні. Каштоўны вопыт ветэранаў працы з'яўляецца красамоўным прыкладам самаадданага служэння навуцы.

Полацкі дзяржаўны універсітэт – гэта адукацыйны, навуковы і культурны цэнтр Полаччыны. «З першага курса – у адукацыю, навуку, творчасць!» – такімі словамі універсітэт штогадова вітае студэнтаў. З першых дзён навучання для студэнтаў ствараюцца ўсе ўмовы для развіцця творчай, дзейснай асобы. Студэнты Полацкага універсітэта рэалізуюць свае творчыя памкненні ў навуковых студэнцкіх таварыствах і аб'яднаннях па інтарэсах. Маладыя людзі штогод павышаюць свой адукацыйны патэнцыял праз удзел у шматлікіх мерапрыемствах навуковай і культурнай скіраванасці. Як вынік – больш 100 студэнцкіх навуковых работ штогод прымаюць удзел у Рэспубліканскім конкурсе НДРС, з іх большая частка вызначаецца як пераможцы і ўладальнікі ўзнагарод рознага ўзроўню.

ПДУ назаўжды застанецца alma mater для вялікай колькасці спецыялістаў у розных галінах народнай гаспадаркі, адукацыі і культуры. Універсітэт падтрымлівае цесныя сувязі з буйнейшымі прамысловымі прадпрыемствамі Віцебшчыны, набор на спецыяльнасці збалансаваны дзеля забеспячэння патрэб развіцця рэгіёна.

Калектыў выкладчыкаў і супрацоўнікаў ПДУ працуе для студэнтаў і разам з імі дзеля сацыяльна-эканамічнага і культурнага росквіту Полаччыны і роднай Беларусі.

Рэктар Полацкага дзяржаўнага універсітэта,
доктар тэхнічных навук, прафесар Дз.М. Лазоўскі

# Традыцыі адукацыі на Полацкай зямлі (1581 – 1968 гг.)

*Полацк – бацька гарадоў нашай Бацькаўшчыны. Таму ці трэба здзіўляцца, што менавіта тут паўстаў першы беларускі мураваны храм – Святая Сафія; менавіта ў ім уладарыў першы на нашай зямлі правіцель-«кніжнік» – князь Ізяслаў, менавіта адсюль, ад прападобнай Еўфрасінні пайшлі па Беларусі промні асветы; менавіта яго слаўны сын – Францыск Скарына даў нашаму народу друкаванае слова? І тады зусім не выпадкова, што якраз у Полацку ўзнікла першая вышэйшая навучальная ўстанова на тэрыторыі сучаснай Беларусі – Полацкая езуіцкая акадэмія.*

*Старажытны цэнтр хрысціянства Полацк мае даўнія традыцыі ў сферы адукацыі і выхавання. Справа, распачатая Еўфрасінняй Полацкай, пусціла моцныя карані і дала багаты плён. Падобна да таго, як яна несла свайму народу святло хрысціянскай асветы і вучонасці ўсходняга, візантыйскага ўзору, езуіты злучылі нашых продкаў з не менш слаўнымі асветніцкімі традыцыямі заходнееўрапейскага хрысціянства. На закладзеным прападобнай Еўфрасінняй падмурку леглі пазней камяні Полацкага езуіцкага калегіума і Акадэміі, на іх – Полацкага вышэйшага піярскага вучылішча і Полацкага кадэцкага корпуса, потым – Наваполацкага політэхнічнага інстытута і, нарэшце, паўстаў сучасны храм адукацыі і навукі – Полацкі дзяржаўны універсітэт.*

## Полацкі езуіцкі калегіум у 1581 – 1640-я гг.

На працягу XV – XVI стст. вяртанне багацейшай культурнай спадчыны эпохі Антычнасці, вынаходніцтва друкарскага варштата, адкрыццё шляху ў Амерыку і многія іншыя зрухі на еўрапейскай культурнай прасторы абудзілі ў Еўропе небывалы інтарэс да ведаў. Узнікаюць дзесяткі новых універсітэцкіх цэнтраў, квітнеюць навукі, расце армія студэнцтва.

Новыя павевы дасягаюць і Вялікага княства Літоўскага. Яшчэ ў 1397 г. першы ліцвін быў залічаны ў Пражскі універсітэт, а ў 1402 г. – у Кракаўскі. За XV – XVI стст. кракаўская alma mater выгадавала каля 700 студэнтаў з ВКЛ! Ліцвіны вучыліся ва універсітэтах Сіены, Падуі, Балонні, Цюбінгена, Эрфурта, Вітэнберга, Лейпцыга, Круляўца (Кёнігсберга) і інш. Неўзабаве дзяржава і грамадства Вялікага княства адчулі патрэбу ў перанясенні дасягненняў еўрапейскай адукацыі і навукі на сваю глебу.

Тым не менш, заснаванне першай вышэйшай навучальнай установы ВКЛ – Віленскай езуіцкай акадэміі (універсітэта) – і яе малодшага брата Полацкага езуіцкага калегіума адбылося не столькі як наступства мэтанакіраванай палітыкі дзяржавы ці арганізаваных намаганняў яе грамадзян. Хутчэй гэткі зыход быў вынікам вострай рэлігійнай барацьбы ў Вялікім княстве паміж рэфармацыйным рухам і абнаўленчымі сіламі рымска-каталіцкай царквы, асабліва яе авангардам – «Таварыствам Ісуса», больш вядомым як езуіцкі ордэн.

Яшчэ ў 1565 г., за некалькі гадоў да з’яўлення на землях ВКЛ, езуіты выступілі з планам заснавання ў Вільні калегіума. Паспешлівасць, з якой гэтая ідэя была ўвасоблена ў жыццё, тлумачылася жаданнем пратэстантаў, галоўных ідэалагічных праціўнікаў езуітаў, стварыць у сталіцы сваю ўстанову падобнага тыпу. Згодна з апошняй воляй Мікалая Радзівіла Чорнага, найбуйнейшага дзеяча Рэфармацыі Беларусі і Літвы і аднаго з багацейшых магнатаў княства, на адкрыццё кальвініcцкай адукацыйнай установы вылучаліся вялікія сродкі. З гарачай падтрымкай гэтага праекту выступаў і стрыечны брат нябожчыка – Мікалай Радзівіл Руды, буйнейшы ваенны і дзяржаўны дзеяч той пары (да 1566 г. займаў

пасады вялікага гетмана і ваяводы трокскага, а пасля – канцлера ВКЛ і ваяводы віленскага), новы лідэр пратэстантаў княства.

У 1569 г. у ВКЛ прыязджаюць першыя езуіты і адразу ж пачынаюць падрыхтоўчую працу па заснаванні калегіума. У 1570 г. установа была адкрыта. З самага пачатку выказвалася думка пра пераходны характар калегіума: на яго базе планавалася адкрыццё універсітэта. Нягледзячы на вельмі высокія патрабаванні да рэалізацыі падобнай задумы (у тым ліку фінансавыя і кадравыя) у 1577 г. папа Грыгорый XIII і кароль і вялікі князь Стэфан Баторый (1576 – 1586) далі згоду на адкрыццё ў Вільні вышэйшай школы. У 1579 г. уладар дзяржавы выдаў Прывілей на адкрыццё Віленскай акадэміі, папская була зацвердзіла наданне калегіуму, а цяпер ужо Віленскай акадэміі і універсітэту «Таварыства Ісуса» (Academia et Universitas Vilnensis Societatis Iesu), статусу вышэйшай навучальнай установы.



*Кароль і вялікі князь Стэфан Баторый*

Утварэнне Віленскай езуіцкай акадэміі заклала грунтоўную базу пад далейшае пашырэнне ўплыву «Таварыства Ісуса» на землях Вялікага княства Літоўскага. Наступнымі напрамкамі экспансіі езуітаў меліся стаць буйнейшыя цэнтры рэфармацыйнага руху і праваслаўя краіны – Нясвіж і Полацк.

На момант адкрыцця ў Вільні універсітэта Полацк па-ранейшаму знаходзіўся ў руках войск маскоўскага цара Івана IV Грознага. Але пасля ўзыходжання на прастол караля Рэчы Паспалітай Стэфана Баторыя (1576 г.) ход Лівонскай вайны патроху змяняўся на карысць «дзяржавы абодвух народаў». Летам 1579 г. аб'яднанае войска Каралеўства польскага і ВКЛ выступіла на Полацк. Штурм горада прыходзілася наладжваць у вельмі неспрыяльных умовах. Ішлі бясконцыя дажджы, і ўсе спробы войска Стэфана Баторыя падпаліць замкавыя ўмацаванні не давалі аніякага плёну. Тады кароль і вялікі князь папрасіў манахаў-езуітаў, якія суправаджалі яго, добра маліцца, каб Бог злітаваўся і дараваў перамогу над маскоўцамі. У выпадку добразычлівага стаўлення Неба да просьбітаў Стэфан Баторый паабяцаў пажалаваць езуітам у адваяваным горадзе і ваколіцах немалыя ўладанні і права засноўваць тут свой кляштар. 30 жніўня 1579 г. маскоўскі гарнізон у Полацку склаў зброю.

Трымаючы дадзенае езуітам слова, у той самы дзень, калі быў узяты Полацк, Стэфан Баторый накіраваў аднаму з ініцыятараў стварэння Віленскага універсітэта і яго першаму рэктару Пятру Скаргу грамату з просьбай разам з іншымі манахамі «Таварыства Ісуса» прыбыць у вызвалены горад.

Пётр Скарга (1536 – 1612) атрымаў выдатную адукацыю ў Кракаве, Вене і Рыме. Пасля ўступлення ў езуіцкі ордэн, з 1573 г., ён актыўна ўключыўся ў барацьбу супраць рэфармацыйнага руху на землях ВКЛ і зарэкамендаваў сябе як глыбокі вучоны-тэолаг, бліскучы аратар-палеміст і апантаны прапаведнік.

Першыя езуіты прыязджаюць у Полацк у 1580 г. Пятра Скаргу, які асабіста вырашыў пазнаёміцца з сітуацыяй у горадзе, суправаджалі Станіслаў Лянчынскі, Ян Аланд і Войцех Гінцый. Нягледзячы на адкрытае супрацьдзеянне з боку мясцовага праваслаўнага насельніцтва і асабліва полацкага ваяводы, былога кальвініста Мікалая Монвіда Дарагастайскага, езуіты здолелі замацавацца ў горадзе. Сам Стэфан Баторый у 1580 і 1581 гг. наведваў Полацк і намагаўся забяспечыць ім любую патрэбную дапамогу. Гэткім чынам пры патранажы самога манарха з 1581 г. распачаў сваю працу Полацкі езуіцкі калегіум – пяцікласная навучальная ўстанова філалагічна-тэалагічнага профілю. У 1582 г. у горадзе была заснавана яшчэ і семінарыя, разлічаная на выхаванне і адукацыю дзяцей беднай шляхты.

Паводле «Статута», асноватворнага дакумента «Таварыства Ісуса», галавой усіх яго навучальных устаноў з'яўляўся генерал Ордэна. Шырокімі паўнамоцтвамі карысталіся яго намеснікі ў правінцыях – правінцыялы (да пачатку 1608 г. на



*Казанне Пятра Скаргі, маст. Я. Матэйка*

тэрыторыі Каралеўства Польскага і Вялікага княства Літоўскага існавала адзіная Польская правінцыя, потым была ўтворана і другая – Літоўская). Правінцыял кіраваў навучальнымі ўстановамі, якія знаходзіліся на даручанай яму тэрыторыі, прызначаў прэфектаў і настаўнікаў, вызначаў для школ правінцыі час пачатку і заканчэння заняткаў, канікулярны тэрмін і г.д. Таксама ён ажыццяўляў падбор кандыдата на пасаду рэктара калегіума і потым прадстаўляў яе на канчатковае зацвярджэнне генерала. Галавой калегіума з'яўляўся рэктар: ён кантраляваў дзейнасць установы і даваў штогадовую пісьмовую справаздачу аб ёй правінцыялу.

Непасрэднае штодзённае кіраванне калегіумам належала прэфекту. Гэтая пасада магла дастацца толькі членам ордэна, якія атрымалі выдатную адукацыю, мелі вялікі вопыт і заслугі на педагагічнай ніве. Прэфекты абавязаны былі штомесяц наведваць адзін з заняткаў кожнага з настаўнікаў, час ад часу правяраць пісьмовыя работы вучняў. Яны адказвалі за дыспуты, што ладзіліся ў школе, арганізоўвалі і праводзілі вусныя і пісьмовыя экзамены, прымалі вучняў-навічкоў, давалі дазвол на перавод у старэйшыя класы і г.д.

Выкладанне ажыццяўлялася настаўнікамі. Іх падрыхтоўка і адбор станавіліся прадметам асаблівага клопату «Таварыства Ісуса». Першапачаткова маладому чалавеку, які збіраўся звязаць свой лёс з педагагічнай дзейнасцю, трэба было прайсці двухгадовае навучанне ў навіцыяце. Па яго заканчэнні прыносіліся тры звычайныя манаскія абяцанні – жабрацтва, цноты і паслуху. Гэткім чынам яны пераходзілі ў разрад схаластыкаў (схаластаў). На працягу наступных двух гадоў яны былі павінны праходзіць паглыбленае вывучэнне класічных моў, а таксама сучаснай еўрапейскай мовы, якая была ва ўжытку той краіны, куды кіраўніцтва збіралася накіраваць маладога педагога. Паспяховае авалоданне мовамі дазваляла перайсці да вывучэння філасофіі, фізікі і матэматыкі. Калі ў адным з гэтых прадметаў, а таксама ў філалогіі схаластык выяўляў асаблівыя здольнасці, для паглыблення набытых ведаў ён мог дадаткова займацца гэтым прадметам на працягу года. Пасля паспяховай здачы экзаменаў яго дапускалі да выкладання ў ніжэйшых класах, дзе неабходна было адпрацаваць пад пільным кантролем з боку рэктара тры гады. Тым схаластыкам, якія добра зарэкамендавалі сябе ў практычнай дзейнасці, давалася магчымасць на працягу чатырох гадоў вывучаць тэалогію, права, царкоўную гісторыю, паглыбляць веды сучасных і класічных моў. Толькі тыя схаластыкі, якія вытрымлівалі ўсе іспыты на «выдатна», дапускаліся да выкладання самых складаных і адказных дысцыплін – філасофіі і тэалогіі – у вышэйшых установах Ордэна. Толькі яны дапускаліся да чацвёртага манаскага абяцання – бясспрэчнага падпарадкавання рымскаму папу. Гэткім чынам працэс падрыхтоўкі выкладчыка-езуіта звычайна займаў 15 гадоў!

Полацкі езуіцкі калегіум уяўляў сабой пяцікласную гімназію, тэрмін навучання ў якой звычайна быў разлічаны на 6 – 7 гадоў. Першы клас насіў назву «ніжэйшай (першай) граматыкі» ці інакш «інфімы» (infima classis grammaticae, infima). Калі яго праграма расцягвалася на два гады, першы год навучання насіў назву infima minor (parva), а другі – infima major. У другім класе, «сярэдняй (другой) граматыкі» ці проста «граматыкі» (media classis grammaticae, grammaticae), завяршалася вывучэнне граматыкі лацінскай мовы і пачыналі засваенне грэчаскай мовы. Заняткі ў трэцім класе, «вышэйшай (трэцяй) граматыкі» ці «сінтаксісу» (suprema classis grammaticae), былі скіраваны на ўдасканаленне лаціны і авалоданне грэчаскай мовай. Пасля заканчэння граматычнай школы вучань пераходзіў у клас humanitas ці, як часцей яго называлі, «паэзіі» (poesis). Грунтоўная прапрацоўка найлепшых антычных узораў – твораў Цыцэрона, Вергілія, Гарацыя, Цэзара, Сенэкі, Платона, Плутарха, Гесіода – дазваляла замацаваць набытыя веды ў класічных мовах і закласці трывалую базу для будучых заняткаў красамоўствам. Заключным этапам навучання станавілася наведванне класа «рыторыкі» (rethorica), разлічанага на два гады. Вучні спасцігалі тэорыю аратарскага мастацтва і выпрацоўвалі ўласны стыль маўлення. Апошняму садзейнічала выкананне вялікай колькасці практыкаванняў і ўдзел у аратарскіх выпрабаваннях. Не выключана, што як і ў іншых вялікіх калегіумах, у полацкім з часам з'явіўся клас proforma, які забяспечваў элементарны базавы ўзровень ведаў – авалоданне чытаннем і пісьмом, гэта значыць з'яўляўся па сутнасці падрыхтоўчым класам. Але часцей за ўсё навучэнцы на момант паступлення ўжо атрымлівалі пачатковую адукацыю ў школцы альбо ад нанятага бацькамі хатняга настаўніка.

У першы навучальны год у калегіуме займаліся толькі 5 хлопчыкаў. Як можна меркаваць, нягледзячы на зусім сціплую вучнёўскую аўдыторыю, новая адукацыйная ініцыятыва знайшла сярод мясцовай знаці сваіх удзячных прыхільнікаў. Сярод першых навучэнцаў былі блізкія сваякі гарачых апанентаў «Таварыства Ісуса» – сын згаданага полацкага ваяводы і пляменнік праваслаўнага епіскапа Феафана (Рыпінскага). Астатнія хутчэй за ўсё паходзілі з мясцовай, зусім нешматлікай тады, каталіцкай шляхты.

Каралеўскім фундушам* у 1582 г. полацкім езуітам былі перададзены ўсе праваслаўныя цэрквы і манастыры горада за выключэннем Сафійскага сабора, млын пад Верхнім замкам і перавоз праз Дзвіну. Крыху пазней «Таварыства Ісуса» праз абмен з горадам атрымала яшчэ і востраў на рацэ, і слабаду Экімань.

Па першапачатковай задуме ўсе езуіцкія пабудовы планавалі паставіць на дзвінскім востраве на месцы манастыра Іаана Прадцечы. Але з меркаванняў бяспекі (буйныя мураваныя пабудовы на востраве маглі быць выкарыстаныя ворагам пад час аблогі гораду) Сенат Рэчы Паспалітай дазволіў тут размясціць толькі калегіум. Пазней, пра гэта сведчыць і адпаведная каралеўская грамата, будынкі кляштара, касцёла і калегіума сталі ўзводзіць на высокім правым беразе Дзвіны, недалёка ад Сафійскага сабора, паміж Верхнім замкам і рынкавай плошчай. Езуіцкі касцёл, які ўвайшоў у комплекс забудовы калегіума, быў асвечаны ў гонар Звеставання Дзевы Марыі і нябеснага апекуна караля – Святога Стафана.

У наступныя гады колькасць навучэнцаў полацкіх езуітаў узрастала. У 1591/92 навучальным годзе (на жаль, пра папярэднія гады дадзеныя адсутнічаюць) заняткі адбываліся ў трох класах граматыкі, з 1595/96 н.г. у калегіуме сталі вывучаць паэзію. На першых парах сваёй дзейнасці ў Полацку езуіты сутыкаліся з пэўнымі кадравымі праблемамі. Вядома, напрыклад, што ў 1591/1592 н.г. з трох выкладчыкаў ніводны не меў ступені прафесара. Упершыню пра гэтую пасаду ўзгадваюць толькі дакументы 1593/1594 н.г. У 1605/1606 н.г. ужо ўсе тры выкладчыкі з'яўляліся прафесарамі. У 1649/1650 н.г. прафесараў стала ўжо чацвёра, што праўда складала толькі палову ад усяго педагагічнага складу калегіума.

Кадравая нестабільнасць была даволі звыклай справай у падначаленых езуітам установах. Па-першае, «Таварыства Ісуса» актыўна практыкавала ратацыю педагогаў – больш за тры гады запар у адным месцы выкладчыкі не працавалі. Па-другое, вельмі часта свае карэктывы ўносілі палітычныя і ваенныя абставіны часу. Тыя ж праблемы былі ўласцівыя і другому найстарэйшаму калегіуму на сучаснай

*Фундуш—акт аб ахвяраванні грашовых сродкаў, рухомай або нерухомай маёмасці.

тэрыторыі Беларусі – Нясвіжскаму (1586), хаця колькасць і доля прафесараў у ім доўгі час была прыкметна большай (у 1615/1616 – сямёра з сямі, а ў 1616/1617 – пяцёра з пяці, а ў 1648/1649 – васьмёра з васьмі выкладчыкаў).

У працэсе адукацыі і выхавання навучэнцаў у духу адданасці каталіцкаму касцёлу і распаўсюджвання яго ўплыву на тэрыторыі Вялікага княства Літоўскага езуіты імкнуліся да шырокага выкарыстання музыкі. Менавіта на гэтым перакананні была заснавана дзейнасць бурсаў (капэлаў). У перыяд з 1586 па 1597 гг., калі ў Полацку ў распараджэнні «Таварыства Ісуса» з'явіліся новыя драўляныя будынкі, была створана Полацкая езуіцкая бурса – музычная школа для здольных да музыкі дзяцей беднай шляхты. Вучні пражывалі ў езуітаў на поўным пансіёне і задарма вывучалі навукі і музыку. Навучэнцы бурсаў удзельнічалі ў богаслужэнні, а таксама працавалі на ўсіх царкоўных і грамадзянскіх мерапрыемствах горада.

Прывабнасці езуіцкай адукацыі заўжды спрыяла адсутнасць у ёй саслоўных і канфесійных абмежаванняў, яе бясплатнасць. Пашырэнню вучнёўскай аўдыторыі езуітаў у Полацку першапачаткова магла садзейнічаць вельмі прагматычная моўная палітыка «Таварыства Ісуса». Пры адкрыцці езуіцкіх навучальных устаноў на тэрыторыі Вялікага княства Літоўскага кіраўніцтва Ордэна пайшло на ўключэнне ў праграму беларускай мовы асобнай дысцыплінай. Першыя звесткі пра яе выкладанне ў Полацку адносяцца да 1584 г., літаральна праз некалькі гадоў пасля ўвядзення сталічнымі езуітамі. Калі меркаваць па віленскіх дадзеных (дакладная інфармацыя па Полацку адсутнічае), двойчы на дзень вучні чыталі і пісалі абраныя настаўнікам урыўкі з «Евангелля» або «Катэхізіса», перакладалі і завучвалі іх напамяць. Безумоўна, беларуская мова адыгрывала ў працэсе ордэнскай адукацыі другарадную ролю. Як прызнавалі самі езуіты, родная мова вывучалася толькі, каб «дзеці прызвычайваліся да лацінскіх літар і абрадаў». Але ў новым школьным статуце Ratio studiorum (Ratio atque institutio studiorum Societatis Iesu – «Разуменне і арганізацыя навучання ў Таварыстве Ісуса»), зацверджаным у 1599 г., вывучэнне мясцовых моў у езуіцкіх установах ужо не прадугледжвалася і нават не дазвалялася іх ужыванне ў сценах alma mater. На практыцы на ўсёй тэрыторыі Рэчы Паспалітай і ў працэсе выкладання новага матэрыялу, і пад час наладжвання пазааўдыторных мерапрыемстваў шырока карысталіся польскай мовай.




*Тытульны ліст езуіцкага школьнага статута Ratio studiorum (Неапаль, 1598)*

Росту ўплыву езуітаў і папулярнасці іх калегіума не магло не паспрыяць адкрыццё ў 1585 г. вучнёўскага тэатра (праіснаваў да 1819 г.). У ім ставіліся пераважна драмы на рэлігійныя, міфалагічныя і гістарычныя сюжэты. Звычайна пастаноўкі ладзіліся на лаціне (радзей па-польску), але часам, як, напрыклад, у 1603 г., нават па-беларуску.

Росту навучальнай установы не здолелі сур'ёзна зашкодзіць нават неспрыяльныя абставіны пачатку XVII ст. Напрыклад, у 1601 г. ад голаду і эпідэміі загінула нямала палачан (называюць нават неверагодную лічбу 15 тысяч чалавек!). Але езуіты і гэтыя цяжкасці здолелі выкарыстаць на сваю карысць. У 1600 г. яны кармілі ў сваім кляштары некалькі соцень згаладалых жыхароў Полаччыны, якія шукалі ратунку ў горадзе. Несумненна, гэтая дабрачыннасць таксама не магла не саслужыць ім добрую службу ў справе папулярызацыі сваёй адукацыі сярод мясцовага насельніцтва. Ужо ў 1605 г. з увядзеннем у навучальны працэс курса рыторыкі ў калегіуме пачынае дзейнічаць сярэдняя школа.

Полацкі езуіцкі калегіум хутка ператвараецца ў адзін з цэнтраў падрыхтоўкі педагагічных кадраў Ордэна. Першапачаткова выкладчыкі, якія працавалі на тэрыторыі ВКЛ, належалі амаль выключна да гадаванцаў польскіх школ «Таварыства Ісуса» (Пултуска, Познані, Яраслава). З утварэннем у 1608 г. Літоўскай правінцыі, ядро якой склалі землі Вялікага княства Літоўскага, перад кіраўніцтвам новай самастойнай арганізацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі Ордэна паўстала задача падрыхтоўкі ўласных педагогаў. Сярод піянераў гэтай справы быў Полацкі езуіцкі калегіум. У 1609/1610 н.г. тут пачалі вучыць настаўнікаў рыторыкі. Можна нават казаць пра з'яўленне ў Полацку ўласнай педагагічнай школы.



*М. К. Сарбеўскі*

Спачатку падрыхтоўка настаўнікаў рыторыкі была даручана Андрэю Бруxману. На працягу двух наступных акадэмічных гадоў прадмет выкладаў Пётр Клінгер, а потым Мікалай Бенедыкт – адзін з самых выбітных педагогаў «Таварыства Ісуса» свайго часу. Іх справу працягнуў у 1618 – 1620 гг. малады езуіт, нядаўні выпускнік Віленскай акадэміі Мацей Казімір Сарбеўскі (1595 – 1640). Пасля працягу адукацыі ў Германіі і Італіі і атрымання ў 1625 г. з рук папы Урбана VIII лаўровага вянку і залатога медаля (падобны гонар у свой час здабылі славутыя італьянскія паэты Дантэ Аліг'еры і Франчэска Петрарка) за апублікаваны ў Кёльне лацінскамоўны зборнік вершаў Lyricorum libri tres («Тры кнігі вершаў») у 1626 г. М.К. Сарбеўскі зноў быў прызначаны настаўнікам рыторыкі Полацкага калегіума.

Праца ў Полацку, несумненна, адыграла важную ролю ў станаўленні яго творчай асобы. Менавіта ў час свайго першага прыезду ў Полацк гэты ў недалёкім будучым выдатны дзеяч культуры Рэчы Паспалітай і ўсёй Еўропы, бліскучы навалацінскі паэт, філосаф, тэолаг, тэарэтык літаратуры і красамоўства пачаў працу над сваімі фундаментальнымі даследаваннямі па тэорыі паэзіі і красамоўству. Якраз у Полацку былі ўпершыню прачытаны яго фундаментальныя курсы па тэорыі паэзіі, красамоўству і антычных старажытнасцях («Пра дасканалую паэзію, або Вяргілій і Гамер», «Лекцыі па паэтыцы», «Багі язычнікаў, або Тэалогія, філасофія прыроды і этыка, палітыка, эканоміка, астраномія і іншыя мастацтвы і навукі»). Не дзіва, што ўжо ў 1627 г. М.К. Сарбеўскі быў накіраваны выкладаць у галоўную навучальную ўстанову ВКЛ – Віленскі універсітэт.



*Тытульны ліст Lyricorum libri tres М. К. Сарбеўскага (Антверпен, 1632)*

У 1632 г. Віленскі універсітэт прысудзіў яму ступень доктара філасофіі, а ў 1636 г. – доктара тэалогіі. Аднак асаблівую славу М.К. Сарбеўскі заслужыў на паэтычнай ніве. Празваны «Гарацыям Сарматыі» і «хрысціянскім Гарацыям», паэт публікаваў свае творы не толькі ў Вільні, але таксама ў Лейдэне, Рыме, Мілане, Дыжоне, Парыжы, Вроцлаве, Венецыі, Кембрыджы, Лондане і г.д. Яго кнігі станавіліся сапраўднай падзеяй у культурным жыцці Еўропы – нездарма ў антверпенскім выданні «Трох кніг вершаў» (1632) на тытульным лісце была змешчана гравюра, выкананая па малюнку вялікага фламандскага мастака Пітэра Паўэла Рубенса.

Падрыхтоўка настаўнікаў рыторыкі ў Полацку ажыццяўлялася да 1631/1632 н.г., калі разам з выкладчыкам Сігізмундам Лаўксманам (1596 – 1670) група будучых педагогаў пераязджае ў Нясвіж.

Выхаванец полацкіх езуітаў (у 1618 – 1619 гг. ён вывучаў рыторыку ў М.К. Сарбеўскага), С. Лаўксман становіцца аўтарам першых айчынных падручнікаў па грэчаскай мове, музыцы, рыторыцы. Яго праца «Практычнае красамоўства, або Правілы рытарычнага мастацтва...» двойчы выдавалася ў Рэчы Паспалітай і яшчэ 11 разоў за яе межамі (Мюнхен, Прага, Вена, Кёльн і інш.). Гэты падручнік не страчваў папулярнасці ажно да самага канца XVIII ст.

Нягледзячы на агульную гуманітарна-рэлігійную арыентацыю навучальнай праграмы ордэнскіх установ, пастулова адваёўвалі сабе месца ў ёй і прыродазнаўчыя дысцыпліны. Па настойлівых патрабаваннях бацькоў у некаторых школах Польскай правінцыі з канца XVI ст. сталі выкладаць арыфметыку і з пачатку XVII ст. мясцовыя езуіты неаднаразова звярталіся ў Рым з просьбай афіцыйна зацвердзіць гэтую практыку. У 1614 г. іх намаганні нарэшце ўвянчаліся поспехам. Падобным чынам у навучальны працэс была ўключана і фізіка. Вялікага княства Літоўскага новыя павевы дасягнулі з некаторым спазненнем. У 1649/1650 навучальным годзе матэматыка і фізіка з'явіліся і ў Полацкім езуіцкім калегіуме (на тэрыторыі сучаснай Беларусі выкладанне фізікі пачалося езуітамі ў Аршанскім калегіуме з 1646/1647 н.г., а матэматыкі – у Пінскім з 1647/1648 н.г.).

## *Полацкі езуіцкі калегіум у 1648 – 1772 гг.*

З сярэдзіны XVII ст. унутры- і знешнапалітычныя ўмовы развіцця Рэчы Паспалітай і, у прыватнасці, Вялікага княства Літоўскага рэзка пагоршыліся. Крывавыя ўзброеныя канфлікты – Казацка-сялянская вайна 1648 – 1651 гг. і вайна Рэчы Паспалітай з Расійскай дзяржавай 1654 – 1667 гг. – прынеслі беларуска-літоўскім землям незлічоныя чалавечыя і матэрыяльныя страты. Асабліва пацярпелі Полацк і Полацкі павет, якія страцілі адпаведна 93,2 і 74,8 % дымоў*. Зразумела, што на ўсім працягу вайны 1654 – 1667 гг. Полацкі калегіум не працаваў, яго будынкі былі спаленыя альбо разбураныя, а маёмасць езуітаў была амаль цалкам разрабаваная.

Але адразу пасля заканчэння вайны Полацкі езуіцкі калегіум аднавіў сваю працу. У 1667/1668 н.г. заняткі праходзілі ў класах інфімы і граматыкі, з 1672/1673 н.г. вялося выкладанне паэзіі і рыторыкі. З 1675/1676 н.г. пачаліся заняткі ў класе вышэйшай школы (вялося навучанне логіцы), а ў наступным акадэмічным годзе ўжо выкладаліся матэматыка з фізікай. У 1690/1691 н.г. у Полацкім езуіцкім калегіуме нават з'яўляецца асобная штатная адзінка прафесара матэматыкі – амаль унікальная з'ява для ордэнскіх установ гэтага тыпу ў Літоўскай правінцыі. З гэтага ж часу стабілізуецца выкладчыцкі склад калегіума. Больш таго, усе вакансіі займаюцца выкладчыкамі з прафесарскай ступенню (да канца XVII ст. – 7 альбо 8 прафесараў).

З сярэдзіны XVII ст. яшчэ адной значнай праблемай, уласцівай не толькі Полацкаму калегіуму, а ўсёй сістэме езуіцкай адукацыі ў Літоўскай правінцыі, стала зніжэнне патрабаванняў да выканання прадпісанняў Ratio studiorum. Асаблівую трывогу выклікала выкладанне грэчаскай мовы і літаратуры. Хаця на паперы гэтыя дысцыпліны разам з лацінай па-ранейшаму складалі аснову гуманітарнай падрыхтоўкі ў езуіцкіх школах, рэальна слабая запатрабаванасць у шляхецкім асяроддзі мовы Гамера і Арыстоцеля няўхільна вяла да яе дэградацыі ў беларуска-літоўскіх установах Ордэна. Грэчаская літаратура, напрыклад, захоўвала нейкую актуальнасць толькі ў кантэксце вывучэння антычнай міфалогіі.

У 1655 г. генерал «Таварыства Ісуса» Павел Аліва загадваў: «Трэба тэрмінова прадпісаць навучанне грэчаскай мове ў школах. Неабходна пакараць тых, хто не пільнаваўся правілаў, якія прадпісваюць яго вывучэнне, альбо публічна гаварылі, што гэтая дысцыпліна з'яўляецца непатрэбнай». Пачатак вайны надоўга прыпыніў рэалізацыю гэтай карыснай ініцыятывы. Грэчаская мова ненадоўга вярнулася ў Полацкі езуіцкі калегіум у 1676/1677 н.г., калі тут працаваў выдатны знаўца

*Дым—гаспадарчы комплекс, які належаў сям'і; адна з галоўных адзінак падаткаабкладання.

мовы прафесар Максім Вайцеховіч, але потым зноў знікла да 1683/1684 н.г. І ў наступныя гады выкладанне грэчаскай мовы неаднаразова перапынялася. Галоўнай прычынай цяжкасцяў быў відавочны недахоп педагагічных кадраў гэтага профілю ў Літоўскай правінцыі. Занядбанне грэчаскай мовы на працягу дзесяцігоддзяў пазбавілі «Таварыства Ісуса» адразу некалькіх пакаленняў выкладчыкаў. Звычайна выкладалі грэчаскую мову ў Полацку (і іншых літоўска-беларускіх установах) прафесары-сумяшчальнікі: грэчаскай мовы і матэматыкі ці грэчаскай мовы і логікі. Прычым мова, несумненна, не была іх профільнай дысцыплінай.

З 40-х гг. XVIII ст. пачынаецца вельмі бурны этап у педагагічнай дзейнасці «Таварыства Ісуса» на землях ВКЛ. Менавіта з гэтага часу сюды актыўна пранікаюць ідэі Еўрапейскага Асветніцтва. Перамены закранулі практычна ўсе галіны грамадскага і культурнага жыцця. Адной з найбольш характэрных прыкмет часу становіцца імкненне найбольш перадавой часткі інтэлектуальнай эліты Рэчы Паспалітай вывесці айчынную адукацыю на сучасны еўрапейскі ўзровень.

Цэнтральную ролю ў гэтым працэсе адыграў выдатны педагог і палітычны дзеяч, член ордэна піяраў* Станіслаў Канарскі (1700 – 1773). У 1740 г. ён адчыніў у Варшаве новы тып школы – піярскі Collegium Nobilium, створаны па лепшых заходнееўрапейскіх узорах таго часу. У адрозненне ад прадугледжанай езуіцкай Ratio studiorum праграмы, элітарная ўстанова рабіла акцэнт на выкладанне найбольш актуальных і для дзяржавы, і для яе сацыяльных вярхоў дысцыплін. Пры агульным скарачэнні часу выкладання лацінскай мовы вялікая ўвага стала надавацца вельмі запатрабаваным на той час замежным мовам – нямецкай і французскай. Цэнтральнае месца набываюць біблейская і польская гісторыі, асновы айчыннага грамадзянскага і міжнароднага права, палітыка і г.д. У духу патрабаванняў часу былі пашыраны курсы матэматыкі і прыродазнаўчых навук. Выкладанне павінна было весціся па новых падручніках, распрацаваных самімі піярамі. Шмат рабілася таксама для выхавання ў навучэнцаў пачуцця грамадзянскасці. Акрамя таго, катэгарычна забараняліся фізічныя пакаранні. Гэткім чынам гадаванцам піяраў давалі якраз такую адукацыю і выхаванне, якія ў найбольшай ступені павінны былі паспрыяць ў недалёкім будучым хуткаму росту іх палітычнай і дыпламатычнай кар'еры. У 50 – 60-я гг. XVIII ст. рэформы С. Канарскага закранулі і навучальныя ўстановы піярскага ордэна на тэрыторыі ВКЛ.

Рост папулярнасці піярскай адукацыйнай сеткі, а таксама яе пашырэнне (у 1751 г. быў адчынены піярскі калегіум у Віцебску) не на жарт устрывожылі кіраўніцтва «Таварыства Ісуса», якое няўмольна страчвала манаполію на ніве адукацыі і выхавання. Але езуіты, апрача жорсткай канфрантацыі з манахамі-піярамі (удалося зачыніць іх калегіумы ў Вільні, Геранёнах і Воранаве), таксама імкнуліся пераняць пазітыўны вопыт сваіх канкурэнтаў.

Згодна з рэкамендацыямі самога С. Канарскага дзеля падрыхтоўкі высокакваліфікаваных педагагічных кадраў езуіты сталі практыкаваць для сваіх выхаванцаў замежныя стажыроўкі. Пачынаецца абнаўленне навучальнай базы. Напрыклад, у 1749 г. калектывам аўтараў езуітаў быў створаны новы падручнік па лацінскай мове. Выдавалі слоўнікі і дапаможнікі, у якіх лацінскія тэксты суправаджаліся польскімі і нават французскімі перакладамі. Гэтыя кніжныя навінкі хутка з'явіліся і ў Полацкім езуіцкім калегіуме.

Кіраўніцтва літоўскай правінцыяй пільна сачыла за выкананнем навучальнага плана, прадпісанага Ratio studiorum. У Полацку гэта добра бачна па чарговай спробе адраджэння ў сярэдзіне 60-х гг. XVIII ст. нармальнага выкладання грэчаскай мовы. Пад кіраўніцтвам прафесараў Ф. Ксянжкевіча і В. Крыньскага ў гэты час тут нават сталі весці падрыхтоўку настаўнікаў рыторыкі і грэчаскай мовы.

Яшчэ адным важным напрамкам мадэрнізацыі езуіцкай сістэмы адукацыі становіцца ўвядзенне ў адукацыйны працэс сучасных замежных моў. Першым гэтую справу распачаў Віленскі універсітэт (1730 г.), за ім пайшлі іншыя езуіцкія ўстановы – у Навагрудку, Пінску, Слоніме, Гродне, Нясвіжы, Оршы і нават у Жодзішках. Па не зусім зразумелых прычынах у Полацкім калегіуме, адной з буйнейшых і багацейшых езуіцкіх навучальных устаноў дзяржавы, выкладанне замежных моў пачалося са значным спазненнем – толькі з 1756/1757 н.г., калі на па-

*Піяры (лац. «набожныя»)—каталіцкі манаскі ордэн (з 1597 г.), галоўнай мэтай якога было выхаванне і адукацыя юнацтва. У Рэчы Паспалітай з 1642 г.

саду прафесара матэматыкі і французскай мовы заступіў Ян Гробель. Аднак гэтае новаўвядзенне прыжылося ў Полацку не надоўга.

З сярэдзіны XVIII ст. у Полацкім езуіцкім калегіуме як асобную дысцыпліну сталі таксама выкладаць гісторыю. Пэўныя звесткі па антычнай гісторыі давалі вучням многія тэксты на класічных мовах, асабліва лацінскамоўныя – Гая Юлія Цэзара, Ціта Лівія, Салюстыя. Але разгляд гістарычных падзей быў цалкам падпарадкаваны задачам філалагічных штудыяў. Паглыбленне грамадскага інтарэсу да мінулага настойліва намагала ўключэння гісторыі ў навучальную праграму. У 1750/1751 н.г. у Полацку з'явілася пасада прафесара рыторыкі і гісторыі, прычым апошнюю сталі вывучаць у якасці самастойнай дысцыпліны (пачатак яе выкладання адбываецца практычна адначасова ва ўсіх езуіцкіх установах ВКЛ).

Як і ў абсалютнай большасці іншых езуіцкіх навучальных устаноў Літоўскай правінцыі, геаграфія ў Полацку выкладалася толькі як частка гісторыі. Пры гэтым можна адзначыць цікавы факт: менавіта ў Полацку пачаў сваю бліскучую кар'еру ў «Таварыстве Ісуса» адзін з самых вядомых спецыялістаў у галіне геаграфіі Рэчы Паспалітай, гісторык Францішак Папроцкі (1723 – 1805). Ён падрыхтаваў і выдаў шэраг класічных гістарычна-геаграфічных і геаграфічных падручнікаў свайго часу, напрыклад, «Польскія хатнія звесткі Вялікага княства Літоўскага» (1752 г.). Навучэнцы езуіцкіх школ знаёміліся на яго старонках з базавымі звесткамі па палітычнай і фізічнай геаграфіі Бацькаўшчыны, па палітычнай сістэме дзяржавы. У іншым падручніку «Еўропа – найлепшая частка свету» (упершыню выйшла ў свет у 1754 г.) Ф. Папроцкі даваў аналіз геаграфічнага становішча, прыродных умоў, сацыяльна-эканамічнага і палітычнага ладу, складу насельніцтва, духоўнай культуры еўрапейскіх народаў.

Полацкі езуіцкі калегіум стаў другой пасля Віленскага універсітэта адукацыйнай установай ВКЛ, дзе «Таварыства Ісуса» спрабавала распачаць падрыхтоўку спецыялістаў у галіне архітэктуры. Цэнтральнай постаццю ў рэалізацыі гэтай задумы было наканавана стаць ураджэнцу Полаччыны Габрыэлю Лянкевічу (1722 – 1798). Пасля вывучэння архітэктуры ў сценах Віленскага універсітэта (1752 – 1754) ён працягваў самаўдасканаленне. Але кіраўніцтва, заўважыўшы апантанасць Г. Лянкевіча, вырашыла направіць яго ў Рымскі езуіцкі калегіум (сённяшні Грыгарыянскі універсітэт). Пасля прыезду ў ВКЛ ён вярнуўся да выкладчыцкай дзейнасці і з 1768/1769 н.г. пачаў чытаць курс архітэктуры ў Полацку. Да 1773 г. Г. Лянкевіч таксама выконваў абавязкі кіраўніка будаўнічых работ комплекса езуіцкага калегіума. Дакладна вядома, напрыклад, што ўзвядзеннем купала аднаўленага мураванага касцёла Св. Стафана – адной з найбольш адказных будаўнічых аперацый – кіраваў менавіта ён.


*М. Пачобут-Адляніцкі*

У 1740 – 1772 гг. Полацкі езуіцкі калегіум бачыў нямала выдатных дзеячаў навукі і культуры эпохі Асветніцтва. Але адной з найбольш выбітных асобаў трэба прызнаць Марціна Пачобута-Адляніцкага (1728 – 1810). Пасля вучобы ў езуіцкіх установах Гродна, Вільні і Слуцку ў 1749 г. ён быў накіраваны ў Полацк як настаўнік класа інфімы. Паралельна з педагагічнай дзейнасцю таленавіты езуіт вывучаў тут тэалогію і філасофію (1749 – 1752). Пасля працягу навучання ў Віленскім універсітэце, а таксама стажыровак у Празе, Марсэлі, Авіньёне, Неапалі М. Пачобут-Адляніцкі становіцца прызнаным карыфеем айчыннай астраноміі, і ў 1767 г. апошні ўладар Рэчы Паспалітай Станіслаў Аўгуст Панятоўскі прысвойвае яму званне каралеўскага астранома, а заснаваная ім Віленская астранамічная абсерваторыя атрымлівае статус каралеўскай. Заваяваўшы не толькі прызнанне Бацькаўшчыны, але і еўрапейскай навуковай супольнасці (быў

абраны членам Лонданскага Каралеўскага (навуковага) таварыства і членам-карэспандэнтам Парыжскай акадэміі навук) Марцін Пачобут-Адляніцкі ўзначаліў рэарганізацыю Віленскага універсітэта ў цалкам свецкую навучальную ўстанову – Галоўную школу Вялікага княства Літоўскага – і на ўсім працягу яе існавання з'яўляўся рэктарам (1780 – 1803).

Узрастаючая канкурэнцыя вымусіла езуітаў актыўна ўзяцца за ўмацаванне матэрыяльнай базы. Будаўніцтва мураванага езуіцкага касцёлу было распачата яшчэ напрыканцы XVII ст. Да 1738 г. ён быў практычна гатовы, і ў 1745 г. адбыўся абрад яго кансекрацыі, але праца над аздабленнем інтэр'ера сабора Св. Стафана працягвалася ажно да 1766 г.

Ёсць дадзеныя пра тое, што касцёл мог быць узведзены па праекце італьянскага дойліда. Незалежна ад іх гістарычнай дакладнасці, удзел у яго будаўніцтве цэлай плеяды вядомых архітэктараў-езуітаў, якія адначасова выкладалі ў калегіуме (У. Дзягілевіч (1695 – 1698), Р. Энгел (1698 – 1699), К. Мацялкоўскі (1705 – 1710 і 1733 – 1735) і інш.), дазваляе думаць пра немалы ўплыў мясцовых спецыялістаў на канчатковае архітэктурнае вырашэнне помніка. Сапраўдным упрыгожаннем сабора стаў арган, зроблены італьянскім майстрам Дамінікам Адамам Касперыні (на жаль, пры перабудове 1838 г. каталіцкага касцёла на праваслаўны Мікалаеўскі сабор інструмент быў дэманціраваны і вывезены ў віленскі касцёл Святога Яна (універсітэцкі)).

Крыху пазней, у 1750 г. (у гістарычнай літаратуры таксама называюць 1747 – 1749 гг.) на месцы знішчанага ў чарговы раз пажарам драўлянага калегіума езуіты пачалі ўзвядзенне грандыёзнага мураванага комплексу, які разам з саборам Св. Стафана ствараў адзіны архітэктурны ансамбль плошчай звыш 7 тыс. м².

Першапачаткова будавалі трохпавярховы Е-падобны корпус. Яго галоўны фасад з парадным уваходам быў звернуты на поўдзень, у бок Дзвіны. На тэрасе перад галоўным фасадам быў разбіты рэгулярны сад. Па восі параднага вестыбюля, у сярэднім (меншым) выступе калегіума на першым паверсе размяшчалася сталовая (трапезная), а на другім – галоўнае памяшканне езуіцкай бібліятэкі. Вышыня гэтай двухпавярховай часткі корпуса была роўнай астатнім трохпавярховым. У бакавых (ад параднага ўваходу) крылах калегіума на трох паверхах знаходзіліся 105 манаскіх келляў. Калідор правага крыла корпуса далучаўся да алтарнай часткі касцёла. Перакрыцці ўсіх паверхаў былі скляпеністыя. Каміны і печы амаль не ўжываліся, а іх функцыю выконвалі пракладзеныя пад цаглянымі і кафлянымі падлогамі ацяпляльныя каналы.

Размяшчэнне масіўнага будынка над высокім надпойменным плато запатрабавала ўмацавання берага мураванай падпорнай сцяной. Для засцеражэння ад высокіх грунтовых вод пад галоўным будынкам былі закладзены падземныя мураваныя вадасцёкі, якія забяспечвалі дрэнаж глебы; у сцены ўбудоўваліся вентыляцыйныя хады, сутарэнні абсталёўваліся вадаспускамі.

## *Полацкі езуіцкі калегіум у 1773 – 1811 гг.*

У той час як у Рэчы Паспалітай езуіты ў цэлым паспяхова спраўляліся з выклікамі часу – заўжды знаходзілі паразуменне з уладамі і вытрымлівалі канкурэнцыю на ніве адукацыі – у Заходняй Еўропе іх пазіцыі з канца 50-х гг. XVIII ст. моцна пахіснуліся. Рост уплыву асветніцкай ідэалогіі і неабходнасць мадэрнізацыі дзяржавы і грамадства рабілі «Таварыства Ісуса» не проста састарэлай і таму непатрэбнай, а непрыхавана варожай абнаўленню інстытуцыяй. Паўсюдна ў Еўропе зайздрасць выклікалі і казачныя багацці Ордэна. Нават папы рымскія не здолелі больш мірыцца са свавольствам і празмерным уплывам свайго дзецішча. У 1759 г. езуіты былі выдвараны з Партугаліі, у 1764 г. іх дзейнасць была цалкам забаронена ў Францыі, а ў 1767 г. – у Іспаніі.

Пасля выгнання з важнейшых каталіцкіх дзяржаў скасаванне Ордэна было толькі справай часу. У 1773 г. з апублікаваннем брэве Dominus ac redemptor noster* Клімента XIV «Таварыства Ісуса» спыніла існаванне. Езуітам прадпісвалася перайсці ў іншыя ордэны альбо падпарадкавацца мясцовым каталіцкім уладам

*Брэве—папскае пасланне па другарадных пытаннях, якое ў адрозненне ад булы мае менш урачыстую форму і замацоўваецца не подпісам першасвятара, а яго пячаткай; дакумент названы па першых словах (у перакладзе з лаціны—«Гасподзь і Збавіцель наш»).



*Папа рымскі Клімент XIV*

і па загаду біскупа накіравацца для выканання пастарскіх абавязкаў у любое вызначанае ім месца.

Лёс езуітаў Беларусі і Літвы, тым не менш, вызначылі зусім іншыя падзеі. 5 жніўня 1772 г. Аўстрыя, Прусія і Расія падпісалі ў Пецярбургу трохбаковае пагадненне аб першым падзеле Рэчы Паспалітай. Пад уладу расійскай імператрыцы Кацярыны II адыходзіла паўночна-ўсходняя Беларусь. У выніку пад юрысдыкцыю Расіі патрапілі тры езуіцкія калегіумы, у тым ліку Полацкі, і дзве рэзідэнцыі.

Першапачаткова Кацярына II з вялікай насцярожанасцю паставілася да сваіх новых падданых. Губернатарам новадалучаных правінцый загадвалася: «Иезуитским монастырям, школам и училищам сделайте особую перепись. Вы за сими наипаче смотреть имеете, яко за коварнейшими из всех прочих латинских орденов...». Аднак падкрэслена вернападданіцкая пазіцыя кіраўніцтва «Таварыства Ісуса», якое не абмінала магчымасці выказаць рэспект новым уладам, вырашыла справу на карысць езуітаў.

У кастрычніку 1772 г. у полацкім касцёле Св. Стафана прачыталі «Казанне на гадавіну шчаслівай каранацыі святлейшай Кацярыны II – манархіні ўсёй Расіі». У ім гучаў заклік да ўсіх членаў «Таварыства Ісуса» і палачан безумоўна падпарадкоўвацца расійскай адміністрацыі. Тым самым езуіты першымі з усіх каталіцкіх ордэнаў прызналі новую ўладу. У лістападзе 1772 г. па загаду рэктара Полацкага калегіума С. Чарневіча ўсе езуіты, што апынуліся ў Расійскай імперыі, сабраліся ў Полацку на ўрачыстасці з нагоды дня анёла імператрыцы. Кацярыне II была прынесена прысяга на вернасць.



*Кацярына II*

Большага ад адной з самых багатых і ўплывовых арганізацый на новадалучаных тэрыторыях расійскія ўлады чакаць і не маглі. Таму калі пабачыла свет папскае брэве, Кацярына II проста праігнаравала яго. У лістападзе 1773 г. дэлегацыя Ордэна (С. Чарневіч, Г. Лянкевіч, Ю. Катэнбрынг) наведала Санкт-Пецярбург. Праз некалькі месяцаў імператрыца вызваліла езуітаў ад усіх падаткаў, а вось папскае брэве было сурова забаронена не толькі агалошваць, але нават увозіць яго ў межы імперыі. «Таварыства Ісуса» заставалася ў Расіі!

Выкарыстоўваючы магутную матэрыяльную базу (праўда, рэктар С. Чарневіч жаліўся ў 1772 г., што лепшая палова зямель і маёмасці калегіума засталіся пасля падзелу ў Рэчы Паспалітай) і не зусім чаканую ласку імператрыцы, езуітам удаецца пашырыць сетку сваіх навучальных устаноў у Полацку.

У 1776 г. полацкія езуіты на чале з С. Чарневічам пачалі перамовы з расійскімі ўладамі адносна заснавання навіцыята. Зварот да ўрада ў чарговы раз падкрэсліваў паслухмянасць Ордэна і, магчыма, змяшчаў намёк на яго зацікаўленасць у атрыманні матэрыяльнай падтрымкі зверху. У 1777 г. просьба была задаволена. Прычым апякунства над установай бралі на сябе буйныя дзяржаўныя саноўнікі – граф З. Чарнышоў і князь Р. Пацёмкін. Урачыстае адкрыццё навіцыята адбылося 2 лютага 1780 г. па заканчэнні будаўніцтва прызначаных для яго вучэбных памяшканняў. У траўні 1780 г. езуітаў у Полацку наведала сама Кацярына II. У ходзе прыёмаў і іншых урачыстасцяў імператрыца яшчэ раз прадэманстравала зацікаўленасць у супрацоўніцтве з Ордэнам.

Чарговыя праявы поўнага паразумення з уладамі паслужылі сігналам для пачатку масавага пераезду еўрапейскіх езуітаў у Полацк. Як пісалі С. Чарневічу з Рыма: «... тут шмат ёсць нашых маладых іспанцаў і старанных езуітаў, якія моляць адпусціць іх да Вас, у Беларусь». У Полацк з'язджаюцца былыя езуіты з Германіі, Швейцарыі, Іспаніі, Італіі, Польшчы і некаторых іншых краін. Выхаванец Полацкага калегіума і сучаснік падзей Станіслаў Шантыр узгадваў, што многім з іх, нават выключным спецыялістам у нейкай галіне, адмаўлялі ў прыёме, паколькі для жадаўшых прыехаць папросту не хапала месца.

Неўзабаве горад пераўтвараецца ў сапраўдную сусветную сталіцу забароненага таварыства. Наяўнасць у горадзе такога значнага інтэлектуальнага патэнцыялу не магла не адбіцца на якасці езуіцкай адукацыі.

У прыватнасці, былі замацаваныя многія навацыі папярэдніх дзесяцігоддзяў. У 1783 г. у калегіуме ўжо вывучалі французскую і нямецкую мовы. Было працягнута выкладанне архітэктуры. Полацк заставаўся адзіным месцам на Беларусі, дзе вялася падрыхтоўка будучых дойлідаў. З 1784 г. у спісе дысцыплін калегіума ўпершыню з'яўляецца руская мова, якая стала выкладацца ў класах інфімы і граматыкі.

Знаходзячыся ў імперыі на няпэўных правах і страціўшы свае некалі непахісныя пазіцыі ў сферы адукацыі, езуіты былі вымушаны чуйна рэагаваць на найноўшыя павевы ў навукова-педагагічнай справе і на манаршыя жаданні. Так, у сакавіку 1785 г. Кацярына II выклікала езуітаў ў сталіцу, каб тыя пазнаёміліся з новым метадам навучання. Яго запазычылі са Львову, што тады знаходзіўся ў складзе імперыі Габсбургаў (Аўстрыі), і прышчапілі сталічным школам. Езуіты павінны былі перанесці гэты ўзор на свае беларускія школы.

Для распрацоўкі рэформы езуіцкай адукацыі спатрэбіўся час (новая праграма была прынята толькі ў 1796 г.), але паступова змест навучання стаў узбагачацца. Езуіты ўзялі на ўзбраенне некаторыя дасягненні свецкай сістэмы адукацыі, абуджанай эпохай Асветніцтва. У прыватнасці, большую ўвагу яны сталі надаваць прадметам прыродазнаўчага цыклу і матэматыцы. Нездарма падчас наведвання Полацкага калегіума высокапастаўленымі дзяржаўнымі чыноўнікамі на чале з магілёўскім губернатарам П.Б. Пасэкам (1787) ім арганізавалі паказ цэлага шэрагу фізічных эксперыментаў, у тым ліку вопыты з электрычнасцю. Замацоўвалася ў навучальным працэсе нямецкая, руская і французская мовы, агульная гісторыя, гідраўліка, балістыка і некаторыя іншыя прадметы. У 1788 г. у прысутнасці полацкай грамадскасці адбылася праверка ведаў навучэнцаў па літаратуры і замежных мовах (бачна, што езуіты актыўна выкарыстоўвалі падобныя «справаздачы» як для дадатковай матывацыі вучняў, гэтак і для рэкламы сваіх педагагічных дасягненняў). Што да палітычных навук, якія ў гэты час атрымалі шырокую папулярнасць у перадавых навучальных установах, то ад іх езуіты разважліва вырашылі адмовіцца.

Поўныя звесткі пра колькасць навучэнцаў Полацкага езуіцкага калегіума ў 70 – 90-я гг. XVIII ст., на жаль, адсутнічаюць. Але наяўныя лічбы сведчаць, што ў пазначаны час яна ўпэўнена ўзрастала. Гэтак у 1784 г. тут вучылася болей за 160 чалавек, у 1796 г. толькі ў першых пяці класах (інфіма, граматыка, сінтаксіс, паэзія і рыторыка) – 194.

Добрай ілюстрацыяй папулярнасці езуіцкай адукацыі стаў лёс рускай школы ў Полацку. Па дадзеных на 1784 г. у заштатным Суражы ў падобнай школе вучылася 16 дзяцей гараджан, а тут, нягледзячы на статус горада (цэнтр намесніцтва!) – толькі 15. Відавочна, што слабая арганізацыя навучальнага працэсу, недахоп сродкаў і настаўнікаў рабілі гэтую адукацыйную альтэрнатыву малапрывабнай для мясцовага расійскага чыноўніцтва і афіцэрства. Не здолела істотна выправіць сітуацыю і адкрыццё ў 1789 г. Полацкага галоўнага вучылішча, 4-класнай навучальнай установы з рускай мовай выкладання (размяшчалася пры Багаяўленскім манастыры). Калі яшчэ ў 1795/1796 н.г. у галоўным вучылішчы атрымлівала адукацыю 235 чалавек, то ў 1797 г., калі з цэнтру намесніцтва Полацк быў пераўтвораны ў звычайны павятовы горад, яно сутыкнулася з пагрозай закрыцця. На наступны, 1798 г., тут заставалася толькі 69 чалавек. Колькасць




*План комплексу касцёла Св. Стафана і калегіума езуітаў (паводле абмераў 1828 г.)*

навучэнцаў працягвала змяншацца і далей.

Насуперак каласальным палітычным узрушэнням пачатку 70-х гг. XVIII ст. у Полацку працягвалася будаўніцтва мураванага езуіцкага комплексу. Да 1778 г. паралельна галоўнай восі езуіцкага касцёлу, на поўдзень ад яго, быў пабудаваны яшчэ адзін трохпавярховы, але без сутарэнняў, корпус («тэатральны»). На першым паверсе размясціліся друкарня з кніжнай крамай, на другім – вучылішча, а трэці быў вылучаны пад тэатр. Неўзабаве з паўночнага боку ад сабора Св. Стафана, перпендыкулярна яму і галоўнаму будынку калегіума, быў пабудаваны двухпавярховы канвікт (інтэрнат). Ён карыстаўся немалой папулярнасцю. У 1784 г. у ім знаходзілася 60 выхаванцаў (агульная колькасць юнакоў у трох астатніх канвіктах Беларусі – у Віцебску, Магілёве і Мсціслаўлі – была амаль удвая меншай).

Новы штуршок для развіцця комплексу езуіцкага калегіума даў прыезд у Полацк у лютым 1784 г. доктара медыцыны, выдатнага мастака і архітэктара Габрыэля Грубера (з 1785 г. ён выконвае абавязкі генерала «Таварыства Ісуса», а з 1802 г. становіцца афіцыйным галавой Ордэна). З яго ініцыятывы Галоўны і «тэатральны» карпусы былі злучаны новым будынкам, праект якога распрацаваў ён сам. Пасля заканчэння ў 1788 г. будаўніцтва тут размясціліся вучэбныя аўдыторыі і славуты музей езуітаў.

З уваходжаннем на імператарскі прастол Паўла I (1796 – 1801) урадавая палітыка адносна езуітаў не змянілася. Дзякуючы настойлівасці Паўла I папа рымскі Пій VII у 1801 г. выдае брэве, якім кіраўніцтва каталіцкай царквы прызнавала законнасць дзейнасці «Таварыства Ісуса» на тэрыторыі Расіі.



*Павел I*

Сацыяльна-эканамічнае і палітычнае становішча Расійскай імперыі напачатку XIX ст. ставіла ўрад перад неабходнасцю правядзення рэформаў. Ускладненне дзяржаўнага кіравання, рост гандлю і прамысловасці патрабавалі ад яго падбору адукаваных людзей. Паляпшэнне ўсёй сістэмы адукацыі становіцца аб'ектыўнай патрэбай – без гэтага немагчыма далейшае развіццё краіны.

У сувязі з гэтым новы расійскі імператар Аляксандр I (1801 – 1825) выдае ў 1803 г. загад аб пачатку школьнай рэформы. У краіне стваралiся навучальныя акругі. У адпаведнасці з загадам беларуска-літоўскія губерні – Віленская, Віцебская, Гродзенская, Магілёўская і Мінская – увайшлі ў склад Віленскай навучальнай акругі. Кіраванне ёй даручалася імператарскаму Віленскаму універсітэту (створаны ў 1803 г.), падпарад-


*Я. Снядэцкі*

каванаму ў сваю чаргу Міністэрству народнай асветы. Непасрэдны кантроль за навучальнай акругай ажыццяўляў папячыцель (куратар), які прызначаўся царом.

Рэформа 1804 г. мусіла закрануць дзейнасць усіх без выключэння навучальных устаноў. Калі ўсе свецкія школы ахвотна падпарадкоўваліся новаму кіруючаму органу, дык царкоўныя паставіліся да свайго свецкага патрона неадназначна. У той час, як большасць школ манаскіх ордэнаў з гатоўнасцю заявіла аб сваёй лаяльнасці Віленскаму універсітэту, «Таварыства Ісуса», якое працягвала змагацца за поўную перавагу ў асветніцкай справе, з трывогай сустрэла вестку аб перадачы татальнага кантролю за асветай Віленскаму універсітэту. Езуіцкі ордэн катэгарычна адмовіўся ад прапановы Віленскай навучальнай акругі падпарадкаваць усе духоўныя навучальныя ўстановы адзіным праграмам і правілам адукацыі, а таксама рэфармаваць іх згодна з яе статутам.

Вельмі энергічна за падпарадкаванне навучальных устаноў «Таварыства Ісуса» выступіў выдатны вучоны і педагог Ян Снядэцкі, які ў 1807 г. становіцца рэктарам Віленскага універсітэта. Напачатку 1808 г. ён накіроўвае генералу ордэна ліст, патрабуючы забеспячэння «аднастайнасці навук і спосабаў навучання, выкарыстання адных і тых жа падручнікаў», створаных прафесарамі універсітэту, а таксама поўнага падпарадкавання яго ўладзе.


*Т. Бжазоўскі*

Калі ў 1807 г. па даручэнні міністра народнай асветы граф Л. Платэр з рэвізіяй наведаў езуіцкія навучальныя ўстановы, у сваёй справаздачы ён адзначыў, што ў езуіцкіх вучылішчах «усё ідзе па-ранейшаму», што «аб правядзенні распараджэнняў універсітэта яны ўвогуле не думаюць». Езуіты выконвалі асобныя патрабаванні універсітэта і толькі тады, калі яны не надта супярэчылі Статуту «Таварыства езуітаў».

Усе спробы Вільні пераканаць генерала «Таварыства Ісуса» Т. Бжазоўскага ў неабходнасці падпарадкавання не прыносілі поспеху. Было відавочна, што за Ордэнам стаялі магутныя сталічныя заступнікі. Граф А.К. Разумоўскі, які ў 1810 г. замяніў ліберала П. Завадоўскага на пасадзе міністра народнай асветы, адкрыта прапанаваў Віленскаму універсітэту не ўмешвацца ў справы езуіцкіх вучылішчаў. Пазіцыя новага міністра натхніла ордэнскае кіраўніцтва – яно пераходзіць ад маўклівага ігнаравання да рашучых дзеянняў. Генерал езуітаў нават наважыўся звярнуцца да імператара з просьбай аб дазволе кіравацца ў выхаванні юнацтва ўласнымі правіламі.

Канфрантацыя з кіраўніцтвам Віленскай навучальнай акругі і Віленскім універсітэтам мала паўплывалі на дзейнасць Полацкага езуіцкага калегіума. Колькасць яго навучэнцаў па-ранейшаму заставалася нестабільнай, але ўпэўнена трымалася на высокім узроўні. Дадзеныя пачатку XIX ст., якія адрозніваюцца куды большай паўнатой, добра ілюструюць гэта. У калегіуме і парафіяльнай школе ў 1802 і 1803 гг. вучыліся па 372 хлопчыкі, у 1807 г. – 317, у 1808 г. – 318, у 1811 г. – 345 і г.д. Пашырэнне выкарыстання ў навучальным працэсе рускай мовы адбывалася павольна. У 1802 г. толькі прафесар Ю. Палоньскі чытаў свой курс архітэктуры па-руску.

## *Полацкая езуіцкая акадэмія (1812 – 1820 гг.)*

Паблажлівае стаўленне ўраду да езуітаў магло б падацца невытлумачальным, калі б пры двары не было палітычных сіл, якія з трывогай сачылі за развіццём падзеяў на Беларусі і Літве. Яны былі занепакоеныя фактычнай аўтаноміяй Віленскай акругі і, асабліва, непрыхавана вольналюбівымі і антырасійскімі настроямі, якія тая абуджала. Каталіцкія дзеячы з Пецярбургу марылі аб рэваншы ў змаганні з лібералізмам і асветніцтвам. Іх рупарам было шматлікае сталічнае езуіцтва і сардзінскі пасланнік граф Жазэ Мары дэ Местр, адзін з духоўных бацькоў ідэалогіі кансерватызму.

Акрамя таго, ва ўмовах рэзкага абвастрэння адносін паміж Расіяй і Францыяй і непазбежнай вайны паміж імі павышэнне статусу галоўнай езуіцкай навучальнай установы да універсітэцкага ўзроўню, аб чым даўно марыла «Таварыства Ісуса», служыла праявай жадання расійскага ўраду заключыць узаемавыгадны саюз з надзвычай аўтарытэтным сярод каталіцкага насельніцтва зямель Беларусі і Літвы манаскім ордэнам.

Восенню 1811 г. урад пачаў уважліва вывучаць пытанне аб пераўтварэнні Полацкага езуіцкага калегіума ў акадэмію. Падставай для падобнага разгляду паслужыла прадстаўленне генерала Ордэна міністру А.К. Разумоўскаму, дзе былі выкладзены галоўныя доказы ў падтрымку гэтай ідэі. 11 лістапада 1811 г. гэтыя меркаванні былі прызнаныя слушнымі Камітэтам Міністраў.



*Аляксандр І*

12 студзеня 1812 г. Аляксандр І выдаў указ Кіруючаму Сенату, у якім абвясціў аб адкрыцці Полацкай езуіцкай акадэміі: «Во уважение представленого Нам желания Белорусского дворянства и пользы для наук от соревнования между несколькими училищами равной степени, признали мы полезное возвести Полоцкую иезуитскую коллегию на степень Академии с присвоением ей преимуществ, дарованным университетам». У дакуменце пералічваліся асноўныя палажэнні, на базе якіх мелася дзейнічаць установа: на чале Акадэміі станавіўся генерал Ордэна; ёй павінны былі падпарадкоўвацца ўсе іншыя езуіцкія навучальныя ўстановы імперыі; дапускалася выкладанне толькі абгавораных урадам дысцыплін (у прыватнасці, загадзя выключалася магчымасць вывучэння медыцыны і правазнаўства); па навучальна-выхаваўчай дзейнасці Акадэмія падпарадкоўвалася Міністэрству асветы, а па веравызнальнай лініі – архіепіскапу рымска-каталіцкай царквы С. Сестранцэвічу; паколькі сродкі «Таварыства Ісуса» былі прызнаныя дастатковымі, урад адмаўляўся ад любой фінансавай дапамогі Акадэміі. Таксама ўказ даручаў генералу Т. Бжазоўскаму распрацаваць праект Статута Акадэміі і прадставіць яго ў Міністэрства асветы.

Гэтым крокам урад яшчэ раз пацвердзіў, што ён ні ў якім разе не збіраецца замахвацца на традыцыйную, кансерватыўную па духу, «старую» школу і нават хоча зрабіць яе элементам новай рускай дзяржаўнай сістэмы адукацыі. Акадэмія не толькі канчаткова пазбаўлялася ад надакучлівага Віленскага універсітэта, яна фактычна станавілася цэнтрам яшчэ адной новай навучальнай акругі. Дзяржава ў сувязі з рэарганізацыяй калегіі ў акадэмію не несла аніякіх матэрыяльных выдаткаў, паколькі фінансавалася за кошт уласнага фундуша і дадатковых сродкаў не атрымлівала.

1 сакавіка 1812 г. імператар выдае новы ўказ, які яшчэ больш дэталёва акрэсліў статус і структуру ствараемай Полацкай езуіцкай акадэміі:

*«Божиею поспешествующею милостию, Мы, Александр Первый, Император и Самодержец Всероссийский и проч., и проч., и проч.*

*Желая торжественно ознаменовать особенное благоволение Наше к Полоцкой Иезуитской Коллегии, толикую пользу принесшей воспитанием юношества, мы предназначили возвести заведение сие на степень Академии, поставив в зависимость от нея все другие Иезуитские Училища в Государстве и уравнив оную в правах и преимуществах с Университетами. В грамоте же сей заблагорассудили Мы явственно изложить присвоенные Университетам права, приличествующие сему ордену, соизволив Императорским Нашим словом за Нас и за Преемников Наших постановить следующее:*

*1) Полоцкая Иезуитская Коллегия, восприяв отныне наименование Академии, пребудет под непосредственным Нашим покровительством, и состоя по учебной части в совершенной зависимости от Министерства народного просвещения, управляема будет генералом иезуитского ордена.*

*2) В сей Академии преподаваемы будут науки, свободные Художества и языки, которые все должны быть разделены на три Факультета.*

*3) Первый Факультет заключает в себе языки; второй свободные Художества, философские и другие, как Естественные, так и Гражданские науки; третий Богословию и прочия науки, до веры касающиеся.*

*4) Факультет языков заключает в себе языки: 1) Российский, 2) Французский, 3) Немецкий, 4) Латинский, 5) Греческий, 6) Еврейский. В последствии времени, по усмотрению и одобрению Министерства Просвещения, Генерал Ордена может ввести какой-либо другой язык, полезный в Государстве.*

*5) В Факультете свободных Художеств, философии и других Естественных и Гражданских наук, преподаются: 1) Поэзия, 2) Риторика, 3) Нравственная Философия, 4) Логика и Метафизика, 5) Физика всеобщая, частная и опытная, 6) Химия, 7) Математика чистая и прикладная, 8) Архитектура Гражданская и Военная, 9) Право Естественное, Право частное и Право Римское Гражданское, 10) История Естественная и 11) История Всеобщая.*

*6) Для всех сих предметов академия имеет потребное число Профессоров.*

*7) Факультет Богословия и других наук, до веры касающихся, заключает в себе: 1) Богословию догматическую, 2) Богословию нравственную, 3) Священное писание, 4) Право Каноническое, 5) Священную Историю.*

*8) Каждый Факультет имеет особенного Декана, избираемого на определенное время академическим ученым собранием.*

*9) Избрания во все академические места и должности имеют быть производимы по большинству голосов в полном собрании Академии, и представляемы на утверждение Генералу, а от него министру Просвещения.*

*10) Все Иезуитские Училища, в Империи учрежденные и впредь учреждаемые, подчиняются Иезуитской Академии.*

*11) Генерал Ордена, не имея возможности всегда находиться в Полоцке, по причине обязанностей по его Ордену, управляет Академиею, так как и всегда бывало в сем Ордене, посредством Провинциала и Ректора сей самой Академии.*

*12) Ректор Академии имеет при себе четырех Советников или помощников, для облегчения его в отправлении должности и для совокупного рассуждения в важнейших предметах.*

*13) Каждый Декан Факультета представляет Ректору на усмотрение, что найдет полезным для введения вновь в употребление в его Факультет.*

*14) При Академии находится Канцлер, избираемый из людей, известнейших по своим обширным познаниям в науках, по своей неограниченной ревности и по испытанной способности к исправлению обязанностей сего звания. Должность его есть воспомоществовать Ректору в распоряжении учением, в управлении упражнений и публичных актов и суждений о познаниях тех, кои имеют быть допущены к актам, и к возведению на степени.*

*15) При Академии находится Секретарь, избираемый из самого Ордена. Он ведет список всем ученикам, постоянно посещающим училище; хранит Ректорскую печать и безвозмездно исправляет должность свою в отношении к ученикам.*

*16) Академия имеет собственного своего Нотариуса, который выдает свидетельства на получение степеней и производит все другие дела, с его должностью сопряженные.*

*17) Академия имеет Педелей («куратора») для каждого Факультета по одному.*

*18) Правила, относящиеся до поведения и занятий в науках учеников, выставляются публично; ректор же с подчиненными ему управляющими надзирает за точным их соблюдением.*

*19) Провинциал, при ежегодном осматривании Коллегии и других училищ сего Ордена, входит в порядок и успехи учения, делает о том донесения Генералу, который со своей стороны препровождает оные Министру Народного Просвещения.*

*20) Полоцкая Иезуитская типография состоит в ведении тамошней Академии. Цензура печатаемых в ней книг вверяется трем ученым Членам Общества, известным своими достоинствами.*

*21) Если бы какой-нибудь ученик, особливо из высших классов, оказался виновным в непослушании или в сопротивлении при важных случаях, то Ректор имеет право требовать посредства от Правительства и помощи Полиции.*

*22) Письма Ректора принимаются в Почтамтах безденежно; здесь разумеются и те, которые он сам направляет к начальникам различных учебных заведений сего Ордена и письма к нему сих последних.*

*23) Академия имеет право возводить в ученые степени, как то: в достоинство Магистров свободных наук Философии, также в Доктора богословия и прав Гражданского и Канонического.*

*24) По уважению того, что Полоцкая Иезуитская Академия возведена на равную степень с Университетами, существующими в государстве, аттестаты, от оной выдаваемые, имеют равную силу с аттестатами, выдаваемыми от упомянутых Университетов.*

*25) Студенты, удостоенные по испытанию аттестатов и похвальных свидетельств от Ректора Академии, при вступлении в службу получают чины 14 класса.*

*26) Академия может беспрепятственно выписывать из чужих краев, как морем, так и сухим путем, все нужные инструменты и книги для учебных занятий и для Академической Библиотеки.*

*27) Все здания, принадлежащие Академии, равно и загородный дом, близ Полоцка стоящий, дабы Профессоры и самые ученики могли во всякое время ходить туда для пользования чистым воздухом и отдохновений от тягостных ученых занятий, будут свободны от военного постоя.*

*28) В Академии позволено будут пользоваться знаками отличия, введенными в употреблении во всех Академиях Европейских.*

*29) Письмоводство Академии и производимые в ней дела освобождаются от всех пошлин и употребления гербовой бумаги.*

*Тако утверждая Императорскою Нашею Грамотою и ограждая благосостояние Полоцкой Иезуитской Академии, Мы надеемся, что Начальство и Члены оной, ревнуя о совершении Наших намерений, потщатся ничего не упустить из виду, дабы доставить сословию сему полное и непрерывное действие на пользу Академии и подведомых ей училищ.*

*В сем уповании благоволили Мы настоящую Грамоту, яко свидетельство непреложное воли Нашей, собственноручно подписать и повелели, утвердив оную Государственной печатью, отдать для хранения на вечные времена Академии. Дана в С.-Петербурге, Марта 1 дня 1812 г.»*

Асноўныя палажэнні царскага ўказу расшыфроўваліся і дэталізаваліся ў «Уставе или общих Постановлениях Полоцкой Иезуитской Академии». Навучанне на факультэце багаслоўя было разлічана на чатыры гады. Столькі ж часу працягваліся заняткі на факультэце філасофіі і вольных навук. Тэрмін падрыхтоўкі студэнтаў, якія вывучалі мовы, дакладна не вызначаўся і мог працягвацца «соразмерно надобностям и успехам». У Статуце змяшчаўся пералік дысцыплін, якія

выкладаліся на факультэтах, вызначаўся аб'ём выкладання. Згодна з гэтым дакументам на факультэце філасофіі і вольных навук прадугледжвалася 8 прафесарскіх пасад, моў – 6, тэалогіі (багаслоўя) – 5. Паколькі Статут Акадэміі так ніколі і не быў зацверджаны, гэты дакумент захоўваў характар асноватворнага дакументу, які рэгламентаваў жыццё Акадэміі на працягу ўсяго часу яе існавання.

Урачыстае адкрыццё Акадэміі адбылося 10 чэрвеня 1812 г. З гэтай нагоды ў Полацк з'ехалася нямала высокапастаўленых асобаў: беларускі генерал-губернатар князь Аляксандр Віртэмбергскі са світай, мінскі біскуп ксёндз Дзядзерка, уніяцкі архіепіскап Іаан Красоўскі і інш. Шырока прадстаўлена была і мясцовая эліта.

Галоўныя святкаванні пачаліся ў вялікай залі полацкай alma mater, дзе на залатой падушцы перад бюстам Аляксандра I памясцілі імператарскую грамату аб адкрыцці Акадэміі. Быў зачытаны віншавальны ліст мітрапаліта С.І. Богуша-Сестранцэвіча, галавы ўсіх рыма-каталікаў Расійскай імперыі (не прыехаў з-за прынцыповых рознагалоссяў з езуітамі), генерал-губернатар уручыў грамату біскупу Дзядзерку, пасля чаго ўсе прысутныя ў складзе ўрачыстай працэсіі накіраваліся ў касцёл Св. Стафана. У багата ўпрыгожаным храме быў па-польску зачытаны ўказ аб узвядзенні Полацкага калегіума ў ранг Акадэміі, была зроблена хвалебная прамова на адрас цара, былі на сямі мовах прадэкламаваныя вершы, прысвечаныя гэтай падзеі. Па заканчэнні цырымоніі езуіты далі шыкоўны абед, разлічаны на сто чалавек. Свята вылілася і на вуліцы горада. З гарадскіх валоў палілі з пяцідзесяці гармат. Ноччу езуіты ладзілі ілюмінацыю.

Ледзьве паспелі адгрымець урачыстасці, а ўжо праз два тыдні ў межы Расійскай імперыі ўвайшло напалеонаўскае войска. Вучні павыязджалі, а «прафесары збеглі ўглыб Расіі». У 1812 г. заняткі так і не пачаліся.

Езуіты і гэтым разам здолелі прадэманстраваць сваю лаяльнасць уладам. А вось у Вільні універсітэцкая прафесура і студэнцтва, наадварот, дыскрэдытавалі сябе шчырым супрацоўніцтвам з французамі (патрыятычныя колы звязвалі з Напалеонам спадзяванні на аднаўленне ВКЛ). У Пецярбургу было дастаткова ўплывовых чыноўнікаў, якія жадалі раз і назаўжды пакласці канец Віленскаму універсітэту – расадніку варожай пальшчызны. Менавіта тады ў калідорах Міністэрства народнай асветы ўзнікае план пераводу універсітэта ў Полацк (у Вільні збіраліся пакінуць толькі медыцынскі факультэт). Прадугледжвалася яго зліццё з Акадэміяй. Новая адзіная навучальная ўстанова, зразумела, трапляла б у рукі полацкіх езуітаў. Але намаганнямі А. Чартарыскага, блізкага сябра Аляксандра I і даўняга апекуна Віленскага універсітэта, гэты праект быў пахаваны. Апісаны эпізод падкрэсліў тое, што Акадэмія станавілася не проста прыладай для ўзмацнення пазіцый ураду ў краі, але гэтаксама сродкам уздзеяння ці нават стрымлівання Віленскага універсітэта.

8 студзеня 1813 г. адбылася ўрачыстая цырымонія, што звычайна папярэднічала пачатку навучальнага года, але з прычыны малалікасці студэнцтва вучоба пачалася ў сакавіку. І толькі 2 лістапада 1813 г. пайшоў адлік першаму нармальнаму навучальнаму году Полацкай езуіцкай акадэміі.

Аб'ектыўныя цяжкасці пасляваеннага часу не маглі не адбіцца на колькасці полацкага студэнцтва. Навучанне ў Акадэміі пачалі толькі 84 чалавекі. Першапачаткова факультэты былі прыкладна роўныя: 25 студэнтаў прыйшлі на тэалагічны, 29 – на філасофскі і 30 – на факультэт моў. Большасць з іх складалі прадстаўнікі манаскіх ордэнаў – езуітаў (43) і базыльянаў* (6), астатнія з'яўляліся свецкімі асобамі (35). З наступнага навучальнага года адукацыйны працэс стаў прыходзіць у нармальнае рэчышча: заняткі пачаліся 15 верасня 1814 г. і працягваліся да 15 ліпеня 1815 г. (гэты час пачатку і канца вучобы захоўваўся ўвесь час існавання Акадэміі).

Пасля другога набору студэнтаў (1814/1815 н.г.) сітуацыя некалькі змянілася. Колькасць студэнтаў, якія звязалі сябе з тэалогіяй, засталася ранейшай – 25 чалавек. Што датычыцца будучых філосафаў і філолагаў, то іх стала болей адпаведна на 37 (усяго 66) і 15 чалавек (45). Агульная колькасць выхаванцаў Акадэміі дасягнула максімальнага ўзроўню – 136. Прырост студэнцтва адбыўся амаль выключна за кошт свецкіх асоб. Пасля рэарганізацыі 1815 г. – факультэт філасофіі і моў былі аб'яднаныя – наваўтвораны факультэт стаў утрая большы за тэалагічны. Такая перавага забяспечвалася масай свецкіх навучэнцаў, што не збіралася заглы-

*Базыльяне—манахі уніяцкага ордэна Святога Васіля (Базыля).

бляцца ў багаслоўскія праблемы і абмяжоўваліся вывучэннем больш актуальных і перспектыўных свецкіх дысцыплін.

У наступныя гады лічба студэнтаў Акадэміі знізілася. У 1815/1816 н.г. тут займалася 109 чалавек (гэты год быў адзначаны аб'яднаннем факультэтаў філасофіі і моў), у 1816/1817 н.г. – 120, у 1817/1818 н.г. – 119. Далёка не апошнюю ролю ў гэтым адыгралі бурныя падзеі вакол езуіцкага ордэна. 17 жніўня 1814 г. папа рымскі Пій VII абнародваў брэве Sollicitudo omnium ecclesiarum («Клопат усіх цэркваў...») аб легалізацыі «Таварыства Ісуса» і аднаўленні яго ранейшых прывілеяў. Гэта азначала, што расійскае самадзяржаўе па сутнасці страчвала аднаасобны кантроль за езуітамі, а таму і не мела ахвоты трываць на сваёй тэрыторыі гэты перадавы атрад каталіцызму. Праваслаўныя іерархі, устрывожаныя поспехамі Ордэна (нават патомны расійскі арыстакрат князь Дзмітрый Галіцын стаў езуіцкім місіянерам!) і спалоханыя далейшымі перспектывамі яго экспансіі, здолелі пераканаць Аляксандра I у неабходнасці прыняцця актыўных антыезуіцкіх мер.

Хаця да поўнай забароны «Таварыства Ісуса» пакуль не дайшло, 20 снежня 1815 г. імператарскім указам езуітаў выдалілі з абедзвюх расійскіх сталіц. На тэрыторыі Беларусі Ордэну забаранілі прымаць на вучобу дзяцей праваслаўнага веравызнання. Праз два гады (1817 г.) Полацкую езуіцкую акадэмію пазбавілі, праўда толькі часова, права прысуджаць навуковыя ступені.

Часу, адпушчанага езуітам, заставалася вельмі мала. 13 сакавіка 1820 г. Аляксандр I загадаў: «1) иезуитов, как забывших священный долг не только благодарности, но и верноподданнической присяги, и поэтому недостойных пользоваться покровительством Российских законов, выслать под присмотром полиции за пределы государства и впредь ни под каким видом и наименованием не впускать в Россию; Полоцкую иезуитскую академию и подведомственные ей училища упразднить».

Апрача ўласна Акадэміі ў Полацку працаваў шэраг прама падначаленых ёй навучальных устаноў. Самай значнай з іх была пяцікласная калегія (яе яшчэ называлі гімназіяй). Яе дзейнасць таксама ажыццяўлялася на базе «Устава или общих постановлений Полоцкой Иезуитской Академии и принадлежащих к оной институтов, пансионов, семинарий, бурс и прочих училищ». Там выкладала каля дзесяці настаўнікаў-езуітаў і некалькі свецкіх асоб. Аб яе папулярнасці сведчыла ўзрастаючая колькасць вучняў: У 1813/1814 н.г. у калегіі налічвалася 197 хлопчыкаў, у 1814/1815 н.г. – 259, у 1815/1816 – 335, а ў 1816/1817 – 376.

З 1801 г. дзейнічаў разлічаны на 70 чалавек шляхецкі пансіён або канвікт (інтэрнат), што размяшчаўся ў асобным двухпавярховым будынку і прымыкаў з аднаго боку да касцёла, а з другога – да вучэбнага корпуса, зусім недалёка ад сталовай. Установа прызначалася для шляхецкіх дзяцей, бацькі якіх за гэта ўносілі плату (100 рублёў серабром у год, а з 1818 г. – 150 руб.). Узначальваў яго рэгент (regens), а пры ім працавалі пяць настаўнікаў-езуітаў. Гадаванцы гэтага пансіёну згодна сваёй падрыхтоўцы наведвалі або Акадэмію, або калегіум. У 1817 г. паслугамі канвікта карысталіся 62 юнакі (Прыкладна з 1803 па 1811 гг. у калегіуме дзейнічаў яшчэ і падобны «канвікт Гільзен-Шадурскіх», які ўтрымліваўся на фундуш памерлага буйнога саноўніка часоў ВКЛ).

Была і свая парафіяльная школа, разлічаная на самых бедных дзетак. Настаўнічаў у ёй манах-езуіт. Таксама ў разліку на маламаёмасную групу навучэнцаў, але ўжо са шляхецкага стану, была разлічана семінарыя. Выкладаў у ёй манах-езуіт, а дапамагалі яму два памочнікі. У 1817 г. тут займаліся 33 юнакі, а ў 1818 г. – 27. Апрача навучання семінарысты павінны былі прыслугоўваць падчас набажэнстваў, прыбіраць у касцёле і г.д. Большасць навучэнцаў нават забяспечвалася езуітамі уніформай.

Працягвала павялічвацца колькасць навучэнцаў полацкай бурсы езуітаў. У 1817 і 1818 гг. у ёй займаліся адпаведна 22 і 25 хлопчыкаў (у 1802 і 1807 гг. было толькі 10 і 16). На 1818 г. у полацкіх бурсістаў мелася 28 музычных інструментаў, якія траплялі сюды альбо дзякуючы фінансавай дапамозе апекуноў установы, альбо набываліся за езуіцкія грошы. Акрамя таго, у распараджэнні навучэнцаў была багатая музычная бібліятэка (548 нотных твораў толькі свецкага зместу).

Агульная колькасць выхаванцаў Акадэміі і падначаленых ёй устаноў няўхільна павялічвалася: у 1818 г. яна ўжо перавысіла 500 чалавек, а ў 1820 г., напярэдадні выгнання езуітаў, ужо набліжалася да 700.

Акрамя полацкіх навучальных устаноў, Акадэміі падпарадкоўваліся калегіумы ў Віцебску, Магілёве, Оршы, Мсціслаўлі, Чачэрску, Клімавічах, Пецярбургу (існаваў да 1815 г.), Рызе, Адэсе, Астрахані, Сараtаве, Раманаве (на Валыні).

Узначальвалі Полацкую езуіцкую акадэмію езуіты з багацейшым вопытам арганізацыйнай і педагагічнай дзейнасці. Першым рэктарам Акадэміі, з 1812 па 1814 гг., быў прафесар тэалогіі А. Люстыг. З 1814 па 1817 гг. кіруючыя функцыі выконваў А. Ляндэс, а з 1817 па 1820 гг. пасаду рэктара займаў выдатны тэолаг і пісьменнік Р. Бжазоўскі.

Выкладанне ў Акадэміі вялося вопытнымі вучонымі мужамі, толькі прафесарамі, якія маглі зрабіць гонар многім іншым навучальным установам, прычым, не толькі ў межах Расійскай імперыі. Утварыўся своеасаблівы сплаў амбітнай моладзі (зразумела, «моладзі» па тагачасных акадэмічных мерках) і абазнаных карыфеяў. З вядомых прычын сярод выкладчыкаў аказалася шмат іншаземцаў – Карнэлі Эверброк, Антоніа Калебота, Ігнацыа П'етрабоні, Матэа Малінары, Каэтан Анджаліні, Алаіза Руснаці, Якаб Кандраў, Петэр Лянге, Дэзідэрый Рышардо, Жак Журдан, Франсуа Гавот і многія іншыя. Працавала і нямала езуітаў – ураджэнцаў Беларусі: Францішак Дзеружынскі, Вінцэнт Бучынскі, Казімір Рагоза, Самуэль Гласко, Іосіф Цытовіч, Іасафат Залескі і інш.

Наяўнасць грашовых сродкаў дазваляла езуітам удала стымуляваць навуковую і літаратурную дзейнасць выкладчыкаў і студэнтаў. Значную ролю ў гэтым адыграў першы на тэрыторыі сучаснай Беларусі часопіс – Mesecznik Polocki («Полацкі штомесячнік»), які складаўся з шасці раздзелаў: літаратуры і вольных навук, маральна-філасофскага, фізіка-матэматычнага, гістарычнага, крытыкі і літаратурных навін. Выданне выходзіла на працягу 1818 – 1820 гг. Усяго за час яго існавання пабачыла свет 14 нумароў або сшыткаў, аб'яднаных у чатыры тамы.

Самая перадавая частка грамадства вельмі крытычна ставілася да езуіцкай адукацыі ўвогуле і да працы Акадэміі ў прыватнасці. Якія толькі мянушкі ёй не давалі: і «ордэн кавалераў смаргонскіх», і «смаргонская акадэмія»*, і «гняздо абскурантызму». Аднак Акадэмія ўпэўнена займала сваю адукацыйную нішу, знаходзіла прыхільнае стаўленне значнай часткі насельніцтва і яшчэ была здольная паспрыяць пашырэнню асветы на Беларусі. Безумоўна, статус духоўнай установы, глыбока рэлігійны светапогляд полацкай прафесуры, прынцыпова састарэлы, калі зыходзіць з крытэрыяў перадавой тагачаснай еўрапейскай навукі, накладаў значны адбітак на адукацыйны працэс. Таму было б не зусім карэктна параўноўваць Полацкую езуіцкую акадэмію са свецкім Віленскім універсітэтам (як не зусім правамерным было б параўноўваць дзейнасць сталічнай Віленскай езуіцкай акадэміі (універсітэта) з падпарадкаваным ёй правінцыйным Полацкім езуіцкім калегіумам). Але нават такі зацяты апанент езуітчыны, як польскі ліберал канца XIX ст. П. Хмялёўскі, прызнаваў самабытнасць фізіка Іосіфа Цытовіча, аўтара некалькіх кніг па фізіцы, выданых у друкарні акадэміі, і філосафа Вінцэнта Бучынскага, талент якога асабліва праявіўся пасля выгнання з Расійскай імперыі і працы ў вядомых еўрапейскіх універсітэтах.

Калі ўлічваць спецыфічны характар Полацкай акадэміі і ацэньваць яе дасягненні зыходзячы з тых задачаў, якія ставіліся перад ёй яе кіраўніцтвам, неабходна прызнаць прыкметную паспяховасць дзейнасці гэтай установы (тут было б, магчыма, не зусім карэктна праводзіць паралелі з Віленскім універсітэтам). Па-першае, за кароткі перыяд існавання Полацкай езуіцкай акадэміі было падрыхтавана шмат кваліфікаваных спецыялістаў. Розныя навуковыя ступені былі прысуджаны 123 выпускнікам. Напрыклад, дактарамі тэалогіі і кананічнага права сталі 17 чалавек, а дактарамі грамадзянскага права – 43. Ступень магістра філасофіі заслужылі 10 выпускнікоў, тэалогіі – 13, вольных навук – 2 і г.д. Па-другое, з муроў полацкай alma mater выйшла шмат проста добра адукаваных і выхаваных людзей: мастакі, святары, чыноўнікі і звычайныя абывацелі. Вось як, напрыклад, ацэньваў вартасці манаскіх навучальных устаноў вядомы польскі

*Ад назвы так званай «Смаргонскай акадэміі» Радзівілаў—школы дрэсіроўкі мядзведзяў.


В. Ванькові́ч, мініяцюра «Партрэт маладой жанчыны ў чырвоным» (1828), якая захоўваецца ў Эрмітажы

паэт-перакладчык А.Адынец: «Духоўныя школы давалі Віленскаму універсітэту самых добрасумленных і маральных студэнтаў і нават той чысты, узвышаны эстэтычны накірунак, які склаўся ў гэтым універсітэце, атрымаў свой пачатак ад студэнтаў, скончыўшых гэтыя школы».

Нямала выкладчыкаў і выпускнікоў полацкай alma mater занялі пачэснае месца ў гісторыі беларускага і іншых народаў. Былы прафесар тэалогіі Полацкай езуіцкай акадэміі Францішак Дзеружынскі (1779 – 1850) пасля выезду за межы Расійскай імперыі перабраўся ў Злучаныя Штаты Амерыкі, дзе спачатку садзейнічаў стварэнню сістэмы каталіцкай адукацыі, а потым узначаліў мясцовае падраздзяленне «Таварыства Ісуса». Прафесар філасофіі полацкай Акадэміі Вінцэнт Бучынскі (1789 – 1853) пасля 1820 г. выкладаў філасофію і тэалогію ў аўстрыйскіх каталіцкіх навучальных установах Цярнопаля, Граца, Лінца, Інсбрука, а потым у Лувенскім універсітэце, куды патрапіў па запрашэнні караля Бельгіі. Яму належыць арыгінальная трохтомная праца «Філасофскія разважанні», выдадзеная ў Вене.


Я. Баршчэўскі

Выхаванец полацкіх езуітаў Валенцій Ванькові́ч (1800 – 1842) стаў цудоўным жывапісцам. Пасля выгнання езуітаў ён працягнуў адукацыю ў Вільні. Па заканчэнні універсітэта за творчыя дасягненні быў накіраваны за дзяржаўны кошт на вучобу ў Пецярбургскую мастацкую акадэмію, дзе стаў адным з трох выпускнікоў, узнагароджаных залатым медалём. Асабліва праславіўся сваімі партрэтнымі палотнамі: «Міцкевіч на скале Аюдаг», «Напалеон каля вогнішча» і інш. Яго творы прадстаўлены ў Дзяржаўным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь, Нацыянальным музеі ў Варшаве і інш.

Ян Баршчэўскі (пасля 1790 – 1851) вырас у польска- і беларускамоўнага пісьменніка, аднаго з пачынальнікаў новай беларускай літаратуры. Яго празаічны зборнік «Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях» – не проста выдатны ўзор рамантызму ў літаратуры, але таксама адна з каштоўных крыніц па этнаграфіі беларусаў першай паловы XIX ст. (Дарэчы, выдаўцом першых трох томікаў твораў Баршчэўскага быў Ян Эйнерлінг – яшчэ адзін выхаванец Полацкай езуіцкай акадэміі). Эдвард Тамаш Масальскі (1799 – 1879) пасля Акадэміі вучыўся ў Віленскім універсітэце, дзе ўдзельнічаў у тайных студэнцкіх таварыствах. Ён стаў вядомы як пісьменнік і яркі публіцыст, падрыхтаваў шэраг прац па эканоміцы, этнаграфіі і філалогіі. Са ступенню кандыдата філасофіі са сцен полацкай alma mater выйшаў буйны царкоўны дзеяч Васіль Лужынскі (1783 ці 1789 – 1879), доктар багаслоўя (1825), уніяцкі епіскап (1838) і праваслаўны архіепіскап Полацкі і Віцебскі (1841). У 1866 г. ён быў прызначаны членам Свяцейшага Сінода.


Архіепіскап Полацкі і Віцебскі Васіль (Лужынскі)

## *Бібліятэка і друкарня*



Адно з цэнтральных месцаў у езуіцкай сістэме адукацыі і выхавання займалі бібліятэкі. Любая навучальная ўстанова «Таварыства Ісуса» магла пахваліцца шматтысячнымі кніжнымі зборамі. Асабліва вялікі ўнёсак у развіццё бібліятэчнай справы Ордэна прызнаецца за генералам Ваўрынцам Рыккі, які ў 1763 г. выдаў указ аб стварэнні спецыялізаваных кнігасховішчаў. Намаганні ордэнскага кіраўніцтва і прыезд у Полацк еўрапейскіх езуітаў дазволіў вельмі хутка аднавіць бібліятэчныя фонды калегіі, знішчаныя пажарам у 1750 г. Паводле інвентара 1787 г. у сховішчах езуітаў ужо налічваліся кнігі 5 576 аўтараў. І штогод іх колькасць павялічвалася.

На жаль, падрабязных вопісаў кніжных фондаў полацкіх езуітаў даследчыкам адшукаць так і не ўдалося. Хутчэй за ўсё, каталогі страчаны незваротна. Як адзначалася яшчэ ў справаздачы камісіі па прыёмцы паезуіцкай маёмасці ў 1820 г.: «Вопісы полацкіх бібліятэк былі знішчаны французамі». Аднак і тыя звесткі, што сёння вядомыя гістарычнай навуцы аб езуіцкіх бібліятэках, не пакідаюць сумненняў адносна іх выключнага багацця.

Напачатку XIX ст. колькасць кніг працягвала ўзрастаць. Калі ў 1806 г. у двух буйнейшых бібліятэках (Галоўнай і Польскай) налічвалася каля 20 тысяч тамоў, то ў 1815 г. іх колькасць ужо дасягала 35 тысяч. Напярэдадні выгнання езуітаў з Расійскай імперыі ў Галоўнай бібліятэцы езуітаў, дзе змяшчаліся кнігі на еўрапейскіх і ўсходніх мовах, было 30 тысяч тамоў, а ў Польскай (была прадстаўлена выключна польскамоўная літаратура) – каля 10 тысяч. Гэтыя кнігазборы прызначаліся толькі для працы прафесараў Калегіі і Акадэміі. Апрача таго полацкім езуітам належалі Студэнцкая бібліятэка, бібліятэка канцылярыі Акадэміі (Калегіі), бібліятэка кнігарні, бібліятэка друкарні, бібліятэка музычнай бурсы, бібліятэкі касцёлу, а таксама нямала падручных або спецыялізаваных бібліятэк.

Кіраваў справамі бібліятэк прэфект, якога прызначаў правінцыял Ордэна. Прэфект быў абавязаны пільна сачыць, каб у кнігазборы не прасачыліся працы, пазначаныя ў «Індэксе забароненых кніг» (спіс упершыню быў апублікаваны папскім прастолам у 1559 г. і рэгулярна абнаўляўся ажно да 1966 г.) альбо надрукаваныя выдавецтвамі з дрэннай рэпутацыяй. Ён адказваў за забеспячэнне прадпісанага правіламі доступу да кніжных фондаў ды іх належнага захоўвання, што, у прыватнасці, патрабавала абавязковую каталагізацыю ўсёй друкаванай прадукцыі ў сценах установы. Падобна да ўсіх навучальных устаноў Літоўскай правінцыі «Таварыства Ісуса», у Полацку на пасаду прэфекта прызначаліся ксяндзы з багатым вопытам выкладчыцкай дзейнасці, як правіла, на пасадзе прафесараў рыторыкі і паэтыкі.

Галоўная і Польская бібліятэкі размяшчаліся ў адным вялікім памяшканні. Па звычайнай практыцы езуітаў, якія імкнуліся стварыць для захавання кніг больш спрыяльны тэмпературны рэжым і забяспечыць для чытачоў якаснае натуральнае асвятленне, яно знаходзілася на другім паверсе. Даволі звыклым для «Таварыства Ісуса» было размяшчэнне пад бібліятэкай сталовай. Важных гасцей езуіты спачатку шчодра частавалі, а потым суправаджалі ў сховішчы сваіх кніжных скарбаў: насычэнню цялеснаму на змену прыходзіла падсілкаванне духоўнае.

Паводле зробленых у 1820 г. апісанняў, памяшканне, дзе знаходзіліся асноўныя бібліятэчныя фонды, упрыгожваў сасновы паркет, а сцены – 10 партрэтаў, у тым ліку Кацярыны II і Аляксандра I. Пасля таго, як у 1763 г. генерал В. Рыккі даў распараджэнне кіраўніцтву езуіцкіх калегіяў і рэзідэнцый забяспечыць памяшканні бібліятэк абсталяваннем і пісьмовымі прыналежнасцямі, неабходнымі для вядзення запісаў, у сярэдзіне бібліятэчнай залы з'явіліся дзевяць сталоў з абцягнутымі скурай табурэтамі, а побач з галоўным кнігасховішчам падрыхтавалі некалькі пакояў для працы з літаратурай. Кнігі захоўваліся ў шафах і згодна з існаваўшымі патрабаваннямі размяркоўваліся на паліцах у строгай тэматычнай адпаведнасці. Напрыклад, скарбы Галоўнай бібліятэкі змяшчаліся

ў 21 вялікай, 9 сярэдніх і 6 малых (знаходзіліся пад кожным з вакон памяшкання) шафах.

Нечаканае выгнанне «Таварыства Ісуса» з Расіі і закрыццё яго навучальных установ спарадзілі стан поўнага хаосу, у якім немагчыма было падтрымліваць элементарны парадак і захаванасць езуіцкай маёмасці. На працягу некалькіх дзён бібліятэка проста рабавалася. Рэдкія і каштоўныя кнігі ў горадзе прадаваліся за грашы (як згадвалі сведкі тых падзей, яшчэ праз гады на полацкіх кірмашах некаторыя спрытныя гандляры загортвалі свае тавары ў паперу з некалі нарабаваных або купленых на вагу езуіцкіх кніг). Толькі стварэнне спецыяльнай камісіі для апісання і прыёму паезуіцкай маёмасці і яе ўмяшанне ў ход спраў паклала канец знішчэнню бібліятэк.

На красавік 1820 г. дадзеная камісія засведчыла наяўнасць толькі 13 490 кніг у Галоўнай і 2 436 – у Польскай бібліятэках. Акрамя таго, 3 708 тамоў заставалася ў студэнцкай бібліятэцы, 700 – у бібліятэцы клірыкаў, 45 – у бібліятэцы акадэмічнай канцылярыі, 3097 – у манастырскіх келлях (відавочна, частка з пакінутых манахамі-езуітамі асабістых кнігазбораў).

У кнігасховішчы знаходзілася яшчэ звыш 95 тысяч асобнікаў не перапleцeных кніг, надрукаваных у Полацку, а ў былой кніжнай краме Акадэміі было яшчэ больш за 4 тысячы тамоў. Гэткім чынам, камісія зафіксавала наяўнасць без малога 123 тысяч кніг.

Велізарнае значэнне для развіцця адукацыі не толькі ў Полацку, але і далёка за яго межамі мела прадастаўленне Кацярынай II езуітам права на адкрыццё ўласнай друкарні (1787). За ўвесь час існавання (1787 – 1820) яна выпусціла ў свет больш за 500 выданняў пераважна на польскай і лацінскай, а таксама на рускай, італьянскай, нямецкай і французскай мовах.

Значная доля кніг прыпадала на падручнікі: па ўсеагульнай геаграфіі і гісторыі Рыма (1788), па граматыцы лацінскай мовы (1790, 1794), рыторыцы (1790, 1799). Друкаваліся слоўнікі, навуковыя і літаратурныя творы (Вяргілій, Гарацый, Пліній). Не заўсёды кнігі адпавядалі патрабаванням часу, частка з іх, напрыклад, шырока крытыкаваная ў той час лацінская граматыка Альвара, даўно састарэла. Тым не менш, па забяспечанасці падручнікамі, навучальнымі дапаможнікамі і навуковай літаратурай (праўда, да яе доступ быў абмежаваны) полацкія езуіцкія ўстановы мала каму саступалі.

З канца XVIII ст. у друкарні выдавалі «Каляндар полацкі», дзе змяшчаліся краязнаўчыя матэрыялы, звесткі па гуманітарных і фізіка-матэматычных навуках, крытыка-бібліяграфічныя агляды, пераклады, апісанні падарожжаў у Сібір і на Каўказ. У 1818 – 1820 гг. (з перапынкам у 1819 г.) тут выдаваўся часопіс Mesecznik Polocki («Полацкі штомесячнік»).

## *Полацкі езуіцкі музей*

Важная роля ў навучальным працэсе ў сценах полацкіх езуіцкіх установ належала музею. Ініцыятыва ў яго стварэнні належала ўраджэнцу Вены, славенцу па паходжанню Габрыэлю Груберу (1740 – 1805). Чалавек з сапраўды энцыклапедычнымі ведамі, Г. Грубер атрымаў адукацыю ў калегіуме Граца і Венскім універсітэце, потым выкладаў у Люблянскім калегіуме, пасля скасавання Ордэна быў запрошаны на пасаду прыдворнага фізіка аўстрыйскага імператара Іосіфа II Габсбурга, выконваў адказныя функцыі на суднаверфях у Трыесце, кіраваў асушэннем балот у Славоніі і Венгрыі. З пераездам у Полацк у 1784 г. ён распрацоўвае праект спецыяльнага музейнага будынку калегіума і актыўна ўключаецца ў стварэнне музея. Яго адкрыццё адбылося ў 1788 г., калі быў дабудаваны новы трохпавярховы корпус. На першым паверсе размяшчаліся лабараторыя з дапаможным памяшканнем і кабінет натуральнай гісторыі, а ўвесь другі паверх займаў фізічны (фізіка-механічны) кабінет. Сцены былі ўпрыгожаны фрэскамі самога Габрыэля Грубера, у калідоры другога паверха была выстаўлена багатая калекцыя карцін.

У кабінеце натуральнай гісторыі (прыродазнаўства) у банках са спіртам былі прадстаўлены цялесныя анамаліі людзей і звяроў, выстаўляліся чучалы

жывёл і птушак. У наваколлях Полацка езуіты правялі даследаванне глеб, распрацавалі іх класіфікацыю і прадставілі ў музеі адпаведныя акварэльныя выявы, якія суправаджаліся тлумачальнымі тэкстамі («колер чорнай зямлі, якая знаходзіцца ў самым Полацку над ракой Палатой» і г.д.). У кабінеце былі прадстаўлены «розныя зямельныя металы», рэдкія і каштоўныя камяні, а таксама зробленыя з іх прадметы, камяні і акамянеласці, знойдзеныя ў ваколіцах Полацка. У 1807 г. сталічны візітатар, высока ацэньваючы калекцыю металаў, адзначыў: «Шкада, што такі цудоўны і светлы збор выкарыстоўваюць толькі семінарысты». Ужо ў 1835 г. выкладчык кадэцкага корпуса А. Марэль адзначыў, што ў мінералагічным кабінеце знаходзіліся: 2 алмазы, 6 рубінаў, 20 ізумрудаў, 5 сапфіраў, больш за 100 штук цыркона, 40 кавалкаў граната, 24 тапазы і 20 аметыстаў! Выдатная калекцыя прадстаўляла раслінны свет. Меліся розныя пароды дрэва (387 дошакузораў), гербарый (518 раслін) і выкапнёвыя алеі (57 шклянак).

У фізічнай частцы музея размяшчаліся электрычныя машыны і іншыя фізічныя апараты, механічныя, аптычныя і астранамічныя прыборы і абсталяванне. У кабінеце былі прадстаўлены разнастайныя дзеючыя мадэлі. Гэтак пры вывучэнні механікі вучні атрымлівалі магчымасць пазнаёміцца з уладкаваннем і працай машыны для забівання сваяў. Наведвальнікаў і гасцей музея асабліва ўражвала тое, што большасць механізмаў былі выкананы ў Полацку (нямала – Г. Груберам ці пад яго непасрэдным кіраўніцтвам). Выдатна абсталявана была і хімічная лабараторыя.

У залі для заняткаў маляваннем, жывапісам і архітэктурай знаходзілася вялікая колькасць кніг, малюнкаў і гравюр, былі прадстаўлены мадэлі будынкаў усіх архітэктурных стыляў з узорамі кладкі і дахаў, мадэлі мастоў і мадэль пабудовы карабля і г.д. Таксама ёсць згадкі пра этнаграфічныя калекцыі, якія былі прадстаўлены ў музеі.

Галерэя музея змяшчала выдатныя жывапісныя работы, якія, па словах сучаснікаў, маглі б стаць упрыгожаннем любога еўрапейскага музея, чатыры мазаічныя работы, разнастайныя рэчы з бурштыну і многія іншыя мастацкія каштоўнасці. Сярод выстаўленых палотнаў асаблівую каштоўнасць мелі творы італьянскага мастака Сальватарэ Розы (1615 – 1673). Карціны гэтага выдатнага вучня знакамітага іспанца Хосэ дэ Рыберы і сёння ўпрыгожваюць лепшыя музеі свету – парыжскі Луўр, Нацыянальную галерэю ў Лондане і інш. Былі партрэты манаршых асобаў, у тым ліку С. Баторыя і Аляксандра I, правадыроў еўрапейскай Рэфармацыі Марціна Лютэра і Жана Кальвіна (зусім нечакана для езуітаў – палымяных барацьбітоў з пратэстантызмам!) і іншыя. Багатай была калекцыя копій твораў вялікіх мастакоў, напрыклад, Рафаэля, Тыцыяна, Рубенса.


*Сальваторэ Роза. Аўтапартрэт*

Падчас вайны 1812 г. шараговыя французскія салдаты, размешчаныя ў будынках езуіцкай акадэміі, нанеслі музею вялікую шкоду: частка экспанатаў была папросту знішчана, частка – моцна папсавана. Аднак і ў 1820 г., калі спецыяльная сталічная камісія апісвала паезуіцкую маёмасць, былі зафіксаваны 498 адзінак захоўвання. Пасля выгнання езуітаў значная музейная спадчына засталася піярам і кадэцкаму корпусу.

## Полацкае вышэйшае піярскае вучылішча (1822 – 1830)

Выгнанне «Таварыства Ісуса» было на руку Віленскаму універсітэту. Цяпер ён не толькі прэтэндаваў на непадзельнае панаванне на землях былога ВКЛ у адукацыйнай сферы, але і разлічваў, прынамсі, на частку былой езуіцкай маёмасці. У Міністэрства народнай асветы паступіла прапанова аб стварэнні на месцы езуіцкай акадэміі свецкага юрыдычнага ліцэя, фактычна юрыдычнага факультэта універсітэта, на ўзор яраслаўскага Дзямідаўскага ліцэя. Па словах кіраўніцтва віленскай alma mater, патрэба ў такой установе заключалася ў аднаўленні страчанага адзінства адукацыйнай сістэмы на тэрыторыі навучальнай акругі. На самой справе гэта хутчэй дэманстравала непрыхаванае жаданне Вільні не дапусціць стварэння на шыкоўнай паезуіцкай базе прарасійскай установы. Небяспека падобнага развіцця падзеяў не ўяўлялася неверагоднай. Прыкладна ў той самы час руская чыноўніцкая і афіцэрская эліта Гомеля актыўна змагалася за адкрыццё ў горадзе вучылішча са статусам, падобным да знакамітага Царскасельскага ліцэя. Падобны прыклад мог натхніць на больш рашучыя дзеянні і частку мясцовага насельніцтва і ўказаць расійскім уладам на магчымы накірунак развіцця народнай адукацыі на землях Беларусі і Літвы.

Аднак Аляксандр I вырашыў распарадзіцца езуіцкай спадчынай па-іншаму. Прапанова універсітэта не прайшла па празаічнай прычыне недахопу сродкаў на ўтрыманне яшчэ адной установы. У выніку яна дасталася іншым манаскім ордэнам, якія маглі ўскласці цяжар фінансавання школаў на свае плечы.

Наступнікамі езуітаў у Полацку сталі манахі піярскага ордэну. Падобны зыход быў для Віленскага універсітэта зусім нядрэнным. Адносіны паміж Вільняй і піярамі былі прыязныя, а кантакты шчыльныя – сярод выкладчыкаў універсітэта было нямала іх былых гадаванцаў і нават выкладчыкаў-піяраў. І ў любым выпадку аднаўлялася арганізацыйнае адзінства Віленскай навучальнай акругі.

У адказ на просьбу піяраў даручыць ім пераўтварэнне былых езуіцткіх вучылішчаў Навуковы камітэт аддаў распараджэнне Ордэну арганізаваць у Полацку Вучылішча Вышэйшых Навук. 14 красавіка 1822 г. гэтае рашэнне было зацверджана імператарам. Ужо ў жніўні 1822 г. піяры атрымалі былы езуіцкі касцёл, будынкі колішняй акадэміі, бібліятэкі, кабінеты мінералогіі і фізікі.

Вышэйшае піярскае вучылішча распачало сваю дзейнасць 1 верасня 1822 г., калі былі адкрытыя заняткі ў 4 ніжэйшых класах. З 15 верасня пачалося навучанне і на вышэйшых курсах.

Паводле статута вучылішча падзялялася на тры аддзяленні. Першае ўяўляла сабой падрыхтоўчы клас (або прыходскае вучылішча). Другое складалася з чатырох класаў і прыблізна адпавядала ўзроўню гімназіі 2-га разраду. На трэцім аддзяленні былі тры гадавыя класы, яны называліся «Курсы вышэйшых навук». Займалася ў Полацкім вышэйшым піярскім вучылішчы звыш 200 чалавек. Прэфектам вучылішча быў прызначаны В. Іжыховіч.

На апошнім этапе навучання выкладаліся больш складаныя дысцыпліны – не толькі тыповыя гімназічныя прадметы, але і тыя, што звычайна ўваходзілі ў праграмы ліцэяў ці нават ніжэйшых курсаў універсітэтаў. Агульная колькасць прадметаў, якія выкладаліся ў вучылішчы, набліжалася да дваццаці. Таму не трэба здзіўляцца, што шмат расійскіх чыноўнікаў, якія наведалі вучылішча, знаходзілі яго вельмі падобным на ліцэй і пісалі аб ім як аб вышэйшай навучальнай установе. Пры гэтым адзначалася, што ў параўнанні з мінулымі часамі (напрыклад, з XVIII ст.), якасць піярскай адукацыі прыкметна знізілася.

Аднак ужо неўзабаве на піярскае вучылішча насунуліся суровыя хмары. Вольналюбівае студэнцтва і некаторыя маладыя выкладчыкі аказаліся замешаныя ў арганізацыі тайнага таварыства, звязанага з дзеячамі і арганізацыямі польскага нацыянальнага руху ў Віленскім універсітэце. Магчыма, усталяванню гэтых кантактаў паспрыяў Іаахім Лялевель (1786 – 1861), намеснік прафесара гісторыі Віленскага універсітэта, выдатны навуковец (заснавальнік рамантычнай школы ў польскай гістарыяграфіі) і грамадзянскі дзеяч, які ў 1822 г. прыязджаў у Полацк з лекцыямі для навучэнцаў і выкладчыкаў вучылішча.



І. Лялевель

У выніку хуткага разбіральніцтва ў 1824 г. прэфект вучылішча Лашкевіч, а таксама два выкладчыкі М. Брадовіч (усеагульная гісторыя і права) і К. Львовіч (натуральная гісторыя) былі вымушаны пакінуць свае пасады. Для недапушчэння далейшага распаўсюджвання крамолы з Віленскага універсітэта ў 1824 г. полацкія разам з іншымі навучальнымі ўстановамі Віцебскай і Магілёўскай губерняў былі пераведзены з Віленскай у Санкт-Пецярбургскую акругу.

Але і гэта не здолела даць належны эфект. У 1826 г. па Полацку сталі з'яўляцца ўлёткі рэвалюцыйнага зместу. Па гэтай справе быў арыштаваны 17-гадовы юнак, трэцякласнік вучылішча Восіп Дабашынскі. Для піярскага вучылішча надышлі яшчэ горшыя часы. У 1826 г. была перагледжана праграма, што, у прыватнасці, прывяло да паглыблення вывучэння рускай мовы. Была нават створана свая спецыяльная школьная паліцыя. Як не без задавальнення адзначаў сталічны чыноўнік Сенкоўскі: «цішыня і парадак запанавалі сярод вучняў вучылішча». Але паколькі тое, «што было дагэтуль, мала абнадзейвае будучыню», ён прапаноўваў піярскае вучылішча распусціць, а замест яго ў Віцебску арганізаваць ліцэй.

Са стварэннем у 1829 г. асобнай Беларускай навучальнай акругі вучылішча патрапляе ў крытычнае становішча. Яго папячыцель Р.І. Карташэўскі прама заявіў, што «адукацыя юнацтва даручана манахам, якім дзяржаўная карысць чужая», і распачаў вайну з ордэнамі. Стала вядома пра планы заснавання ў Полацку уніяцкай духоўнай акадэміі. У горадзе двум падобным установам было б цесна. Цяпер і піяры рыхтаваліся да таго, каб пакінуць сцэну. Указ аб роспуску вучылішча выйшаў 21 лютага 1830 г.

Ліквідацыя піярскага вучылішча паставіла пытанне аб багацейшай бібліятэцы, чыё існаванне ад гэтага часу станавілася бессэнсоўным. Зацікаўленасць у лёсе кніг, назапашаных езуітамі на працягу больш як двух стагоддзяў, гэтым разам выказалі расійскія дзяржаўныя саноўнікі вышэйшага рангу і нават сам імператар. Мікалай І (1825 – 1855) аддаў распараджэнне міністру ўнутраных спраў Дз.М. Блудаву сабраць вычарпальныя звесткі пра паезуіцкую бібліятэку і падрыхтаваць прапановы адносна магчымага размеркавання кніг паміж зацікаўленымі ўстановамі. Як асобна пазначалася ў дакуменце, кнігі па матэматыцы і ваеннаму мастацтву павінны застацца ў распараджэнні кадэцкага корпуса, адкрыццё якога неўзабаве павінна было адбыцца ў Полацку.

Па выніках вывучэння полацкіх кніжных фондаў Дз.М. Блудаў палічыў мэтазгодным размеркаваць найбольш каштоўныя выданні паміж галоўнымі кнігазборамі імперыі.

Імператарская публічная бібліятэка павінна была атрымаць неабходныя ёй выданні старажытных і сучасных аўтараў, у першую чаргу – самыя рэдкія і багатыя з іх. Пецярбургскі універсітэт быў у праве разлічваць на кнігі па педагогіцы вышэйшай школы і літаратуру на ўсходніх мовах, а Маскоўскі – на працы па медыцыне («ибо сей университет имеет факультет медицинский, а в нем хорошей библиотеки по сей части нет»). Частку паезуіцкай бібліятэкі (выданні, якія датычыліся ўладкавання і канонаў каталіцкай царквы, слоўнікі і г.д.) было прапанавана перадаць у Галоўнае ўпраўленне духоўных спраў і замежных веравызнанняў. Беларускія гімназіі, на думку Дз.М. Блудава, маглі разлічваць толькі на польскамоўныя гістарычныя і літаратурныя працы, а каталіцкія навучальныя ўстановы – на выданні духоўнага, прапаведніцкага, палемічнага і катэхістычнага характару. Полацкаму кадэцкаму корпусу меркавалася перадаць кнігі па матэматыцы, фізіцы, хіміі, гістарычную і мастацкую літаратуру на жывых мовах, а таксама адпаведныя слоўнікі гэтых моў.

Для канчатковага падзелу паезуіцкай бібліятэкі па распараджэнні міністра ўнутраных спраў была створана спецыяльная камісія, у якой былі прадстаўлены ўсе зацікаўленыя бакі: міністэрства народнай асветы, Галоўнае ўпраўленне духоўных спраў і замежных веравызнанняў і ваеннае ведамства. Пасля двух з паловай месяцаў

працы было вырашана 266 кніг перадаць у Імператарскую публічную бібліятэку, 3878 (і яшчэ 576 няпоўных, г. зн. захаваных не цалкам) – у Пецярбургскі універсітэт, 343 (22 няпоўныя) – у Маскоўскі, 1396 (240 няпоўных) пайшлі ў «міністэрства культаў», 3219 (345 няпоўных) – у Рымска-каталіцкую калегію і семінарыю. У Полацку для кадэцкага корпуса заставалася толькі 1149 тамоў і яшчэ 328 няпоўных выданняў! Была перагорнута яшчэ адна старонка ў гісторыі адукацыі ў Полацку...

## *Полацкі кадэцкі корпус (1835 – 1918)*

Спадчына, пакінутая езуітамі ў Полацку, адкрывала для развіцця адукацыі самыя шырокія магчымасці. 22 красавіка 1828 г. у Сенат быў перададзены ўказ Мікалая І, дзе змяшчалася патрабаванне знайсці сродкі на стварэнне Полацкай духоўнай акадэміі. 28 красавіка гэтага ж году выйшаў яшчэ адзін указ – аб яе адкрыцці. Тым не менш, рэалізацыя гэтага праекту была адтэрмінавана спачатку на год (праблемы з памяшканнямі і выкладчыцкімі кадрамі), а потым на два – успыхнула чарговае шляхецкае паўстанне (1830 – 1831). Пасля да гэтай ідэі ўжо не вярнуліся.

26 красавіка 1830 г. з мэтаю «проведения на Западном крае идеи русского просвещения, русского патриотизма и русского дела» царскім урадам было прынята рашэнне на месцы піярскага вучылішча заснаваць Полацкі кадэцкі корпус, разлічаны на 400 навучэнцаў. Стваралася ўстанова для дзяцей дваран Віленскай, Віцебскай, Гродзенскай, Магілёўскай, Мінскай, Смаленскай губерняў і Беластоцкай вобласці, а таксама для дзяцей афіцэраў і чыноўнікаў ваенных пасяленняў Віцебскай і Магілёўскай губерняў. Першым начальнікам Полацкага кадэцкага корпуса быў прызначаны (1834) генерал-маёр П.К. Хвашчынскі.

Пасля доўгай падрыхтоўчай працы 25 чэрвеня 1835 г. (на дзень нараджэння імператара Мікалая І) Полацкі кадэцкі корпус быў урачыста адкрыты. У перыяд з 1835 па 1857 гг. заняткі праводзіліся на 2-гадовых падрыхтоўчых і 4-гадовых агульных курсах. Па заканчэнні ўсяго вучэбнага цыклу для працягу вайсковай адукацыі кадэты пераводзіліся ў сталічны Дваранскі полк. Паспяховае развіццё адукацыйнай справы ў корпусе дазволіла паставіць пытанне аб рэарганізацыі навучання. З 1857 г. тэрмін вучобы быў павялічаны з 6 да 9 гадоў. 2 гады адводзілася на наведванне падрыхтоўчых класаў, 5 – агульных, 2 – спецыяль-



*Від з Задзвіння на Полацкі кадэцкі корпус (пачатак XX ст.)*





*Будынкі Полацкага кадэцкага корпуса пачатку XX ст. (з фондаў Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка)*



*Мікалаеўскі сабор і фасад Полацкага кадэцкага корпуса пачатку XX ст. (з фондаў Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка)*



*Кадэты на ўроку гімнастыкі*

ных, прычым сканчэнне апошніх прыносіла выпускніку прысваенне афіцэрскага звання. Паводле штатнага раскладу кадэты падзяляліся на 4 роты – 3 ранжыраваныя (грэнадзёрская і 2 мушкецёрскія) і неранжыраваную.

Пачатак вайсковай рэформы ў Расійскай імперыі моцна паўплываў на ўсю сістэму падрыхтоўкі афіцэраў ў дзяржаве. У 1862 г. на месцы Полацкага кадэцкага корпуса была створана Полацкая ваенная гімназія, якая па адукацыйным напаўненні нагадвала рэальнае вучылішча. Замест ротнага падзелу навучэнцаў уводзіцца ўзроставы (малодшы, сярэдні, старэйшы). Па заканчэнні гэтай гімназіі большая частка выпускнікоў пераводзілася ў ваенныя вучылішчы імперыі. У 1882 г. Полацкі кадэцкі корпус быў адноўлены як 7-гадовая сярэдняя вайсковая ўстанова. Пасля поўнага курса навучання большая частка выпускнікоў накіроўвалася для працягу адукацыі ў вайсковыя вучылішчы.



*Спальныя памяшканні корпуса*

Як таго і патрабавала агульная скіраванасць установы, большасць выкладчыкаў Полацкага кадэцкага корпуса (ваеннай гімназіі) складалі афіцэры і выхадцы з цэнтральных губерняў Расіі (фізік М.В. Папоў з Варонежскай губерні, палкоўнік А.П. Аргамакаў з Тульскай губерні і г.д.), абсалютна пераважалі асобы праваслаўнага веравызнання. З часам сярод выкладчыкаў з'явіліся выпускнікі: генерал-маёр Р.П. Караваеў (з 1864 па 1867 г. – дырэктар ваеннай гімназіі), палкоўнік А.С. Чыж і яго брат падпалкоўнік І.С. Чыж і г.д. Для выхавання полацкіх кадэтаў таксама прыцягваліся спецыялісты з далёкага замежжа (выпускнік Венскай балетнай школы, выкладчык танцаў І. Кудзелька, выхаванец Брусельскай кансерваторыі – А.Ж. Маршал і г.д.).

Арганізацыя навучальнага працэсу заставалася практычна нязменнай: акадэмічны год працягваўся з 15 жніўня па 5 чэрвеня, заняткі пачыналіся а 8 гадзіне і працягваліся да 15 гадзіны. У корпусе выкладаліся агульнаадукацыйныя дысцыпліны: Закон Божы, руская, нямецкая і французская мовы, руская і ўсеагульная гісторыя, геаграфія, матэматыка (у тым ліку арыфметыка, алгебра, геаметрыя, трыганаметрыя, аналітычная геаметрыя), фізіка, хімія, заканазнаўства, чарчэнне, мінералогія, фізіялогія, батаніка, касмаграфія, маляванне, музыка, спевы, танцы. У лік спецыяльных вайсковых прадметаў уваходзілі: тактыка, артылерыя, ваенная гісторыя і фартыфікацыя. Вялікая ўвага надавалася фізічнай падрыхтоўцы кадэтаў (страявыя заняткі, плаванне, гімнастыка, фехтаванне).




*Пагоны полацкіх кадэтаў* | *Выпускны знак*

Да навучэнцаў прад'яўляліся высокія патрабаванні. Напрыклад, у 1847/1848 н.г.



*Р. І. Кандраценка*

у ліку непаспяховых аказалася каля 30 % усіх кадэтаў! Змаганне за павышэнне якасці ведаў вялося і ў накірунку ўдасканалення педагагічнага майстэрства выкладчыцкага складу. Несумненна, якраз агульным высокім узроўнем выкладання і выхавання ў Полацкім кадэцкім корпусе можна патлумачыць выбар вялікага князя Канстанціна Канстанцінавіча, які ў 1907 г. аддаў сюды вучыцца свайго сына Алега.

Варта адзначыць, што нягледзячы на фармальна саслоўны характар установы, з часам у лік полацкіх кадэтаў трапляе болей і болей недваран. Напрыклад, у 1915 г. з 403 навучэнцаў корпуса толькі 307 належалі да прывілеяванага саслоўя (48 кадэтаў належалі да мяшчан, 4 – да сялян і г.д.).

У жніўні 1917 г. кадэцкі корпус быў перайменаваны ў Полацкую гімназію ваеннага ведамства. Але Кастрычніцкая рэвалюцыя і прыход да ўлады бальшавікоў пакідалі гэтай навучальнай установе зусім малыя шанцы на выжыванне. Апошнім годам яе існавання стаў 1918, калі новая ўлада канчаткова адмовілася ад утрымання ваенных вучылішчаў ваеннага ведамства. У час грамадзянскай вайны рэшткі полацкага кадэцкага корпуса, нямала яго выпускнікоў звязалі свой лёс з белым рухам. Пасля канчатковай перамогі савецкай улады тыя, хто выжылі, былі вымушаны з'ехаць на чужыну. Гэткім чынам сцяг Полацкага кадэцкага корпуса захоўваецца ў праваслаўным Саборным храме ў Нью-Йорку.



*П. В. Баброўскі*

За ўвесь час існавання Полацкага кадэцкага корпуса з яго сцен выйшлі звыш 3 тысяч афіцэраў. Сярод найбольш знакамітых выхаванцаў полацкай alma mater быў двойчы Георгіеўскі кавалер генерал-лейтэнант Р.І. Кандраценка (выпускнік 1874 г.), герой абароны Порт-Артура. Георгіеўскімі крыжамі былі ўзнагароджаны таксама генерал-маёр І.І. Мразоўскі (1874), генерал-лейтэнант А.В. Няміра (1844), генерал ад інфантэрыі У.В. Смірноў (1865), палкоўнікі В.В. Шаўроў (1849), А.М. Левікаў (1891) і інш.

Нямала выпускнікоў кадэцкага корпуса знайшлі сябе ў мірнай працы. В.У. Навадворскі (1878) зрабіў выдатную навуковую і педагагічную кар'еру. Працуючы ў Пецярбургскім, Кіеўскім і Віленскім універсітэтах, Нежынскім гісторыка-філалагічным інстытуце, даследаваў гісторыю Рэчы Паспалітай XVI ст., польска-расійскія адносіны. Дз.Н. Кайгародаў (1863) стаў выдатным біёлагам, арнітолагам, папулярызатарам навуковых ведаў і педагогам, прафесарам Пецярбургскага ляснога інстытута. Яго называлі бацькам рускай феналогіі – навукі пра сезонныя з'явы ў жывой прыродзе. Упершыню ў дарэвалюцыйнай Расіі Дз.Н. Кайгародаў здолеў стварыць феналагічную сетку яе еўрапейскай часткі, што стала асновай для яе біякліматычнага раянавання. Некаторыя здолелі праявіць сябе адразу і ў ваеннай прафесіі, і ў цывільнай дзейнасці. П.В. Баброўскі (1849) апрача выдатнай кар'еры ваеннага (у 1875 – 1897 гг. быў начальнікам Ваенна-юрыдычнай акадэміі, даслужыўся да звання генерала ад інфантэрыі) і дзяржаўнага саноўніка (у 1897 г. прызначаны сенатарам), зрабіў сабе імя на этнаграфічнай і гістарычнай ніве. Пад яго кіраўніцтвам група афіцэраў Генеральнага штаба падрыхтавала «Матэрыялы для геаграфіі і статыстыкі Расіі, сабраныя афіцэрамі генеральнага штаба. Гродзенская губерня» – выдатную крыніцу па гаспадарцы, асвеце, этнаграфіі, гісторыі і геаграфіі губерні. На высокім прафесійным узроўні П.В. Баброўскі даследаваў гісторыю летапісаў і ўніяцкай царквы.

* * *

З уступленнем на прастол Аляксандра II (1855 – 1881), калі з'явіліся спадзяванні на рэформы і кардынальнае абнаўленне Расійскай імперыі, і грамадскасць беларуска-літоўскіх губерняў, і ўрадавыя колы абмяркоўвалі магчымасць стварэння ў краі новай вышэйшай навучальнай установы. Пасля закрыцця Віленскага універсітэта (1832) склалася парадаксальная сітуацыя: нягледзячы на даўнія традыцыі ў сферы народнай адукацыі і вялікую неабходнасць у высокакваліфікаваных кадрах, Віленская навучальная акруга заставалася адзінай у імперыі, дзе не было сваёй ВНУ.

Спачатку пераважала ініцыятыва знізу. У 1856 г. віцебскае дваранства звярнулася да губернатара з просьбай «аб адкрыцці універсітэта ў Полацку або іншым зручным месцы Віцебскай губерні». Праз два гады ўжо ад імя ўсяго дваранства губерні было падрыхтавана хадайніцтва да ўраду, дзе, у прыватнасці, выказвалася просьба аб арганізацыі ў Полацку «польскага універсітэта». Рэакцыя Аляксандра II была катэгарычна адмоўнай. Рэалізацыю прапановы, якая была скіравана «да захавання ўяўнай польскай народнасці», палічылі цалкам шкоднай для справы вяртання Паўночна-Заходняму краю спрадвечнага рускага аблічча.

Потым важнасць адкрыцця зразумелі і буйныя дзяржаўныя саноўнікі. Віленскі генерал-губернатар В.І. Назімаў і яго наступнік М.М. Мураўёў выступалі за адкрыццё ў краі ВНУ, які б стаў «цэнтрам расійскай культуры». Полацк разглядаўся многімі як патэнцыяльны універсітэцкі горад. Напрыклад, І.С. Аксакаў, адзін з лідэраў славянафільства, падкрэсліваў: «Засноўвайце універсітэты ў Полацку, Віцебску, Мінску, але ніяк не ў Вільні, дзе рускім прафесарам прыйшлося б змагацца са старымі універсітэцкімі паданнямі, не маючы падтрымкі ў мясцовым туземным асяроддзі, прасякнутым паланізмам». Міністр народнай асветы граф Дз.А. Талстой, які падчас інспекцыйнай паездкі па Паўночна-Заходнім краі прысутнічаў у Полацку на адкрыцці настаўніцкай семінарыі (1872 г.), быў упэўнены, што менавіта гэты «амаль рускі горад» мае ўсе шанцы стаць новым універсітэцкім цэнтрам імперыі. Да яго бясспрэчных пераваг міністр адносіў тое, што Полацк мае «будынак, спецыяльна ўзведзены для вышэйшай навучальнай установы, раней там знаходзілася езуіцкая акадэмія, а зараз ваенная гімназія».

Аляксандр II падтрымаў графа Дз.А. Талстога. Меркавалася, што першапачаткова ў Полацку з'явяцца толькі два гуманітарныя факультэты, і здавалася, справа толькі за распрацоўкай статута. Аднак віленскі генерал-губернатар А.Л. Патапаў палічыў, што «цэнтр вальнадумства» павінен знаходзіцца ў «лёгкадаступным месцы» – губернскім горадзе, Віцебску ці Вільні, дзе будзе прасцей выкрыць і пры неабходнасці ліквідаваць крамолу. Абвастрэнне «ўсходняга пытання» і руска-турэцкая вайна 1877 – 1878 гг. адклала рэалізацыю гэтых планаў на няпэўны тэрмін, а забойства ўраджэнцам Беларусі Ігнатам Грынявіцкім імператара Аляксандра II (1881) канчаткова іх пахавала. Гэткім чынам, польска-расійскае змаганне, адной з арэн якога стаў Полацк, загасіла старадаўні светач адукацыі Падзвінскага краю.

Культурныя змены, што прынесла з сабой Кастрычніцкая рэвалюцыя, а таксама урбаністычнае індустрыяльнае грамадства, здавалася, канчаткова паставяць крыж на правінцыйным ва ўсіх адносінах Полацку. Вялікія гарады, буйнейшыя адміністрацыйныя і прамысловыя цэнтры – Мінск, Віцебск, Магілёў – выцеснілі яго на далёкую адукацыйную, навуковую і культурную перыферыю. Вялікую надзею на аднаўленне Полацку і Полаччыны як інтэлектуальнага цэнтра абудзіла будаўніцтва ў рэгіёне буйнейшага нафтахімічнага комплексу і заснаванне ў Наваполацку політэхнічнага інстытута. З пачаткам у Беларусі духоўнага і нацыянальнага адраджэння Полацк канчаткова вярнуў сабе страчанае – універсітэт і старадаўнія езуіцкія муры.

# Гісторыя станаўлення і развіцця Полацкага дзяржаўнага універсітэта (1968 – 2008 гг.)

## *Гісторыя філіяла Беларускага політэхнічнага інстытута – Беларускага тэхналагічнага інстытута ў г. Наваполацку*

Наваполацкі філіял Беларускага ордэна Чырвонага сцяга політэхнічнага інстытута быў створаны ў адпаведнасці з загадам № 326 Міністэрства вышэйшай і сярэдняй адукацыі БССР ад 14 ліпеня 1968 г. Дзейнасць філіяла была скіравана на забеспячэнне кваліфікаванымі кадрамі нафтахімічнай і будаўнічай прамысловасці горада Наваполацка, заснаванага ў 1958 г. як значны цэнтр нафтахімічнай прамысловасці СССР.



*Студэнты вячэрняга аддзялення ў хімічнай лабараторыі, пач. 70-х гадоў XX ст.*

Першапачаткова ў філіяле былі адкрыты 2 аддзяленні: дзённае і вячэрняе. Набор студэнтаў на дзённае аддзяленне ажыццяўляўся па спецыяльнасцях «Тэхналогія машынабудавання» і «Прамысловае і грамадзянскае будаўніцтва», на вячэрняе – па спецыяльнасцях «Машыны і апараты хімічнай вытворчасці», «Прамысловае і грамадзянскае будаўніцтва», «Хімічная тэхналогія перапрацоўкі нафты і газа». Дырэктарам Наваполацкага філіяла БПІ быў прызначаны Барыс Ягоравіч Сакалоў (загад па БПІ № 1365 ад 23.07.1968). Заняткі ў філіяле пачаліся 2 верасня 1968 г.

10 лютага 1969 г. было вырашана перадаць Наваполацкі філіял БПІ Беларускаму тэхналагічнаму інстытуту імя С.М. Кірава (БТІ). Гэта было зроблена з мэтай паляпшэння падрыхтоўкі спецыялістаў для хімічнай прамысловасці і хімічнага машынабудавання. Дырэктарам Наваполацкага філіяла БТІ з 12 лютага 1970 г. быў прызначаны кандыдат тэхнічных навук Эрнст Міхайлавіч Бабенка (загад Міністэрства вышэйшай і сярэдняй адукацыі БССР № 32-к ад 12.02.1970).



*Б.Я. Сакалоў*

На 1968/1969 навучальны год быў устаноўлены наступны план прыёму студэнтаў: на дзённае аддзяленне – 100 чалавек, на агульнатэхнічнае вячэрняе аддзяленне – 125 чалавек. У філіяле працавалі ўсяго 10 выкладчыкаў (Э.М. Бабенка, С.Я. Аляксеева, Н.А. Пацехін, І.Б. Дар'янава, Г.М. Макаранка, Б.Я. Сакалоў, Б.П. Сахараў, Н.В. Спірыдонаў, А.А. Чунароў, В.А. Шык). Па сумяшчальніцтву працавалі яшчэ некалькі выкладчыкаў, сярод іх былі І.І. Галуза, В.І. Далгова, Ф.А. Ільін.

Акрамя выкладчыкаў першымі супрацоўнікамі філіяла БПІ з'яўляліся: Г.М. Макаранка (загадчык лабараторыі), І.В. Васяніна (метадыст), Г.П. Сушчанка (сакратар вучэбнай часткі), Т.І. Ціхончанка (бухгалтар), А.Ф. Бірукова (сакратар-машыністка).



Э. М. Бабенка

У 1969 г. былі ўтвораны дзве кафедры: кафедра тэхнічных дысцыплін (загадчык – кандыдат тэхнічных навук Ю.П. Ашчэпкаў) і кафедра фізікі і хіміі (загадчык – кандыдат тэхнічных навук Э.М. Бабенка). Апошняя складалася з дзвюх секцый: фізікі і хіміі.

Напрыканцы 1973 г. у Наваполацкім філіяле былі арганізаваны 4 кафедры: марксізма-ленінізма, фізікі і хіміі, вышэйшай матэматыкі і тэхнічнай механікі, тэхнічных дысцыплін. Акрамя кафедраў працавалі секцыі замежных моў, начартальнай геаметрыі і чарчэння, фізвыхавання і спорту. У 1971 г. былі створаны першыя факультэты: механіка-тэхналагічны, будаўнічы і вячэрні. Колькасць студэнтаў у 1972/1973 н.г. склала 801 чалавек на дзённым аддзяленні і 483 – на вячэрнім. Колькасць выкладчыкаў узрасла да 93 чалавек, сярод іх 9 дацэнтаў, 1 прафесар кафедры, 35 старшых выкладчыкаў, 40 выкладчыкаў і асістэнтаў. У гэты навучальны год на кафедру будаўнічай вытворчасці быў запрошаны доктар тэхнічных навук, прафесар С.І. Лугоўскі, на кафедру хіміі – кандыдат тэхнічных навук, дацэнт А.Г. Назін, на кафедру хімічнай тэхнікі – кандыдат тэхнічных навук, дацэнт А.А. Грычэнка, на кафедру марксізма-ленінізма – кандыдат гістарычных навук В.Ф. Шведава (у 1971/1972 н.г. склад кафедры папоўнілі кандыдат гістарычных навук Н.Н. Літвінава і кандыдат эканамічных навук В.А. Іваноў), на кафедру тэхнічнай механікі – кандыдат тэхнічных навук К.Д. Елін. Сярод вядучых спецыялістаў, якія былі запрошаны ў Наваполацкі філіял, варта адзначыць кандыдата педагагічных навук М.М. Літвінава (кафедра вышэйшай матэматыкі) і кандыдата тэхнічных навук В.І. Маяка (кафедра фізікі і хіміі).

У 1973 г. адбыўся першы выпуск маладых спецыялістаў па спецыяльнасцях «Прамысловае і грамадзянскае будаўніцтва» (43 чалавекі) і «Машыны і апараты хімічнай вытворчасці» (43 чалавекі).

## *Гісторыя Наваполацкага політэхнічнага інстытута*

У адпаведнасці з Пастановай Савета Міністраў СССР № 413 ад 15.06.1973 Савет Міністраў БССР пастанавіў адкрыць з 1 студзеня 1974 г. у г. Наваполацку політэхнічны інстытут Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР на базе філіяла БТІ. Гэта стала важнай падзеяй у жыцці не толькі шаснаццацігадовага горада Наваполацка, але і ў гісторыі БССР. Самы малады горад рэспублікі з насельніцтвам 30 тыс. чалавек быў ператвораны ў адукацыйны цэнтр з самастойнай вышэйшай навучальнай установай.

Рэктарам Наваполацкага політэхнічнага інстытута быў прызначаны кандыдат тэхнічных навук, дацэнт Эрнст Міхайлавіч Бабенка (загад Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР № 30-к ад 24.04.1974), які дагэтуль займаў пасаду дырэктара Наваполацкага філіяла БТІ.

Адміністрацыйна-кіруючы апарат быў павялічаны да 47 чалавек, у яго склад уваходзілі: Рым Якаўлевіч Цыганоў, кандыдат тэхнічных навук, дацэнт, прарэктар па вучэбнай рабоце; Пётр Сідаравіч Адрыянаў, прарэктар па адміністрацыйна-гаспадарчай рабоце; Барыс Паўлавіч Чэмісаў, кандыдат тэхнічных навук, дэкан механіка-тэхналагічнага факультэта; Ульян Рыгоравіч Емяльянаў, кандыдат тэхнічных навук, дацэнт, дэкан будаўнічага факультэта (з 02.02.1973 па 31.08.1974), загадчык кафедры будаўнічай вытворчасці; Мікалай Мікалаевіч Літвінаў, кандыдат педагагічных навук, дацэнт, в.а. дэкана вячэрняга факультэта і в.а. загадчыка кафедры вышэйшай матэматыкі; Віктар Аляксандравіч Іваноў, кандыдат эканамічных навук, в.а. загадчыка кафедры марксізма-ленінізма; Сяргей Іванавіч Лугоўскі, доктар тэхнічных навук, прафесар, загадчык кафедры санітарнай тэхнікі і аховы працы; Анатоль Аляксеевіч Грычэнка, кандыдат тэхнічных навук, да-

цэнт, в.а. загадчыка кафедры хімічнай тэхнікі; Юрый Пятровіч Ашчэпкаў, кандыдат тэхнічных навук, старшы навуковы супрацоўнік, загадчык кафедры тэхналогіі металаў і тэхналогій машынабудавання; Мікалай Міхайлавіч Захараў, кандыдат тэхнічных навук, дацэнт, загадчык кафедры тэхнічнай механікі; Любім Іванавіч Пракаповіч, кандыдат фізіка-матэматычных навук, дацэнт, загадчык кафедры фізікі і электронікі; Аляксандр Рыгоравіч Назін, кандыдат хімічных навук, дацэнт, загадчык кафедры хіміі; Уладзімір Іванавіч Арцюшэнка, кандыдат тэхнічных навук, в.а. загадчыка кафедры начартальнай геаметрыі і графікі; Э.Ф. Валашэнка, загадчык секцыі замежных моў; П.Я. Кавалеўскі, загадчык секцыі фізвыхавання.

З 1975 г. прарэктарам па вучэбнай рабоце быў прызначаны кандыдат тэхнічных навук, дацэнт Леанід Мікалаевіч Фаміца. Адначасова на яго была ўскладзена праца па вырашэнні пытанняў, звязаных з капітальным будаўніцтвам. У 1992 г. прарэктарам па вучэбнай рабоце, а з канца 90-х гадоў першым прарэктарам быў прызначаны кандыдат тэхнічных навук, дацэнт Леанід Сцяпанавіч Турышчаў (працаваў на гэтых пасадах да 2003 г.).

У 1973/1974 н.г. інстытут функцыянаваў у складзе трох факультэтаў: механіка-тэхналагічнага (дэкан Б.П. Чэмісаў), будаўнічага (дэкан Л.М. Фаміца) і вячэрняга (дэкан М.М. Літвінаў). У гэты час ажыццяўлялася падрыхтоўка спецыялістаў:

на механіка-тэхналагічным факультэце па спецыяльнасцях:

– «Тэхналогія машынабудавання, металарэжучыя станкі і інструменты»,

– «Машыны і апараты хімічнай вытворчасці»,

– «Хімічная тэхналогія перапрацоўкі нафты і газа»;

на будаўнічым факультэце па спецыяльнасцях:

– «Прамысловае і грамадзянскае будаўніцтва»,

– «Цеплагазазабеспячэнне і вентыляцыя»;

на вячэрнім факультэце па спецыяльнасцях:

– «Тэхналогія машынабудавання, металарэжучыя станкі і інструменты»,

– «Машыны і апараты хімічнай вытворчасці»,

– «Хімічная тэхналогія перапрацоўкі нафты і газа»,

– «Прамысловае і грамадзянскае будаўніцтва»,

– «Цеплагазазабеспячэнне і вентыляцыя».

Колькасць кафедраў павялічылася да 10.

У 1974 г. дыпламаванымі спецыялістамі сталі 88 інжынераў-будаўнікоў, 77 інжынераў-механікаў і 28 інжынераў-тэхнолагаў.

З мэтай паляпшэння арганізацыі вучэбна-метадычнай і навукова-даследчай работы ў 1974 г. у НПІ былі адкрыты новыя кафедры: «Марксісцка-ленінскай філасофіі і навуковага камунізма», «Супраціўленне матэрыялаў і будаўнічай механікі», «Замежных моў», «Фізічнага выхавання». У адпаведнасці з загадам № 420 Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР ад 09.08.1974 кафедра «Марксізма-ленінізма» была перайменавана ў кафедру «Гісторыі КПСС і палітычнай эканоміі».



*Выкладчыкі кафедры гісторыі КПСС і палітэканоміі, 1975 г.*



*Выкладчыкі кафедры замежнай мовы, 1975 г.*

Істотна павялічыўся кантынгент студэнтаў НПІ. На канец 1974/1975 н.г іх колькасць склала 1788 чалавек, у тым ліку: дзённае навучанне – 1256 чалавек, вячэрняе – 532 чалавекі.

У 1975 г. у НПІ былі створаны структурныя ўпраўленні вучэбна-выхаваўчай работы, навукова-даследчай работы і адміністрацыйна-гаспадарчай работы (загад рэктара № 71 ад 08.09.1975). У гэтым жа годзе быў зацверджаны Статут НПІ (загад № 55 Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР ад 27.01.1975).

У далейшым арганізацыйная структура Наваполацкага політэхнічнага інстытута істотна змянялася: ствараліся новыя факультэты і кафедры, праводзілася рэарганізацыя існуючых.

У адпаведнасці з загадам № 350 ад 28.06.1976 у НПІ былі створаны санітарна-тэхнічны і машынабудаўнічы факультэты, а механіка-тэхналагічны факультэт перайменаваны ў тэхналагічны. Колькасць выкладчыкаў павялічылася да 191 чалавека (у 1972/1973 н.г. адпаведна – 93 чалавекі; у 1973/1974 н.г. – 120 чалавек; у 1974/1975 н.г. – 151 чалавек). Кантынгент студэнтаў у 1976 г. складаў 2497 чалавек, у тым ліку па дзённай форме навучання – 1883 чалавекі, па вячэрняй – 664 чалавекі.

Адпаведна, у 1975/1976 н.г. адбылося пашырэнне колькасці спецыяльнасцяў, па якіх вялася падрыхтоўка спецыялістаў у НПІ. Адбыўся набор на спецыяльнасць «Прыкладная геадэзія». Загадчыкам кафедры геадэзіі 24.09.1976 (загад № 1616-а) быў прызначаны кандыдат тэхнічных навук, дацэнт Сяргей



*Першы склад кафедры геадэзіі геадэзічнага факультэта, 1979 г.*

Міхайлавіч Чуракоў. З яе складу ў 1978 г. была вылучана кафедра прыкладной геадэзіі, якую ўзначаліў кандыдат тэхнічных навук, дацэнт Уладзімір Мікалаевіч Бандарэнка. З 1988 г. і па сённяшні дзень кафедру ўзначальвае Уладзімір Паўлавіч Падшывалаў.


*П.І. Швед*

Як вынік развіцця геадэзічнага накірунку ў НПІ ў 1979 г. быў адкрыты геадэзічны факультэт (загад Міністэрства вышэйшай адукацыі БССР № 308 ад 01.06.1979). Першым дэканам геадэзічнага факультэта быў прызначаны кандыдат тэхнічных навук, дацэнт Уладзімір Паўлавіч Падшывалаў.

У 1975/1976 н.г. стаў ажыццяўляцца набор на спецыяльнасць «Водазабеспячэнне і каналізацыя». У выніку 01.01.1977 са складу кафедры санітарнай тэхнікі і аховы працы (загадчык – доктар тэхнічных навук, прафесар С.І. Лугоўскі) была вылучана кафедра газазабеспячэння, водазабеспячэння і гідраўлікі (загадчык – доктар тэхнічных навук, прафесар А.М. Левін), а таксама секцыі аховы працы (загадчык – кандыдат тэхнічных навук, дацэнт Ю.А. Шашмурын), цеплатэхнікі і кацельных установак (загадчык – кандыдат тэхнічных навук, дацэнт В.А. Маёраў).

З 1976 г. па 1987 г. пасаду рэктара НПІ займаў кандыдат тэхнічных навук, дацэнт, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР П.І. Швед, які да гэтага быў прарэктарам па навуковай рабоце.

Згодна з пастановай Савета Міністраў БССР № 333 ад 24.09.1980 Наваполацкаму політэхнічнаму інстытуту было прысвоена імя Ленінскага камсамола Беларусі.

У 1982 г. у склад інстытута ўваходзіла 6 факультэтаў (санітарна-тэхнічны, будаўнічы, тэхналагічны, машынабудаўнічы, геадэзічны, вячэрні), 23 кафедры і навукова-даследчы сектар. У 1987 г. у НПІ быў створаны дэканат па рабоце з замежнымі студэнтамі (загад Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР № 286 ад 28.08.1987).

Пасаду рэктара НПІ з 1987 г. займаў доктар тэхнічных навук, прафесар Э.М. Бабенка (загад Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР № 127-к ад 30.03.1987).

Найбольш актыўна адбываліся структурныя рэарганізацыі і перайменаванні ў НПІ ў канцы 80-х – пач. 90-х гадоў XX ст. Гэта было абумоўлена агульнымі грамадска-палітычнымі і сацыяльна-эканамічнымі працэсамі, што адбываліся ў краіне. Так, у 1989 г. у НПІ арганізаваны радыётэхнічны факультэт (загад па інстытуту № 360 ад 05.06.1989). У 1990 г. на базе кафедры «Хімічнай тэхнікі, тэхналогіі нафты і газа» былі ўтвораны кафедра хімічнай тэхналогіі паліва і вугляродных матэрыялаў і кафедра хімічнай тэхнікі. Была рэарганізавана кафедра вылічальнай тэхнікі, аўтаматыкі і электратэхнікі. З 1 ліпеня 1990 г. на яе базе арганізаваны кафедры аўтаматызацыі вытворчых працэсаў і праграмавання; канструявання і тэхналогіі радыёэлектронных сродкаў; радыёэлектронікі (загад рэктара інстытута № 377 ад 05.06.1990).

З 1988 па 2008 г. кіраўніцтва кафедрай хімічнай тэхнікі, тэхналогіі нафты і газа (з 1990 г. – кафедрай хімічнай тэхнікі) ажыццяўляў доктар тэхнічных навук, прафесар Генрых Мікалаевіч Абаеў. Па яго ініцыятыве ў 1989 г. у НПІ была адкрыта аспірантура па спецыяльнасці «Працэсы і апараты хімічнай тэхналогіі», у 1997 г. – магістратура, а ў 1994 г. – Савет па абароне дысертацый (першая абарона кандыдацкай дысертацыі А.В. Грыбавай адбылася 12.04.1994).

У 1989 г. адбылося адкрыццё аспірантуры па спецыяльнасці «Будаўнічыя канструкцыі, будынкі і збудаванні» (кандыдат тэхнічных навук, дацэнт В.Д. Грынёў), «Цеплазабеспячэнне, вентыляцыя, кандыцыянаванне паветра, газазабеспячэнне і асвятленне» (С.І. Лугоўскі) (загад Дзяржаўнага камітэта СССР па народнай адукацыі № 616 ад 27.07.1989). Загадчыцай аспірантуры з моманту яе заснавання была

С.А. Самойлава. Агульнае кіраўніцтва аспірантурай было ўскладзена на прарэктара па навуковай працы В.К. Ліпскага.

У 1992 г. у НПІ былі арганізаваны 2 новыя факультэты: фінансава-эканамічны (загад рэктара № 618 ад 21.12.1992) і на базе машынабудаўнічага – спецыяльны факультэт па перападрыхтоўцы спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй (загад рэктара № 252 ад 14.05.1992). У гэтым жа годзе пры НПІ створаны Інстытут павышэння кваліфікацыі (загад Міністэрства народнай адукацыі Рэспублікі Беларусь № 265 ад 24.12.1991).

У 1992 г. кіраўніцтва НПІ па ініцыятыве рэктара Э.М. Бабенкі неаднаразова звярталася з прапановамі ў дзяржаўныя ўстановы розных узроўняў аб стварэнні на базе НПІ Полацкага дзяржаўнага універсітэта імя Ф. Скарыны. Гэтую ініцыятыву рэктарата НПІ падтрымалі Полацкі і Наваполацкі гарадскія саветы народных дэпутатаў. Неабходнасць рэарганізацыі інстытута ва універсітэт была абумоўлена, па-першае, неабходнасцю стварэння навукова-тэхнічнага і культурнага цэнтра на старажытнай Полацкай зямлі, па-другое, дынамічным развіццём Наваполацкага політэхнічнага інстытута. Галоўная мэта стварэння Полацкага універсітэта была сфармулявана Э.М. Бабенкам як «неабходнасць адраджэння беларускай нацыянальнай культуры і гістарычных традыцый Полацкай зямлі».

## *Гісторыя развіцця Полацкага дзяржаўнага універсітэта*

Пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь № 618 ад 14 верасня 1993 г. Наваполацкі політэхнічны інстытут быў перайменаваны ў Полацкі дзяржаўны універсітэт. Прыналежнасць да Полацкай зямлі, якая дэкларавана ў назве навучальнай установы, мае глыбокія гістарычныя карані. Полацк з'яўляецца буйнейшым адукацыйным і культурным цэнтрам на тэрыторыі Беларусі. У Полацку захаваліся будынкі былога езуіцкага калегіума (акадэміі), што адлюстравана на геральдычным знаку і сцягу універсітэта як спадкаемцы высокіх адукацыйных традыцый Полацкай зямлі з 1581 г.

Загадам Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь № 618 ад 8 кастрычніка 1993 г. рэктарам Полацкага дзяржаўнага універсітэта быў зацверджаны доктар тэхнічных навук, прафесар Эрнст Міхайлавіч Бабенка. Гэты ж дакумент загадваў рэктарату універсітэта да 1 лістапада 1993 г. распрацаваць і прадставіць у Міністэрства адукацыі Статут ПДУ, а да 1 снежня 1993 г. распрацаваць перспектыўны план развіцця навучальнай установы на 1994 – 2000 гг.

Статутам, які быў зацверджаны Саветам Полацкага дзяржаўнага універсітэта 25 лютага 1994 г., дэкларавалася, што ПДУ – юрыдычная асоба, мае пячатку з выявай Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь, сваю назву, штамп, самастойны грашовы баланс і ажыццяўляе сваю дзейнасць у адпаведнасці з Законам «Аб адукацыі Рэспублікі Беларусь». ПДУ, з'яўляючыся структурным звяном бесперапыннай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь, дадзеным дакументам вызначаў мэты і задачы сваёй дзейнасці. Паводле Статута універсітэт скіраваны на падрыхтоўку спецыялістаў, якія спалучаюць высокую агульную культуру, прафесійную кампетэнтнасць і грамадзянскую сталасць; задавальненне патрэб народнай гаспадаркі, навучання, навукі і культуры ў спецыялістах з вышэйшай універсітэцкай адукацыяй.

У сувязі з рэарганізацыяй інстытута ва універсітэт адбыліся значныя змены ў структуры навучальнай установы. На шляху ператварэння НПІ ў еўрапейскі універсітэт класічнага тыпу быў створаны факультэт замежных моў, які ўзначаліла Інэса Васільеўна Селіванава. Таксама быў утвораны гісторыка-правазнаўчы факультэт з арганізацыяй працэсу навучання па спецыяльнасцях «Гісторыя», «Правазнаўства» (загад рэктара № 16 ад 14 студзеня 1994 г.). Падрыхтоўка да арганізацыі навучальнага працэсу па гэтых спецыяльнасцях была даручана кафедры сацыяльна-гуманітарных навук (заг. каф. С.Г. Емельянаў) і кафедры эканомікі і арганізацыі вытворчасці (заг. каф. Н.І. Богдан). Вялікі ўнёсак у справу адкрыцця гэтых новых спецыяльнасцяў зрабілі кандыдат гістарычных навук, дацэнт Васіль Іванавіч Шайкоў і кандыдат юрыдычных навук, дацэнт Людміла Пятроўна Красоўская. Аднак у хуткім часе ў п. 1 загада ўнесены змены. Факультэт замеж-

ных моў ператвораны ў гісторыка-філалагічны факультэт, фінансава-эканамічны – у факультэт эканомікі і права (загад № 405 ад 21 красавіка 1994 г.). У верасні 1995 г. Н.І. Богдан прызначаецца дэканам факультэта.

Рашэннем Савета універсітэта № 5 ад 17 чэрвеня 1994 г. кафедра вышэйшай матэматыкі падзелена на дзве: прыкладной матэматыкі, матэматычнага аналізу і дыферэнцыяльных ураўненняў (загад рэктара № 715 ад 30 чэрвеня 1994 г.).

Кафедра гідраўлікі перайменавана ў кафедру трубаправоднага транспарту і гідраўлікі ў адпаведнасці з рашэннем Савета універсітэта (пратакол № 5 ад 25 лютага 1994 г.).

Секцыя эканамічнай тэорыі ператворана ў кафедру эканамічнай тэорыі (загад рэктара № 1378 ад 25 лютага 1994 г.).

У 1994 г. у склад Полацкага дзяржаўнага універсітэта ўваходзілі наступныя факультэты:

- машынабудаўнічы;
- радыётэхнічны;
- будаўнічы;
- санітарна-тэхнічны;
- гісторыка-філалагічны;
- тэхналагічны;
- геадэзічны;
- факультэт эканомікі і права;
- завочны факультэт;
- факультэт падрыхтоўкі да вышэйшай школы;
- факультэт павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў.

З гэтага ж года пачаўся набор на наступныя спецыяльнасці:

- «Гісторыя»;
- «Правазнаўства»;
- «Англійская мова»;
- «Нямецкая мова»;
- «Французская мова»;
- «Эканоміка і ўпраўленне вытворчасцямі»;
- «Бухгалтарскі ўлік, аналіз і аўдыт»;
- «Тэхналогія і абсталяванне высокаэфектыўных працэсаў апрацоўкі матэрыялаў»;
- «Машыны і апараты хімічных вытворчасцяў і прадпрыемстваў будаўнічых матэрыялаў»;
- «Праектаванне і вытворчасць радыёэлектронных сродкаў»;
- «Радыётэхніка»;
- «Хімічная тэхналогія вытворчасці і перапрацоўкі арганічных матэрыялаў»;
- «Прамысловае і грамадзянскае будаўніцтва»;
- «Цеплагазазабеспячэнне, вентыляцыя і ахова паветранага басейна»;
- «Водазабеспячэнне, водаадвядзенне, ачыстка прыродных і сцёкавых вод»;
- «Геадэзія».

З'яўленне новых спецыяльнасцяў адпавядала новаму універсітэцкаму статусу вучэбнай установы.

Для забеспячэння працаздольнасці і далейшага развіцця інфармацыйна-вылічальнай сеткі універсітэта быў створаны аддзел тэхнічнай эксплуатацыі камп'ютэрных сетак (АТЭКС) (загад рэктара № 662 ад 19 снежня 1994 г.).

Для больш эфектыўнай каардынацыі навукова-метадычнай работы ва універсітэце быў створаны навукова-метадычны савет (загад рэктара № 681 ад 28 снежня 1994 г.). У склад савета ўваходзілі наступныя секцыі: машынабудавання; эканомікі; будаўніцтва; радыётэхнікі; геадэзіі; хімічнай тэхнікі і тэхналогіі.

Ва універсітэце была распачата падрыхтоўка спецыялістаў па спецыяльнасці «Праектаванне, будаўніцтва і эксплуатацыя газанафтапрадуктаў і газанафтасховішч». Кафедра гідраўлікі прызначана выпускаючай па дадзенай спецыяльнасці і ўведзена ў склад тэхналагічнага факультэта (загад рэктара № 12 ад 16 студзеня 1995 г.).

Адбылася рэарганізацыя кафедраў гісторыка-філалагічнага факультэта. На базе кафедры тэхнічнага перакладу створаны дзве кафедры: англійскай мовы (загадчык Н.П. Сімурава), нямецкай і французскай моў (в.а. заг. каф. Н.В. Зайцава). Кафедра тэхнічнага перакладу скасавана загадам рэктара № 1243 ад 5 верасня 1995 г.

Кафедра нямецкай і французскай моў размежавана на кафедру нямецкай мовы (Н.В. Зайцава) і кафедру французскай мовы (А.М. Дарашкевіч) (загад рэктара № 1335 ад 17 верасня 1995 г.).

У адпаведнасці з рашэннем Савета універсітэта № 8 ад 1 ліпеня 1996 г. кафедра эканомікі і фінансаў перайменавана ў кафедру менеджмента і фінансаў.

Згодна пісьму Міністэрства адукацыі і навукі Рэспублікі Беларусь № 169/04-6 ад 7 чэрвеня 1996 г. на спецыяльнасці «Гісторыя» ўведзены наступныя спецыялізацыі:

– «Гісторыя Беларусі»;

– «Гістарычная інфарматыка».

Загадам рэктара № 68 ад 02.05.1997 на падставе рашэння савета радыётэхнічнага факультэта па прадстаўленні загадчыкаў кафедраў М.М. Юрцэвіча (КіТРЭС) і В.А. Кажарскага (тэхнічнай кібернетыкі) уведзены новыя спецыялізацыі на спецыяльнасцях факультэта:

– спецыяльнасць «Праектаванне і вытворчасць радыёэлектронных сродкаў» – спецыялізацыя «Праектаванне, вытворчасць і тэхнічнае абслугоўванне радыёэлектронных сродкаў»;

– спецыяльнасць «Вылічальныя сістэмы і сеткі» – спецыялізацыя «Праектаванне і выкарыстанне лакальных вылічальных сетак».

У адпаведнасці з законам «Аб адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь» і на падставе «Палажэння аб шматузроўневай сістэме вышэйшай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь», зацверджанага загадам Міністра адукацыі № 225 ад 4 жніўня 1994 г. для забеспячэння падрыхтоўкі спецыялістаў вышэйшага ўзроўню, адпавядаючага патрабаванням класічнага універсітэта, у ПДУ з 30 чэрвеня 1997 г. быў уведзены другі ўзровень адукацыі – магістратура (6-ы і 7-ы курсы) (загад рэктара № 102 ад 27 чэрвеня 1997 г.). Дзейнасць магістратуры пачыналася з набору на наступныя спецыяльнасці:

– «Матэрыялазнаўства ў машынабудаванні»;

– «Тэхналогія машынабудавання»;

– «Працэсы механічнай і фізіка-тэхнічнай апрацоўкі, станкі і інструменты»;

– «Тэхналогія перапрацоўкі нафты і газа»;

– «Працэсы і апараты хімічнай тэхналогіі»;

– «Будаўнічыя канструкцыі збудаванняў»;

– «Геадэзія».

У 1997 г. адбыліся чарговыя змены ў структуры універсітэта. Са студзеня 1997 г. пачынае дзейнічаць вучэбна-метадычны аддзел (загад № 66 ад 15.01.1997). Начальнікам аддзела прызначаецца кандыдат тэхнічных навук, прафесар кафедры металарэжучых станкоў і інструментаў А.І. Галембіеўскі. Санітарна-тэхнічны факультэт перайменаваны ў інжынерна-экалагічны (загад рэктара № 297 ад 11 сакавіка 1997 г.). Факультэт эканомікі і права падзелены на два факультэты: фінансава-эканамічны і юрыдычны (загад № 1023 ад 27 жніўня 1997 г.). А.У. Ягораў прызначаецца выконваючым абавязкі дэкана юрыдычнага факультэта. Загадам № 1042 ад 3.09.1997 кандыдат эканамічных навук Н.Л. Беларусава прызначаецца дэканам фінансава-эканамічнага факультэта. Кафедра правазнаўства юрыдычнага факультэта пératворана ў дзве кафедры: грамадзянскага права (загадчык кафедры У.А. Баганенка), крымінальнага права і крыміналістыкі (З.А. Жамойта) (загад рэктара № 1610 ад 25 кастрычніка 1997 г.).

У перыяд з 1998 па 1999 гг. была адкрыта кафедра педагогікі (загадчык – кандыдат педагагічных навук А.В. Конышава) (загад рэктара № 67 ад 15.01.1998), інжынерна-экалагічны факультэт перайменаваны ў інжынерна-будаўнічы (загад рэктара № 252 ад 24.02.1999). Сталі функцыянаваць новыя кафедры: сусветнай літаратуры і культуралогіі (загадчык – доктар філалагічных навук, прафесар А.А. Гугнін) (за-

гад № 578 ад 03.05.1999), філасофіі (загадчык – кандыдат філасофскіх навук, дацэнт Р.Д. Грудніцкі) (загад № 985 ад 06.07.1999), архітэктуры і графікі (загадчык – кандыдат архітэктуры, дацэнт Г.І. Захаркіна) (загад № 879 ад 21.06.1999), супраціўлення матэрыялаў, будаўнічай механікі і металічных канструкцый (загадчык – кандыдат тэхнічных навук, дацэнт Л.С. Турышчаў) (загад № 879 ад 06.07.1999). У гэты ж час быў створаны дагаварны аддзел (загад № 1010 ад 08.07.1999).

Адпаведна рашэнню міністра адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 7 лютага 2002 г. № 21-04/68 на юрыдычным факультэце створана грамадская прыёмная па аказанні прававой дапамогі насельніцтву (загад рэктара № 50 ад 13 сакавіка 2002 г.)

У сувязі з пашырэннем сферы сацыяльна-гуманітарнай адукацыі і неабходнасцю стварэння ўмоў для больш эфектыўнай самастойнай працы студэнтаў, магістрантаў, аспірантаў і суіскальнікаў на базе вучэбнай лабараторыі кафедры філасофіі быў створаны вучэбна-метадычны кабінет сацыяльна-гуманітарных навук (загад рэктара № 206 ад 12 лістапада 1999 г.).

Навуковай рэдакцыі універсітэта (загадчык рэдакцыі доктар тэхнічных навук, прафесар М.Л. Хейфец) у адпаведнасці з загадам рэктара № 92 ад 07.05.1999 і пастановай вучонага Савета ПДУ «Аб удасканаленні выдавецкай дзейнасці» было даручана арганізаваць выданне перыядычнага серыйнага навуковага часопіса «Веснік Полацкага дзяржаўнага універсітэта»:

Серыя А – Гуманітарныя навукі ;
Серыя Б – Фундаментальныя навукі;
Серыя В – Прыкладныя навукі.

Сёння «Веснік Полацкага дзяржаўнага універсітэта» з'яўляецца буйнейшым навуковым універсітэцкім выданнем нашай краіны, ён налічвае 6 серый, якія выходзяць з перыядычнасцю 2 разы ў год:

A – Гуманітарныя навукі;
B – Прыкладныя навукі. Прамысловасць;
C – Фундаментальныя навукі;
D – Эканамічныя і юрыдычныя навукі;
E – Педагагічныя навукі;
F – Прыкладныя навукі. Будаўніцтва.

Адкрыццё факультэта «Працоўнае навучанне і фізічнае выхаванне» (загад рэктара № 43 ад 06.03.2001) было абумоўлена запатрабаванасцю сістэмы адукацыі ў кадрах адпаведнай кваліфікацыі і наяўнасцю ва універсітэце выкладчыцкіх кадраў як тэхнічнага, так і гуманітарна-педагагічнага профілю. Дэканам факультэта быў прызначаны В.М. Лухверчык. На факультэце пачалі працаваць кафедры тэорыі і методыкі фізічнага выхавання (загадчык кафедры В.М. Наскалаў), фізічнага выхавання і спорту (загадчык кафедры М.І. Анціпін), працоўнага навучання (загадчык кафедры С.Э. Завістоўскі). Раней спецыяльнасць «Працоўнае навучанне» ўваходзіла ў склад машынабудаўнічага факультэта. Падрыхтоўка на факультэце вялася па наступных спецыяльнасцях:

– «Працоўнае навучанне», спецыялізацыя «Тэхнічная праца і фізічная культура»;
– «Тэхналогія. Інфарматыка»;
– «Фізічная культура».

У лістападзе 2001 г. у адпаведнасці з Перспектыўным планам развіцця універсітэта на фінансава-эканамічным факультэце створана выпускаючая кафедра фінансаў. Навучанне на факультэце вядзецца па 4 спецыяльнасцях:

– «Эканоміка і кіраванне» (дзённая і завочная формы навучання);
– «Фінансы і крэдыт», спецыялізацыі «Страхаванне» і «Фінансы» (дзённая, завочная і паскораная формы навучання);
– «Бухгалтарскі ўлік і кантроль, спецыялізацыі «Улік, аналіз, аўдыт і іх прававое забеспячэнне», «Улік, аналіз і аўдыт у прамысловасці» (дзённая, завочная і паскораная форма навучання).
– «Менеджмент», спецыялізацыя «Кіраванне праектамі» (адкрыта ў 1996 г.).

Па выкананні Даручэння Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь (пратакол № 38 ад 1 верасня 2001 г.) у ПДУ 1 верасня 2002 г. быў створаны Інтэрнэт-цэнтр (загад рэк-



*Дз. М. Лазоўскі*

тара № 195 ад 26 ліпеня 2002 г.). Вялікую работу ў гэтым накірунку праводзіў прарэктар па інфарматызацыі, кандыдат тэхнічных навук, дацэнт А.Ф. Оськін.

З дазволу Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь (ліст № 27-04-1/158 ад 21 сакавіка 2003 г.) у Полацкім дзяржаўным універсітэце пачалася падрыхтоўка спецыялістаў па спецыяльнасцях «Архітэктура», «Зямельны кадастр» (загад рэктара № 88 ад 16 красавіка 2003 г.). Вялікая роля ў наладжванні навучальнага працэсу належала дэкану інжынерна-будаўнічага факультэта, доктару тэхнічных навук, прафесару Дз.М. Лазоўскаму і дэкану геадэзічнага факультэта, кандыдату тэхнічных навук, дацэнту І.П. Шавялёву, а таксама загадчыцы кафедры архітэктуры, кандыдату архітэктуры, дацэнту Г.М. Захаркінай і загадчыку кафедры «Зямельны кадастр» кандыдату тэхнічных навук, дацэнту І.Г. Картавенкаву.

Загадам Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь № 98-к ад 03.05.2003 на пасаду рэктара УА «ПДУ» быў прызначаны доктар тэхнічных навук, прафесар Дз.М. Лазоўскі, выпускнік НПІ, які дагэтуль займаў пасаду дэкана інжынерна-будаўнічага факультэта.

Полацкі дзяржаўны універсітэт сёння – гэта 1250 работнікаў установы, з іх 445 – ПВС і больш чым 8 тысяч студэнтаў, якія навучаюцца на 11 факультэтах, 4,3 тыс. з іх – гэта студэнты дзённай формы навучання. Сярод ПВС – 19 прафесароў, дактароў навук, 145 кандыдатаў. Ва універсітэце адкрыта 38 спецыяльнасцей. У 2007 г. адкрыты 2 новыя спецыяльнасці: «Турызм і гасціннасць» на спартыўна-педагагічным факультэце і «Рамана-германская філалогія (англійская, нямецкая, французская)» на гісторыка-філалагічным факультэце.

Сёння ў склад рэктарата ўваходзяць: першы прарэктар, кандыдат тэхнічных навук, дацэнт А.П. Каструк; прарэктар па навуковай рабоце, доктар тэхнічных навук, прафесар М.Л. Хейфец; прарэктар па вучэбнай рабоце, кандыдат тэхнічных навук, дацэнт В.В. Булах; прарэктар па адміністрацыйна-гаспадарчай рабоце У.М. Стрыжак.

Знакавай падзеяй стала перадача 21.02.2003 карпусоў былога езуіцкага калегіума (акадэміі) у падпарадкаванне Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь. Дагэтуль будынак належаў Міністэрству абароны РБ. У 2005 г. адбыўся пераезд гісторыка-філалагічнага факультэта ПДУ ў старажытныя рэканструяваныя сцены калегіума – помніка архітэктуры сярэдзіны XVIII ст. Гэтая падзея насіла сімвалічны характар – з пераездам факультэта традыцыі адукацыі трывала вярталіся ў Полацк – найстаражытнейшы горад Беларусі. Усё гэта стала вынікам шматгадовых намаганняў першага рэктара ПДУ Э.М. Бабенкі, у поўнай ступені працягнутых Дз.М. Лазоўскім.

У 2008 г. на паседжанні Геральдычнага савета пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь была праведзена абавязковая геральдычная экспертыза і зацверджаны эмблема, сцяг і нагрудны знак Полацкага дзяржаўнага універсітэта (пратакол № 1 ад 27.02.2008). Палажэнне аб эмблеме, сцягу і нагрудным знаку ПДУ было зацверджана загадам рэктара (№ 109 ад 19.03.2008).

Такім чынам, за непрацяглы час свайго існавання з 1968 па 2008 гг. вышэйшая навучальная ўстанова ў Наваполацку ператварылася ў значны рэгіянальны цэнтр і па сённяшні дзень працягвае традыцыі адукацыі, навукі і культуры старажытнай Полацкай зямлі.

# *ОПИСАНИЕ ЭМБЛЕМЫ*
## *учреждения образования «Полоцкий государственный университет»*

Эмблема учреждения образования «Полоцкий государственный университет» представляет собой стилизованное изображение раскрытой книги, расположенное внутри шестиугольника голубого цвета. На развороте книги расположено графическое изображение зданий Полоцкого иезуитского коллегиума (академии). Над изображением коллегиума размещена надпись «DOCENDO DISCIMUS». Над книгой – дата «1581». По периметру шестиугольника на голубой ленте – надпись на белорусском и английском языках «Полацкі дзяржаўны універсітэт» «Polotsk State University». Шестиугольник венчает серебряная стилизованная корона с золотым навершием.

Изображение зданий коллегиума (академии) символизирует истоки УО «ПГУ» от первого высшего учебного заведения на Полоцкой земле. Раскрытая книга и надпись на латинском языке «DOCENDO DISCIMUS» («обучая обучаюсь») символизирует древние традиции образования и книгоиздания на Полоцкой земле. Дата «1581» является годом закладки первого камня в здания иезуитского коллегиума. Лента голубого цвета олицетворяет бензольное кольцо, а голубой цвет – голубые нити газопровода. Это – символы отраслей промышленности в городе Новополоцке, благодаря которым были основаны в 1968 году первые факультеты будущего Полоцкого государственного университета. Надпись на белорусском языке означает неразрывную связь с родной историей, а на английском языке – широкие международные связи университета.

Корона представляет собой стилизованное изображение сцепления двух зубчатых шестеренок как знак одного из первых факультетов – машиностроительного.

Эмблема учреждения образования «Полоцкий государственный университет» являет собой изображение шестигранного бензольного кольца, увенчанного стилизованной короной на серебряном поле французского щита. Золотое навершие короны выходит за верхнее поле щита.

Серебряный фон, на котором изображено бензольное кольцо, раскрывает основную идею университетского содружества: от преодоления терний знаний – к новым открытиям и познанию неизведанного.




## *ОПИСАНИЕ ФЛАГА*
## *учреждения образования*
## *«Полоцкий государственный университет»*

Флаг учреждения образования «Полоцкий государственный университет» представляет собой горизонтальное полотнище с соотношением сторон 1:2, вертикально разделенное на три равновеликие части. Две части – голубого цвета, расположенные по краям, и центральная – белого цвета. В центре белой части размещена эмблема учреждения образования «Полоцкий государственный университет».




## *ОПИСАНИЕ НАГРУДНОГО ЗНАКА*
## *учреждения образования*
## *«Полоцкий государственный университет»*

Нагрудный знак учреждения образования «Полоцкий государственный университет» имеет круглую форму диаметром 35 мм. На аверсе медали в центре размещена надпись на латинском языке «DOCENDO DISCIMUS». По окружности вдоль края нагрудного знака располагается изображение двух лавровых ветвей, переплетенных внизу. Вверху между ветвями располагается изображение стилизованной короны в виде двух сцепленных шестеренок.

На реверсе нагрудного знака в центре изображен комплекс зданий иезуитского коллегиума (академии), в которых в настоящее время располагаются учебные корпуса УО «ПГУ». Вверху, над изображением корпусов, располагается дата «1581». По окружности вдоль края нагрудного знака – надпись на белорусском и английском языках «Полацкі дзяржаўны універсітэт» и «Polotsk State University».

Нагрудный знак изготавливается из металла золотого цвета.

Колодка нагрудного знака с лентой голубого цвета с узкими желтыми вертикальными полосами по бокам.

# СТАНАЎЛЕННЕ І РАЗВІЦЦЁ МАТЭРЫЯЛЬНАЙ БАЗЫ ПОЛАЦКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА (1968 – 2008 гг.)

Першае паведамленне ў прэсе аб планах узвядзення ў Наваполацку будынкаў вышэйшай навучальнай установы датуецца 1960 годам. Мясцовая «Знамя новостройки» інфармавала чытачоў, што ў горадзе «будзе пачата будаўніцтва корпуса – філіяла політэхнічнага інстытута». Аднак рэалізацыя гэтага праекта адкладвалася.

Сітуацыю змяніла Пастанова Савета Міністраў СССР ад 9 красавіка 1964 года, у адным з пунктаў якой даваўся дазвол «уключаць у генеральныя планы будаўніцтва буйных прадпрыемстваў прамысловасці, транспарту, сувязі і лясной гаспадаркі будаўніцтва комплексаў вучэбных, лабараторных і іншых будынкаў для завочных і вячэрніх філіялаў, агульнатэхнічных і іншых факультэтаў... вышэйшых і сярэдніх навучальных устаноў за кошт капітальных укладанняў, якія выдзяляюцца па адпаведных галінах народнай гаспадаркі...». Грунтуючыся на палажэннях гэтага дакумента і ўлічваючы перспектыву ўдзелу прамысловых прадпрыемстваў горада Наваполацка, Міністэрства вышэйшай, сярэдняй спецыяльнай і прафесійнай адукацыі БССР падрыхтавала заданне на праектаванне (датавана 11 чэрвеня 1964 г.) завода-втну (вышэйшай тэхнічнай навучальнай установы) і ўключыла яго ў план праектных работ 1964 года. Таксама быў вызначаны тэрмін пачатку будаўніцтва – 1965 год.

У адпаведнасці з гэтым Наваполацкі гарвыканкам прымае рашэнне № 91 ад 31 ліпеня 1964 г. «Аб адводзе зямельнага ўчастка для будаўніцтва втну». Прадугледжвалася выдзяленне ўчастка плошчай 3,0 га ў паўднёва-заходняй частцы 2-га мікрараёна. У эскізным праекце гэтага мікрараёна меркавалася размясціць чатыры групы жылых дамоў. Комплекс будынкаў втну вырашылі ўзводзіць замест адной з іх (найбліжэйшай да грамадскага цэнтра горада). Заказчыкам будоўлі выступіў Наваполацкі нафтаперапрацоўчы завод. Узвядзенне аб'екта павінна было весціся па тытульным спісе будаўніцтва завода і на сродкі Міннафтахімпрама СССР.

Напрыканцы красавіка 1967 г. адбыўся ўрачысты мітынг, прысвечаны закладцы памятнай пліты ў падмурак будынка філіяла Беларускага політэхнічнага




*Закладка памятнай пліты ў падмурак будынка філіяла Беларускага політэхнічнага інстытута*

інстытута. Будаўніцтва вялося будаўнічым ўпраўленнем № 93 (кіраўнік – В.С. Левін). Сціслыя тэрміны, адпушчаныя на ўзвядзенне аб'екта, не дазволілі цалкам падрыхтаваць будынак да пачатку навучальнага года. Ля сцен корпуса ўзвышаліся горы зямлі, смецця, не былі засыпаны траншэі. Аднак 2 верасня 1968 г. у адной з аўдыторый новабудоўлі адбылася ўрачыстая сустрэча выкладчыкаў са студэнтамі і пачаліся заняткі. Першыя лекцыі, былі яны па агульнай хіміі і гісторыі КПСС, прачыталі Э.М. Бабенка і А.А. Чунароў.

Заканчэнне работ вялося яшчэ дастаткова працяглы час. Дзяржаўны акт аб прыёмцы корпуса філіяла політэхнічнага інстытута быў падпісаны толькі напярэдадні Новага года і зацверджаны гарвыканкамам 31 снежня 1968 г. з запісам: «Не скончаны аддзелачныя работы, скончыць да 15 студзеня 1969 года».

Изобретательское творчество получило свое развитие с начала образования института. В 1970 г. получено первое авторское свидетельство на изобретение «Способ обработки электросварных труб», автором которого был к.т.н. Ю.П. Ощепков. Изобретательская и патентно-лицензионная работа была возложена на патентную службу. В 1975 – 1985 гг. ее представляли инженеры-патентоведы Т.В. Гончарова, С.А. Шестопалова и Г.В. Гладких, которые получили высшее патентное образование в Москве. Для организации каждодневной изобретательской и патентно-лицензионной работы в институте в 1976 г. было создано Бюро общественных патентоведов, а в 1986 г. создан патентный отдел под руководством Т.В. Гончаровой. Для развития творческой инициативы сотрудников ежегодно в НПИ проводились смотры на лучшую постановку изобретательской, рационализаторской и

патентно-лицензионной работы, по результатам которых определялись победители – лучший факультет, лучшая кафедра.

Значительный вклад в изобретательство вносили сотрудники машиностроительного факультета, кафедры металлорежущих станков и инструментов. За время работы в университете заведующий кафедрой металлорежущих станков и инструментов д.т.н., профессор В.А. Данилов получил свыше 140 авторских свидетельств и патентов, к.т.н., профессор этой же кафедры А.И. Голембиевский – более 95. В настоящее время высокую активность в изобретательском творчестве проявляют аспиранты, магистранты, студенты, при их участии ежегодно подается более 70 % заявок на изобретения, полезные модели от общего числа поданных университетом. Неоднократно молодые изобретатели становились лауреатами городских, областных и республиканского конкурсов молодых новаторов (В.Г. Дашкевич, А.Н. Лукашок, А.Л. Адамович, А.М. Иваненко, Н.Л. Грецкий, Ю.Ю. Масальский и др.).




*Патентоведы Т. В. Гончарова и С. А. Шестопалова анализируют результаты очередного смотра*

НПИ неоднократно занимал призовые места в ежегодных смотрах по изобретательству, проводимых Министерством образования БССР.

В середине 80-х годов в НПИ активизировалась работа по выявлению среди разработок института объектов, перспективных для патентования и коммерческой реализации за рубежом. Были получены патенты НРБ, ГДР, ЧССР на изобретения в области трубопроводного гидротранспорта (рук. к.т.н. доцент В.К. Липский), патенты США, Канады, Великобритании, ФРГ, Италии, Финляндии, Норвегии, Франции, Швеции на изобретение «Морская железобетонная платформа» (рук. к.т.н. доцент Ю.П. Мартышенко), патенты Франции, Швеции, ФРГ, Бельгии на ряд изобретений по упаковыванию тугоплавких битумов в полиэтиленовую пленку (рук. к.т.н. доцент В.К. Липский). В 1991 г. заключен первый лицензионный договор с НПЗ «Тжебиня» (Польша) на использование технологии и оборудования для упаковывания битумов на сумму 20 000 дол. США (рук. к.т.н. доцент В.К. Липский).

В настоящее время университет поддерживает в силе более 60 патентов в Беларуси и за рубежом. В 12 странах мира – Австрии, Бельгии, Великобритании, Германии, Италии, Китае, Канаде, Нидерландах, России, США, Франции, Японии – совместно с французской фирмой патентуется изобретение, реализованное в приборе для микродистилляции нефтепродуктов (рук. д.т.н., профессор Г.Н. Абаев). От продажи данных приборов в странах Европы, США, Азии, Африки и Южной Америки университет ежегодно получает валютные средства.



*Сотрудники патентного отдела (2006 г.)*
*Справа налево:*
*С. А. Шестопалова (вед. инж.),*
*Т. В. Гончарова (зав. отделом),*
*Т. Б. Троицкая (инж. I кат. по НТИ),*
*О. Л. Филиппова (инж. I кат. по рекламе)*

Выставочная деятельность является неотъемлемой частью в презентации созданной научно-технической продукции университета и продвижении ее на различные рынки. Впервые

в 1978 г. НПИ принял участие в работе ВДНХ СССР. Бронзовую медаль получил экспонат «Эффективный ингибитор коррозии при производстве метилакрилата» (рук. д.х.н. профессор Б.Т. Надыкто). В период с 1980 по 1985 гг. 7 экспонатов института демонстрировались на ВДНХ СССР и завоевали 1 серебряную и 5 бронзовых медалей. За участие в ВДНХ БССР 13 разработок института награждены дипломами.



*Участники экспозиции ПГУ на Белорусском промышленном форуме (2007 г.)*



*А. П. Кастрюк (к.т.н., первый проректор) представляет Полоцкий государственный университет на 17-й Вьетнамской международной торговой ярмарке «VIETNAM -EXPO-2007»*



*Награды выставок, полученные ПГУ*

В последние годы в Полоцком государственном университете выставочная деятельность активизировалась. Ежегодно университет принимает участие более чем в 20 выставках различного уровня, в т.ч. международных – в России, Германии, Вьетнаме, Китае, Казахстане, Польше, Азербайджане и др. По результатам выставок университет регулярно награждается медалями, дипломами, отмечается благодарностями.

Научно-исследовательская работа студентов, которая начиналась на кафедрах в рамках студенческих научных кружков (СНК) и научных обществ (СНО), является неотъемлемой частью научной деятельности университета. Среди ученых университета первыми научными руководителями были к.т.н. Ю.П. Ощепков, к.т.н. Н.В. Ощепкова, д.т.н. С.И. Луговский, д.т.н. А.М. Левин, к.т.н. В.Д. Гринев, к.т.н. Г.К. Дымчук, к.т.н. А.Г. Назин, к.филол.н. М.Д. Путрова, к.т.н. Л.А. Гурьева, д.т.н. А.И. Семенов.

Научно-исследовательская работа студентов началась весной 1970 г. в Новополоцком филиале БТИ имени С.М. Кирова после организации кафедры физико-математических и кафедры технических дисциплин. Были созданы научно-исследовательские кружки физики и химии, в которых научными исследованиями занимались 47 студентов (23 – по общественным и естественным, 24 – по техническим наукам). В 1971 г. создано Студенческое научное общество (СНО). Четыре лучшие научные работы студентов были представлены на республиканский конкурс, три из них получили первую категорию, одна работа – вторую.

В 1970 г. было создано научное студенческое конструкторское бюро (СКБ) под руководством В.А. Шик, в котором работало 39 студентов.

В 1977 г. количество студентов в СКБ уже составляло 104. Они выполняли хоздоговора с предприятиями на сумму 11,5 тыс. рублей.

Студенты университета активно участвуют в разнообразных конференциях, олимпиадах и конкурсах как внутри университета, так и на республиканском и международном уровне.

С 1971 г. в университете стало традицией проводить ежегодные научные студенческие конференции, в работе которых принимают участие большинство студентов университета дневной формы обучения.

Лучшие научные работы студентов публикуются в сборнике научных работ «Труды молодых специалистов Полоцкого государственного университета», в журнале «Вестник ПГУ» и других научных изданиях, а также участвуют в Республиканском конкурсе на лучшую научную студенческую работу года.

Наиболее активные руководители НИРС: декан инженерно-строительного факультета к.т.н. А.А. Бакатович, декан финансово-экономического факультета к.э.н. Н.Л. Белорусова, к.т.н. профессор кафедры железобетонных и каменных конструкций В.Д. Гринев, зав. кафедрой архитектуры канд. арх. Г.И. Захаркина, декан машиностроительного факультета к.т.н. А.А. Лысов, проректор по научной работе д.т.н. М.Л. Хейфец, зав. кафедрой технологии машиностроения д.т.н. Н.Н. Попок, зав. кафедрой мировой литературы и культурологии д.филол.н. А.А. Гугнин и другие. Многие годы обеспечивает организацию НИРС и достижение высоких показателей инженер НИСа Г.И. Липко.




*Открытие научно-теоретической студенческой конференции, посвященной 60-летию Великой Октябрьской социалистической революции (1977 г.)*



*За электронным микроскопом – студенты технологического факультета (1985 г.)*



*На конференции студенческого научного общества (1982 г.)*

Авторы научных работ – лауреаты и удостоенные 1 категории по итогам республиканских конкурсов распоряжением Президента Республики Беларусь награждаются свидетельствами специального Фонда по социальной поддержке одаренных учащихся и студентов и денежными премиями.

С каждым годом число лауреатов, победителей Республиканского конкурса на лучшую научную работу года увеличивается. В 2007 г. ими стали В.Е. Овсейчик,

Е.А. Молоток, Р.С. Хмельницкий, Л.Г. Каюкало, А.А. Карпухина, Е.В. Грищенков, М.Ф. Михальченко, О.В. Можейко.

Последние 8 лет по результатам научно-исследовательской работы студентов университет входит в число лидеров среди ведущих вузов республики.



*Студенты – лауреаты республиканского конкурса на лучшую студенческую работу (2005 г.). Справа налево: Н.Л. Грецкий, О.Г. Данишевская, А.М. Хаткевич, Д.Н. Лазовский (ректор), В.И. Атрахимович, Л.П. Матинина, Г.И. Липко (инженер НИСа), В.Л. Еловик*

В разные годы в подразделениях НИСа плодотворно работали экономисты В.К. Долганова, Т.А. Неотаки; зам. главного бухгалтера В.И. Федорец, Н.К. Рощина возглавляла отдел научно-технической информации, в его состав входили И.В. Евтова, Н.В. Коршун, С.Р. Мяделец; В.Б. Ющенко заведовал отделом стандартизации и метрологического обеспечения.

Сегодня НИС – это научное учреждение университета, которое органично объединяет в себе научные коллективы кафедр, исследовательские лаборатории, Проектный институт реконструкции и строительства, Контрольно-испытательную лабораторию кафедры технологии конструкционных материалов, Исследовательско-испытательный центр строительных конструкций и материалов кафедры железобетонных и каменных конструкций, Инженерно-исследовательский центр кафедры трубопроводного транспорта и гидравлики, научную редакцию журнала «Вестник ПГУ», региональное отделение Республиканского центра трансфера технологий; службу метрологии и стандартизации; планово-производственный, патентный отдел, бухгалтерию, отдел кадров, службы организации и обеспечения НИР.




*Сотрудники НИСа (2004 г.). Справа налево: Н.А. Разваляева (зав.планово-производственным отделом), Т.В. Гончарова (зав.патентным отделом), И.Е. Есипова (ст.инспектор ОК), С.А. Горунова (инж. I категории), А.В. Кулеш (нач. НИСа), О.Л. Филиппова (инж. I категории по рекламе), Ф.И. Пантелеенко (проректор по НИР), Т.Б. Троицкая (инж. I категории по НТИ), В.Ф. Кулеш (вед. инженер), С.А.Шестопалова (вед.инж. патентного отдела)*

# МІЖНАРОДНАЕ СУПРАЦОЎНІЦТВА ПОЛАЦКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА (1968 – 2008 гг.)

Адным з асноўных накірункаў выхаваўчай работы ў 70-я гады XX ст. было інтэрнацыянальнае выхаванне. Дзеля гэтага паўсюдна ў вну ствараліся клубы інтэрнацыянальнай дружбы, якія спрыялі ўмацаванню сяброўскіх адносін паміж рэспублікамі Савецкага Саюза і ўсталяванню такіх адносін з замежнымі, найперш, сацыялістычнымі краінамі.

Так, напрыканцы 70-х гадоў НПІ наведаў генеральны сакратар Сацыялістычнай адзінай партыі Германіі Эрык Хонэкер.



*На сустрэчу з генеральным сакратаром Сацыялістычнай адзінай партыі Эрыкам Хонэкерам*

У 1976 г. у мэтах удасканальвання работы па замежных сувязях і павышэння навуковай і палітычнай эфектыўнасці камандзіровак прафесарска-выкладчыцкага складу быў утвораны савет па навукова-тэхнічнаму супрацоўніцтву з замежнымі краінамі (загад № 98 ад 24 чэрвеня 1976 г.). У склад савета ўваходзілі В.А. Кажарскі (старшыня савета), С.І. Лугоўскі, Б.Ц. Надыкта, А.А. Грычэнка, С.М. Чуракоў і С.А. Самойлава. Галоўнымі мэтамі савета з'яўляліся абагульненне замежнага вопыту і выпрацоўка рэкамендацый па яго ўкараненню ў народную гаспадарку БССР.




*Сустрэча з дэлегацыяй ГДР*

У 70-я – 80-я гг. XX ст. у камітэце камсамола НПІ адбываліся неаднаразовыя сустрэчы са студэнцкай мо-



*Чэхаславацкія студэнты ў камітэце камсамола НПІ, 1982 г.*



*Чэхаславацкія студэнты ў вылічальным цэнтры НПІ, 1982 г.*

ладдзю Чэхаславакіі. Нагэтых сустрэчах абмяркоўваліся праблемы навукова-тэхнічнага развіцця, перспектывы супрацоўніцтва. Падставай для такіх сустрэч з'явіўся зварот рэктара НПІ П.І. Шведа да рэктара Чэшскага вышэйшага тэхнічнага вучылішча акадэміка Б. Квасілы і дэлегацыя рабочай групы НПІ ў ЧССР з 10 па 30 ліпеня 1978 г. У 1982 г. дэлегацыя чэшскіх студэнтаў наведала НПІ.

1 верасня 1985 года на вучобу ў Наваполацкі політэхнічны інстытут прыехала 25 замежных грамадзян. У лістападзе 1987 года былі складзены дамовы аб дружбе і супрацоўніцтве паміж зямляцтвамі замежных студэнтаў і камсамольскімі арганізацыямі прамысловых прадпрыемстваў і арганізацый горада.

У 1990 г. выкладчыкі НПІ праходзілі стажыроўку ў ЗША, Англіі, ФРГ, ГДР (усяго 5 чалавек). Пры гэтым выкладчыкі НПІ ўпершыню наведвалі развітыя капіталістычныя краіны.

30 – 31 сакавіка 1992 г. у НПІ адбыўся прыём Саветніка Пасла Рэспублікі Руанда спадара Кабаша Тэабальта. Мэта візіта – заключэнне дамовы аб супрацоўніцтве па падрыхтоў-цы інжынерных і навуковых кадраў для Рэспублікі Руанда.

З 5 па 8 красавіка 1992 г. адбыўся прыём дэлегацыі нафтавага порта г. Жывор (Францыя). Паводле ініцыятывы рэктарата НПІ і ў першую чаргу Э.М. Бабенкі ў 1992 г. адбылося заснаванне сумеснага беларускапольскага прадпрыемства «Нодвиг». Ва ўстаўны фонд прадпрыемства ўваходзілі 50 % з польскага боку, 30 % – ад інстытута, 20 % – ад беларускага партнёра інстытута фірмы «Рикон» і завода «Вымяральнік».

У красавіку 1993 г. на базе НПІ быў праведзены рэспубліканскі семінар для вну Беларусі з удзелам дэлегацыі рэктараў вышэйшых тэхнічных школ ФРГ. Вынікам было ўсталяванне кантактаў з вышэйшымі тэхнічнымі школамі Мюнхена і Мангейма.

У рамках праграмы НПІ па інтэграцыі ў сістэму еўрапейскай адукацыі рэктар інстытута прыняў удзел ва Устаноўчым сходзе Сусветнага Савета асацыяцый па тэхналогіі навучання, якая праходзіла ў Парыжы пад эгідай ЮНЕСКА. Ад імя інстытута быў падпісаны Статут гэтай арганізацыі, а НПІ ўвайшоў у яе як адзін з заснавальнікаў.

У выніку дамоўленасці аб супрацоўніцтве з Вышэйшай Тэхнічнай школай Мангейма інстытут атрымаў фінансавую дапамогу на фарміраванне бібліятэчнага фонду.

У гэтым годзе былі ўстаноўлены кантакты з англійскім прадстаўніцтвам «Консул» у Мінску. Праводзілася вялікая работа па падрыхтоўцы праекта па праграме TEMPUS.

У 1993 г. вялася праца па выяўленню зацікаўленасці замежных фірм у распрацоўках інстытута. Супрацоўнікі НПІ прынялі ўдзел у форуме «ФІНБЕЛАРУСЬ» з удзелам больш 40 фінскіх фірм. Міжнародная дзейнасць на працягу 1993 г. насіла падрыхтоўчы характар. У далейшым меркавалася замацаванне гэтай дзейнасці ў форме дагавароў аб супрацоўніцтве і стварэнні сумесных праграм у галіне навукі, адукацыі і культуры.

Новы якасны этап развіцця міжнародных адносін адбыўся пасля рэарганізацыі НПІ ў ПДУ. Міжнародныя сувязі пашырыліся на краіны блізкага і далёкага замежжа, пры гэтым прыярытэтнымі з'яўляліся накірункі навукова-даследчага супрацоўніцтва дзеля інавацыйнага развіцця эканомікі Рэспублікі Беларусь.

У 1994 г. ва універсітэце быў створаны аддзел міжнародных сувязяў, які пачаў каардынаваць міжнародную дзейнасць. Першым загадчыкам аддзела стаў А.І. Ельшын.

У 1994 г. здзейснена некалькі ўзаемных візітаў з былымі партнёрамі з мэтай пашырэння супрацоўніцтва. Асноўныя накірункі, якія былі рэалізаваны, – абмен прафесарамі і чытанне навуковых лекцый, абмен студэнтамі для практычных стажыровак і навучання па спецыяльнасцях і ўдасканалення ведаў нямецкай альбо рускай моў. Неабходна адзначыць актыўную дапамогу з боку Мангейма падручнікамі, дапаможнікамі, аргтэхнікай і грашовымі сродкамі з фондаў Федэральнага Міністэрства адукацыі.

Праводзілася работа па падрыхтоўцы выкладчыкаў, супрацоўнікаў і студэнтаў ПДУ да міжнародных абменаў, удасканальвалася валоданне замежнымі мовамі, вывучалася гісторыя культур тых краін, з якімі універсітэт супрацоўнічаў. Для гэтага выкарыстоўваліся самыя разнастайныя спосабы і сродкі: прыём дэлегацый, абмен студэнтамі, спутнікавае тэлебачанне, заняткі ў групах па языках. Па выніках удзелу ў конкурсах і алімпіядах студэнты накіроўваліся на вучобу за мяжу (Рочарстарскі універсітэт), на навуковую стажыроўку ў Грэцыю, станавіліся сорасаўскімі стыпендыятамі.

Міжнародная дзейнасць універсітэта ў 1995 г. была вельмі разнастайнай. За гэты год было здзейснена 30 камандзіровак за мяжу, у склад камандзіраваных уваходзілі студэнты, аспіранты, выкладчыкі і адміністрацыйныя работнікі. Было прынята 57 чалавек з-за мяжы.

У 1994 – 1995 гг. быў рэалізаваны праект «Стварэнне праграмы па эканоміцы і кіраванню энергетычнымі рэсурсамі ў ПДУ» (каардынатар – Французскі Інстытут Нафты, Парыж).

Праект «Арганізацыя і кіраванне аспірантурай у ПДУ» атрымаў фінансавую падтрымку па праграме TEMPUS.

У 1995 г. працягвалася супрацоўніцтва з ФРГ на падставе падпісаных у 1993 г. дагавароў з ВТШ Мангейма і Мюнхена. Студэнты санітарна-тэхнічнага, будаўнічага факультэтаў выязжалі на паўгадавую стажыроўку ў ФРГ, а студэнт ВТШ Мюнхена ў летнім семестры прайшоў вытворчую практыку на геадэзічным факультэце. ПДУ наведалі 24 студэнты-эколагі з Нарвегіі. Адбыліся круглыя сталы, госці пабывалі на прамысловых прадпрыемствах г. Наваполацка.

У красавіку ў ПДУ знаходзіліся 2 студэнты з Канады, якія вывучалі рускую мову, з мэтай азнаямлення з культурнымі і гістарычнымі помнікамі Полацка.

Больш цеснымі сталі сувязі са Швецыяй. Падпісаны



*Сустрэча прадстаўнікоў нацыянальнай зямельнай службы Швецыі з выкладчыкамі кафедры геадэзіі*

дагавор з Каралеўскім тэхналагічным інстытутам і Шведскай геадэзічнай службай. Усяго за гэты год практыку і стажыроўку за мяжой прайшлі 10 студэнтаў ПДУ.

Неабходным звяном міжнароднага супрацоўніцтва з'яўлялася станаўленне і развіццё кантактаў і сувязей з фондамі і прадстаўніцтвамі замежных адукацыйных арганізацый у Беларусі і СНД, такімі як Германская служба акадэмічных абменаў, Брытанскі Савет, фонд Сораса і інш. Па гэтым накірунку універсітэт атрымаў магчымасць стажыраваць і навучаць сваіх студэнтаў за мяжой, атрымоўваць вучэбную і метадычную літаратуру, інфармацыйныя пакеты праграм ЕЭС і інш.

Супрацоўнікі універсітэта прынялі ўдзел у розных міжнародных канферэнцыях і выставах (Канферэнцыя Еўрапейскай Асацыяцыі па міжнароднай адукацыі, Мілан; Міжнародная канферэнцыя па дыстанцыйнаму навучанню, ФРГ; Міжнародны семінар «Амерыканская культура і мова», Аўстрыя і інш.).

З 1996 г. аддзел міжнародных сувязяў узначаліла А.Л. Грыбоўская. За 1996 г. было здзейснена 58 камандзіровак за мяжу з мэтай удзелу ў канферэнцыях і семінарах, усталявання двухбаковага супрацоўніцтва з замежнымі навучальнымі ўстановамі, стажыроўкі прафесарска-выкладчыцкага саставу і г.д.

У гэтым годзе працягвалася работа па падрыхтоўцы праекта праграмы TEMPUS «Кіраванне навуковымі даследаваннямі і паслядыпломнай адукацыяй». Каардынатарам праекта з'яўляўся Манчэстэрскі Метраполітэн Універсітэт, партнёрам – Мадрыдскі універсітэт.


*Уручэнне Ганаровай граматы прафесару Шрайнеру*

Працягвалася супрацоўніцтва з ВТШ Мангейма. Прафесар гэтай установы Шрайнер двойчы за год наведаў ПДУ з мэтай наладжвання далейшага супрацоўніцтва і чытання лекцый на тэхналагічным факультэце. За вялікі ўклад у развіццё двухбаковых адносін паміж ВТШ Мангейма і ПДУ, за развіццё навукі ў галіне хімічнай тэхналогіі і тэхнікі прафесару Шрайнеру прысвоена званне «Ганаровы доктар Полацкага дзяржаўнага універсітэта».

Асабліва трэба адзначыць актыўную дапамогу з боку ВТШ Мангейма падручнікамі і літаратурай студэнтам гісторыка-філалагічнага факультэта і студэнтам тэхнічных спецыяльнасцей, якія паглыблена вывучаюць нямецкую мову.

У 1996 г. быў атрыманы грант ад Нямецкага бібліятэчнага інстытута г. Берліна з мэтай аўтаматызацыі бібліятэкі ПДУ.

Як і ў мінулыя гады, студэнты мелі магчымасць навучацца і стажыравацца за мяжой. Іх колькасць у 1996 г. склала 12 чалавек, гэта студэнты машынабудаўнічага, тэхналагічнага, гісторыка-філалагічнага, радыётэхнічнага факультэтаў.

Падчас наведвання ПДУ міністрам экалогіі Швецыі і дырэктарам цэнтра па землеўпарадкаванню быў падпісаны Дагавор з Каралеўскім тэхналагічным інстытутам і Шведскай геадэзічнай службай. У рамках дагавора аспіранты, магістранты, студэнты атрымалі магчымасць павышаць узровень сваіх ведаў за мяжой.

Працягвалася супрацоўніцтва і з Амерыканскім інфармацыйным цэнтрам пры пасольстве ЗША ў РБ, які прадаставіў вучэбную і метадычную літаратуру, аудыя- і відэаматэрыялы па краіназнаўству і англійскай мове.

У выніку цеснага супрацоўніцтва з пасольствам Францыі ў РБ выкладчыкі кафедры французскай мовы мелі магчымасць стажыравацца ва універсітэце г. Руана.

У 1997 г. пачалі рэалізоўвацца 3 міжнародных праекты. Першы – поўны сумесны праект па праграме TEMPUS «Стварэнне сістэмы кіравання праграмамі падрыхтоўкі магістраў». Трэба адзначыць, што магістратура з'яўляецца важнейшым аспектам рэформы вышэйшай адукацыі РБ, таму значнасць праекта выйшла за рамкі аднаго універсітэта.

Другі праект – гэта праект аўтаматызацыі бібліятэкі па праграме супрацоўніцтва нямецкіх бібліятэк з бібліятэкамі краін Цэнтральнай і Усходняй Еўропы. Ужо ў гэтым годзе ў рамках праекта выкананы наступныя мерапрыемствы: закуплена абсталяванне для аўтаматызацыі на суму 34 тысячы нямецкіх марак; пастаўлены каталогі нямецкіх навуковых бібліятэк на кампакт-дысках, здзейснены два візіты з мэтай вывучэння вопыту работы бібліятэкі ВТШ Мангейма.

Трэці праект – праект па Рэгіянальнай праграме супрацоўніцтва ў галіне вышэйшай адукацыі, фінансуемы Брытанскім Фондам Ноу-хау, рэалізоўваўся на факультэце эканомікі і накіраваны на стварэнне магістарскага курса па менеджменту і рэструктурызацыі прадпрыемстваў.

Наш універсітэт быў актыўным удзельнікам праграмы Балтыйскіх універсітэтаў. Супрацоўнікі універсітэта ўваходзяць у асацыяцыю выкладчыкаў экалогіі. Яны ўдзельнічалі ў праграме навучання студэнтаў курсу «Устойлівае развіццё Балтыйскага рэгіёна». Па гэтай праграме універсітэт атрымаў абсталяванне, якое дазволіла ўдзельнічаць у аўдыа- і тэлеканферэнцыях і прымаць спецыяльныя праграмы, якія трансліраваліся праз шведскі спадарожнік сувязі.

Паспяхова працягвалася развіццё партнёрскіх сувязяў з замежнымі краінамі. Усталёўваліся кантакты з фірмай «Дарн'е» (г. Фрыдрыхсхафен). Працягваліся ўзаемаадносіны з Мангеймам і Мюнхенам. Усяго за 1997 г. у ФРГ прайшлі практыку 9 нашых студэнтаў. У выніку супрацоўніцтва з Каралеўскім Тэхналагічным інстытутам геадэзічны факультэт ПДУ атрымаў каштоўнае абсталяванне для мадэрнізацыі працэса навучання і правядзення сумесных навуковых даследаванняў.

Інфармацыйны цэнтр пры Пасольстве ЗША ў РБ аказваў кансультацыйную дапамогу ў выкладанні курсаў амерыканістыкі і англійскай мовы. Прафесар У. Рэтледж з Краун каледжа прачытаў для студэнтаў гісторыка-філалагічнага факультэта курс лекцый і правёў рад семінараў па гісторыі і літаратуры ЗША.

Найбольш значным у 1997 г. для універсітэта быў удзел у Гановерскім кірмашы-96 і выставе «Сучасныя будаўнічыя матэрыялы і канструкцыі», якая праходзіла ў Тэль-Авіве. За 1997 г. было здзейснена 56 камандзіровак у дальняе і блізкае замежжа. У сценах ПДУ было прынята 24 чалавекі з замежных краін.



*Прафесар У. Рэтледж з лекцыяй па сучаснай амерыканскай літаратуры са студэнтамі гісторыка-філалагічнага факультэта*

1998 г. быў годам пашырэння міжнароднага супрацоўніцтва і станоўчага ўплыву, якое яно аказала на ўсе аспекты дзейнасці універсітэта. Быў падоўжаны тэрмін дзейнасці старых дамоваў і падпісаны новыя. Устаноўлены кантакты з навучальнымі ўстановамі Бельгіі, Фінляндыі, Грэцыі ў галіне распрацоўкі сумесных праектаў па выкладанні замежных моў.

Цікавай у гэтым годзе была праца кафедры трубаправоднага транспарту і гідраўлікі ў расійска-беларуска-латышска-шведскім праекце па праблеме распрацоўкі і ўкаранення арганізацыйна-тэхнічнай сістэмы аховы ракі Заходняя Дзвіна і акваторыі Балтыйскага мора ад забруджвання нафтай.

Удзел у канферэнцыях, семінарах, выставах, міжнародных конкурсах на атрыманне грантаў на правядзенне навуковых даследаванняў, замежныя стажыроўкі з'яўляліся важным інструментам павышэння кваліфікацыі супрацоўнікаў і выкладчыкаў універсітэта і садзейнічалі паляпшэнню якасці падрыхтоўкі студэнтаў.

У 1999 г. працягвалася рэалізацыя міжнародных праектаў. У студзені гэтага года праект па праграме TEMPUS № 10234-96 быў падвергнуты маніторынгавай праверцы экспертнай групай праектаў TACIS і быў ахарактарызаваны як добры з дакладнымі мэтамі, якія падзяляюць і разумеюць партнёры.

Гэты ж год быў годам завяршэння праекта аўтаматызацыі бібліятэкі. Бібліятэка ПДУ была адзіным удзельнікам ад Беларусі ў гэтай праграме. Сярод 165 праектаў, адобраных нямецкім бокам, праект ПДУ атрымаў самую большую фінансавую падтрымку. У выніку наша бібліятэка была аснашчана сучаснай тэхнікай і праграмным забеспячэннем, якое дапамагло стварыць электронны каталог, студэнты і выкладчыкі атрымалі доступ да каталогаў і фондаў еўрапейскіх бібліятэк праз INTERNET, быў арганізаваны абмен навуковай дакументацыяй паміж вучонымі.

У 1999 г. пачалася работа па новых праектах:

– праект па стварэнні магістарскай праграмы ў галіне землеўпарадкавання ва універсітэтах Эстоніі, Беларусі, Украіны з Каралеўскім тэхналагічным інстытутам (Стакгольм, Швецыя), які фінансаваўся Шведскім міжнародным агенцтвам па развіцці (SIDA);

– праект па праграме INTAS «Распрацоўка інстытуцыянальных асноў карпаратыўнага кіравання» з універсітэтам г. Альбарга (Данія) і Манчэстэрскім Метраполітэн універсітэтам (Вялікабрытанія), Інстытутам сусветнай эканомікі і міжнародных зносін (Масква), Сыктыўкарскім дзяржаўным універсітэтам.

Удзел у міжнародных праектах дазволіў універсітэту значна палепшыць сваю матэрыяльна-тэхнічную базу. У 1999 г. атрымана сучаснае камп'ютэрнае абсталяванне на суму 20 тыс. долараў (камп'ютэры, прынтэры, сецявое абсталяванне), вялікая колькасць навукова-тэхнічнай літаратуры, вучэбных і метадычных дапаможнікаў.

У 2000 г. 9 выкладчыкаў і аспірантаў ПДУ атрымалі гранты на навуковыя стажыроўкі рознай працягласці і правядзенне навуковых даследаванняў у замежных вну (Партугалія, Германія, Швецыя, ЗША, Польшча, Францыя), што дазволіла ім значна павысіць свой прафесійны ўзровень. У 2000 г. прадоўжылі навучанне ў магістратуры і аспірантуры замежных вну (Вялікабрытанія, Германія, Швецыя, ЗША) 7 маладых выкладчыкаў і супрацоўнікаў універсітэта.

Больш цесным стала супрацоўніцтва з горадам-пабрацімам Полацка ў Германіі – Фрыдрыхсхафенам. 24 студэнткі гісторыка-філалагічнага факультэта мелі магчымасць правесці год у Германіі, жыць у моўным асяроддзі, наведваць моўныя курсы і абараніць рэфераты па выбраных тэмах ва універсітэце г. Канстанца, што пацверджана сертыфікатамі дадзенай установы.

З мэтай задзейнічаць усе факультэты і структурныя падраздзяленні была створана Асацыяцыя выпускнікоў ПДУ, якія валодаюць нямецкай мовай. Арганізацыя аб'яднала маладых выкладчыкаў і аспірантаў, якія праходзілі практыку або стажыраваліся ў Германіі і маюць асабістыя навуковыя і дзелавыя кантакты ў ФРГ. Кожны з іх курыраваў свой факультэт і кафедры, атрымаўшы канкрэтныя даручэнні наладжваць супрацоўніцтва на месцах. Міжнародны аддзел у дадзеным выпадку выконваў каардынуючую ролю і аказваў практычную дапамогу ў пошуку партнёраў.

Актыўна развівалася супрацоўніцтва з Дзяржаўнай акадэміяй нафты і газа ім. І.М. Губкіна (Расія) у рамках дагавора аб педагагічным і навукова-тэхнічным супрацоўніцтве. Супрацоўніцтва накіравана на падрыхтоўку высокакваліфікаваных кадраў для абслугоўвання сістэм трубаправоднага транспарту і ўключала сумесныя навуковыя распрацоўкі, правядзенне канферэнцый, абмен і сумесную распрацоўку вучэбных дапаможнікаў, абмен выкладчыкамі і кіраўніцтва аспірантамі.

У 2000 г. быў падпісаны міжнародны дагавор аб супрацоўніцтве славянскіх універсітэтаў чатырох дзяржаў паміж Белградскім (Югаславія), Бранскім (Расійская Федэрацыя) універсітэтамі, Жытомірскім інжынерна-тэхналагічным інстытутам (Украіна) і Полацкім дзяржаўным універсітэтам, які прадугледжваў устанаўленне навуковых, адукацыйных і культурных сувязяў паміж навукова-педагагічнымі калектывамі, грамадскімі арганізацыямі, студэнтамі, асобнымі выкладчыкамі і навукоўцамі.

Падпісаны дагавор з Наўгародскім дзяржаўным універсітэтам ім. Я. Мудрага. Дагавор прадугледжвае сумесныя даследаванні ў галіне экалогіі, гісторыі, культуралогіі і эканомікі, выданне сумесных публікацый, абмен выкладчыкамі і студэнтамі і інш.

У 2000 г. было здзейснена 29 камандзіровак у дальняе замежжа і 51 – у бліжняе.

У 2001 г. ПДУ ўдзельнічаў у двух праектах па праграме TEMPUS.

1. Сумесны праект «Развіццё студэнцкай службы ў Полацкім дзяржаўным універсітэце» з Каралеўскім тэхналагічным інстытутам (г. Стакгольм, Швецыя), Вышэйшай тэхнічнай школай Мангейм (Германія) і Універсітэтам Генуі (Італія).

Мэта праекта: стварэнне комплекснай студэнцкай службы ў ПДУ. Агульны аб'ём фінансавання – 250 000 еўра.

2. Сумесны сецявы праект «Дысемінацыя, кааперацыя і універсітэцкая рэформа ў галіне выкладання эканомікі ў Беларусі» з Каталонскім політэхнічным універсітэтам (Іспанія), універсітэтам Манпел'е (Францыя), Беларускім дзяржаўным эканамічным універсітэтам і шэрагам іншых беларускіх ВНУ.



*Каардынатары міжнароднага праекта TEMPUS*

У маі 2001 г. пачалася рэалізацыя праекта «Экалагічная адукацыя ва універсітэтах і на прадпрыемствах» у рамках трохбаковага дагавору паміж ПДУ, Кіеўскім нацыянальным універсітэтам будаўніцтва і архітэктуры (Украіна) і Каралеўскім тэхналагічным інстытутам (Стакгольм, Швецыя).

У 2001 г. заключаны рад новых дагавароў аб супрацоўніцтве. З ліку найбольш важных можна адзначыць дагавор аб супрацоўніцтве з прафсаюзам Прысяжных тапографаў Лівана, тэхнічным універсітэтам Чэнстахова (Польшча), шэрагам прамысловых прадпрыемстваў – ААТ «Буднафта», «Транснафта» (Расія).

У гэтым жа годзе працягвалася супрацоўніцтва з Канціпурскім інжынерным каледжам (Катманду, Непал), у рамках якога на завочным факультэце ПДУ займаюцца студэнты – грамадзяне Каралеўства Непал.

У 2001 г. прынята 15 замежных гасцей, з іх 4 – па праграме TEMPUS. На вучобу ў замежныя універсітэты было накіравана 10 маладых выкладчыкаў і аспірантаў.

У 2002 г. за мяжу было камандзіравана 26 студэнтаў ПДУ, з іх 13 – у рамках праекта праграмы TEMPUS «Стварэнне службы падтрымкі студэнтаў ПДУ», для вывучэння вопыту ВНУ-партнёраў; 3 студэнты – для ўдзелу ў міжнародных канферэнцыях у Расіі і Польшчы; 2 – для ўдзелу ў Фестывалі моладзі славянскіх ВНУ; 8 – для ўдзелу ў Міжнародным турніры па дзюдо.

У 2002 г. ва універсітэце было праведзена 7 Міжнародных канферэнцый і семінараў, у якіх бралі ўдзел прадстаўнікі навукоўцаў з Расіі, Польшчы, Германіі, Швецыі: навукова-тэхнічны семінар «Інтэлектуальная вытворчасць: стан і перспектывы развіцця», навуковая канферэнцыя «Асветніцтва і гуманістычныя каштоўнасці Беларусі ў рэтраспектыве часу: да 900-годдзя з дня нараджэння

Еўфрасінні Полацкай»; міжнародны навукова-практычны семінар рэктараў вну Беларусі, Расіі, Украіны і Германіі «Інтэрнэт-цэнтр – інфармацыйны рэсурс адукацыі і навукі рэгіёна» і інш. У міжнародных мерапрыемствах, якія праводзіліся універсітэтам у 2002 г., прыняло ўдзел больш за 60 гасцей з-за мяжы.

У сакавіку 2002 г. быў падпісаны дагавор паміж Полацкім дзяржаўным універсітэтам і дабрачынным фондам «Чарнобыль – лінія жыцця» (Ірландыя); адпаведна пунктам дагавору фондам была закуплена і перададзена бібліятэцы ПДУ вучэбная, навуковая і мастацкая літаратура для студэнтаў кафедры англійскай мовы (92 кнігі на суму 2800 еўра).

У галіне сумесных навуковых распрацовак кафедра хімічнай тэхнікі супрацоўнічала з французскай фірмай ISL, якая з'яўляецца часткай шматнацыянальнай карпарацыі па вытворчасці лабараторнай вымяральнай тэхнікі.

На вучобу ў замежныя універсітэты было накіравана 8 маладых выкладчыкаў і аспірантаў, адпаведна ў нашым універсітэце навучаліся 83 замежныя студэнты: 62 – з Расіі, 9 – з Літвы, 3 – з Латвіі, 8 – з Лівана, 1 – з Сірыі.

З 2003 г. аддзел працуе пад кіраўніцтвам К.І. Баранчука. У 2003 г. паспяхова завершаны два міжнародных праекты. Першы – поўны сумесны праект па праграме TEMPUS «Стварэнне службы падтрымкі студэнтаў у Полацкім дзяржаўным універсітэце». Мэта дасягнута, на сродкі праекта былі выдадзены праспекты аб створаных ва універсітэце студэнцкіх службах, брашуры аб факультэтах, здзейснена 57 паездак за мяжу для знаёмства з арганізацыяй студэнцкіх службаў у вну іншых краін. Другі – сумесны сецявы праект «Дысемінацыя, кааперацыя і універсітэцкая рэформа ў галіне выкладання эканомікі ў Беларусі» TEMPUS. У рамках праекта выдадзены сумесныя манаграфіі.

У рамках супрацоўніцтва з Каралеўскім Тэхналагічным Інстытутам на геадэзічным факультэце створана новая спецыяльнасць «Кадастр населеных пунктаў».



*Канферэнцыя па выніках міжнародных праектаў*

З лютага 2004 г. па цяперашні час аддзел міжнародных сувязяў узначальвае С.В. Пешкун.

У рамках міжнароднага супрацоўніцтва выкладчыкі і супрацоўнікі ўсталявалі трывалыя сувязі з замежнымі калегамі, набылі вопыт удзелу ў сумесных навуковых распрацоўках, выступленняў на міжнародных канферэнцыях. Стажыроўкі і навучанне ў замежных вну далі ім магчымасць пазнаёміцца з выкладаннем як традыцыйных, так і новых для універсітэта дысцыплін, з сучаснымі тэхналогіямі навучання, з новымі метадычнымі распрацоўкамі, што зрабіла навучальны працэс у Полацкім дзяржаўным універсітэце больш эфектыўным.

У 2004 г. ва універсітэце былі арганізаваны 4 міжнародныя канферэнцыі, удзел у якіх бралі прадстаўнікі вышэйшых навучальных устаноў Расіі, Украіны, Швецыі і ЗША:

– Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Права Беларусі: вытокі, традыцыя, сучаснасць»;

– III Міжнародная навуковая канферэнцыя «Беларуская, руская і сусветная літаратура: гісторыя, сучаснасць, узаемасувязі»;

– II Міжнародная навукова-тэхнічная канферэнцыя «Праблемы праектавання і вытворчасці радыёэлектронных сродкаў»;

– Міжнародная навукова-тэхнічная канферэнцыя, прысвечаная 30-годдзю вышэйшай геадэзічнай адукацыі ў Беларусі «Геадэзія, картаграфія і кадастры».

У гэтым жа годзе ў Полацкім дзяржаўным універсітэце адбылося сумеснае паседжанне кіраўніцтва Латвійскай АН і НАН Беларусі.

У міжнародных мерапрыемствах, праведзеных у ПДУ ў 2004 г., прынялі ўдзел 44 госця з-за мяжы.

У маі 2004 г. на геадэзічны факультэт быў запрошаны кіраўнік дэпартамента «Геаінфарматыка і фотаграмметрыя» Каралеўскага тэхналагічнага інстытута з мэтай чытання лекцый для студэнтаў, магістрантаў і аспірантаў па пытаннях выкарыстоўвання інфармацыйных тэхналогій у навучальным працэсе і сучасным праграмным забеспячэнні ў галіне геадэзіі.

У 2004 г. у ПДУ на розных факультэтах навучаўся 71 замежны студэнт (з Расіі, Літвы, Латвіі, Сірыі, Лівана, Казахстана).

Актыўна развівалася супрацоўніцтва са Шведскім інстытутам культурнага турызму, што прадугледжвала доўгатэрміновую мэту развіцця інфраструктуры культурнага турызму ў Полацкім рэгіёне, а таксама адкрыццё ў ПДУ новай спецыяльнасці «Культурны турызм».

У 2005 г. распачата падрыхтоўка і падпісанне дагавора аб двухбаковым супрацоўніцтве з Універсітэтам г. Вэкс'ё (Швецыя). У гэтым жа годзе было падпісана пагадненне аб супрацоўніцтве паміж факультэтам права ПДУ і інстытутам права Універсітэта г. Стакгольма.

У маі 2005 г. ва універсітэце праходзіў міжнародны семінар «Панарама: Дзвіна – Даўгава», у ходзе якога на пяці пленарных паседжаннях і чатырох секцыях разглядаліся пытанні развіцця інфраструктуры культурнага турызму ў Латвіі і Беларусі, а таксама павышэння прывабнасці Віцебскай вобласці для ўязнога турызму. Семінар праводзіўся сумесна з прадстаўнікамі выканаўчых камітэтаў гарадоў Полацка, Наваполацка, Віцебска, а таксама выканаўчага камітэта Віцебскай вобласці з прадстаўнікамі Шведскага інстытута культурнага турызму, адміністрацыі вострава Готланд (Швецыя), Паморскага цэнтра развіцця (Польшча), Французскага агенцтва падтрымкі рэгіянальнага турызму, Універсітэта г. Даугаўпілс (Латвія), муніцыпалітэта г. Даўгаўпілс.

У 2005 г. распачата рэгістрацыя сумеснага Еўрапейскага праекта TEMPUS па тэме «Уводзіны курсаў па праву нерухомасці» сумесна з Каралеўскім тэхналагічным інстытутам (Швецыя), Тэхнічным універсітэтам г. Дэльфт (Галандыя), Тэхналагічным універсітэтам г. Хельсінкі (Фінляндыя).

Для праходжання навучання ў замежных універсітэтах былі накіраваны 64 выкладчыкі і аспіранты універсітэта. 17 чалавек прынялі ўдзел у міжнародных канферэнцыях, выставах, сімпозіумах.

У 2005 г. на розных факультэтах нашага універсітэта навучалася 54 замежныя студэнты. З мэтай павелічэння іх колькасці былі разасланы рэкламныя праспекты ў пасольствы і консульствы замежных дзяржаў (уключаючы краіны Усходняй Еўропы, Азіі, Афрыкі, Лацінскай Амерыкі) у Рэспубліцы Беларусь і Расійскай Федэрацыі.

У 2006 г. ва універсітэце было арганізавана 5 міжнародных канферэнцый, у якіх прынялі ўдзел прадстаўнікі вышэйшых навучальных устаноў Расіі, Украіны, Швецыі, Германіі, Латвіі, Літвы, Фінляндыі, Венгрыі, Польшчы.

У гэтым жа годзе пачалася праца па праекту праграмы ВІСБІ, фінансуемага Шведскім Інстытутам, накіраваным




*У цэнтры вывучэння шведскай мовы*

на ўдасканаленне праграм навучання і супрацоўніцтва ў галіне навуковых даследаванняў паміж факультэтам права ПДУ і факультэтам права Універсітэта г. Стакгольм, Швецыя. У рамках супрацоўніцтва з гэтай краінай быў адкрыты цэнтр самастойнага вывучэння шведскай мовы, а з верасня гэтага года распачата выкладанне шведскай мовы ва універсітэце.

Полацкі дзяржаўны універсітэт прыняў удзел у выкананні праграмы па актывізацыі беларуска-кітайскіх зносін на 2006 – 2010 гг. У перыяд з чэрвеня па верасень 2006 г. УА «ПДУ» прыняла рад мер па здзяйсненню экспарта адукацыйных паслуг і актывізацыі прыцягнення грамадзян Кітайскай Народнай Рэспублікі для навучання ў нашым універсітэце.




*Дні навукі і тэхналогій РБ у Кітаі з удзелам дэлегацыі ПДУ, 2007 г.*

У 2007 г. пачалася праца над буйнамаштабным праектам праграмы TEMPUS «Распрацоўка вучэбнай праграмы ў галіне сацыяльнай педагогікі» сумесна з Універсітэтам г. Вэкс'ё (Швецыя) і Універсітэтам г. Генуя (Італія).

Міжнародная дзейнасць універсітэта ў 2007 г. праводзілася па тых жа накірунках, што і ў папярэднія гады:

– удзел у міжнародных праектах і праграмах;

– развіццё эфектыўных узаемавыгадных партнёрскіх сувязяў з вучэбнымі, навуковымі, культурнымі, прамысловымі і іншымі ўстановамі за мяжой на аснове двухбаковых і шматбаковых праграм супрацоўніцтва;

– удзел у міжнародных навукова-практычных канферэнцыях, сімпозіумах, семінарах, выставах і іншых мерапрыемствах;

– накіраванне выкладчыкаў, супрацоўнікаў, аспірантаў, магістрантаў, студэнтаў вну для праходжання навучання, стажыроўкі і абмену вопытам за мяжу;

– укараненне сучасных метадаў і сродкаў камунікацыі з мэтай атрымання аналізу, распаўсюджання і абмену інфармацыяй.

# ГІСТОРЫЯ РАЗВІЦЦЯ КУЛЬТУРЫ Ў ПОЛАЦКІМ ДЗЯРЖАЎНЫМ УНІВЕРСІТЭЦЕ (1968 – 2008 гг.)

Культурнае жыццё Полацкага дзяржаўнага універсітэта надзвычай багатае. Развіццё культуры можна ўмоўна падзяліць на некалькі этапаў: у межах дзейнасці Наваполацкага філіяла Беларускага політэхнічнага інстытута (з 1968 г.), філіяла Беларускага тэхналагічнага інстытута імя С.М. Кірава (з 1969 г.), Наваполацкага політэхнічнага інстытута (з 1974 г.) і Полацкага дзяржаўнага універсітэта (з 1993 г.).

Студэнцкая моладзь канца 1960-х гадоў мінулага стагоддзя з аптымізмам і вялікімі надзеямі на будучыню закладвала традыцыі вышэйшай навучальнай установы ў новапабудаваным горадзе БССР – Наваполацку.

У артыкуле «І фізікі, і лірыкі», змешчаным 1 студзеня 1971 года ў наваполацкай гарадской газеце «Хімік», распавядалася аб жыцці Наваполацкага філіяла БТІ. У ім ёсць такія радкі:

«Аб чым марыць рабяты? Не знікнуць бясследна з інстытуцкай памяці.

– Нам пашанцавала аставіць першыя запісы на чыстых аркушах гісторыі інстытута, – сказаў Ігар Фаскееў, – хочацца, каб яны былі значныя, памятныя...»

Пачуццё адказнасці за першынства надавала ўсім культурным падзеям добры пафас, імкненне да ўзнёсласці, рамантычнасць і змястоўнасць.

Галоўная адметнасць першага перыяда культурнага жыцця нашай навучальнай установы – упершыню. Упершыню была выпушчана насценная газета, папярэдніца «Настежь». Упершыню быў створаны тэатр эстрадных мініяцюр (1970 г.), у якім Лёва Мятла і Міша Урман падрыхтавалі першыя тры мініяцюры на студэнцкія тэмы. У 90-ыя гады на нашай сцэне ставіцца велічны эпічны спектакль «Гедымін», а ў XXI-м стагоддзі студэнцкі тэатр «АРТ» атрымлівае званне народнага, даказваючы паўнавартнасць тэатральнага калектыву ПДУ. Упершыню Уладзімір Грынёў зняў дакументальны фільм «Стройся, отряд!» аб першых будаўнічых атрадах. Да Уладзіміра далучыліся іншыя энтузіясты (Леў Мятла, Пётр Зайцаў), і ў 1970 годзе была створана студэнцкая кінастудыя «Кварц», папярэдніца сучаснага «Канспекта». Упершыню (20 лістапада 1971 г.) у інстытуце адбылося спаборніцтва клуба вясёлых і знаходлівых паміж камандамі будаўнічага і механіка-тэхналагічнага факультэтаў. Свае выступленні абедзве каманды пачалі з экскурса ў будучыню Наваполацка і ў будучыню студэнцкага жыцця, гэта значыць – нашу з вамі сучаснасць...

Студэнты заўжды рэалізуюць свае таленты праз мастацкую самадзейнасць. У першыя гады існавання навучальнай установы канцэрты мастацкай самадзейнасці рыхтаваліся агульнымі намаганнямі. Абавязковымі атрыбутамі мастацкай самадзейнасці 1960-х – першай паловы 1980-х гадоў былі хор і духавы аркестр, потым агітбрыгада, а ўжо далей ішлі інструментальныя ансамблі, танцавальныя, тэатральныя і іншыя калектывы. Дзеля павышэння майстэрства самадзейных калектываў праводзіліся ўсесаюзныя, рэспубліканскія, абласныя, гарадскія конкурсы, фестывалі, якія прымяркоўваліся да знамянальных дат: 100-годдзю з дня нараджэння У.І. Леніна, 40-годдзю Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне, 60-годдзю Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі і г.д.

У нашай навучальнай установе з сярэдзіны 70-х пачалі праводзіцца розныя па тэматыцы фестывалі, агляды-конкурсы мастацкай самадзейнасці факультэтаў. У 1979 годзе адбыўся Першы агульнаінстытуцкі фестываль самадзейнай мастацкай творчасці студэнтаў і супрацоўнікаў інстытута, арганізавана і праведзена выстава прыкладнога і выяўленчага мастацтва студэнтаў і выкладчыкаў інстытута. На змену гэтым мерапрыемствам у ПДУ прыйшлі Дні факультэтаў, фестываль першакурснікаў «Дэбют».

Адным з першых мастацкіх калектываў маладой навучальнай установы быў хор. Хор студэнтаў існаваў пастаянна да канца 70-х гадоў.



*Вакальна-інструментальны ансамбль «Гусляры»*

Побач з хорамі, духавымі аркестрамі ў савецкія часы вялікай папулярнасцю карысталіся вакальна-інструментальныя ансамблі (ВІА). Улетку 1970 г. студэнцкі атрад «Квант» працаваў на Лепельшчыне. Увосень на грошы, зароблены ў будаўнічым студэнцкім атрадзе, быў створаны першы вакальна-інструментальны ансамбль «Гусляры». Атрад і ансамбль узначальваў Ігар Троіцкі, у яго склад уваходзілі арганіст Уладзімір Яхнін, гітарыст Генадзь Ялхімаў, саксафаніст Барыс Галаванаў, гітарыст і трубач Уладзімір Маркаў.

Пасля «Гусляроў» ствараліся і іншыя ВІА: «Вясёлка», «Скіфы», «Сінонім», «Красавік».

Творчасць вакальна-інструментальных ансамбляў была папулярнай у 1960 – 1980-я гады. Мяняліся накірункі, стылі, рэпертуар, але свае музычныя, спеўныя здольнасці тагачасная моладзь выказвала ў ВІА. Сярод іх пастаянна праводзіліся конкурсы, часцей прымеркаваныя да знамянальнай даты. На традыцыйным конкурсе ВІА «Наваполацк-80», прысвечаным 35-годдзю перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне, які сабраў групы з Наваполацка, Віцебска, Светлагорска, асабліва вылучыўся ансамбль «Сінонім» Наваполацкага політэхнічнага інстытута. Калектыў прадставіў кампазіцыю, напісаную адным з удзельнікаў. І, як вынік, «Сінонім» заняў ганаровае 3-е месца.

Сярод творчых мастацкіх калектываў часоў НПІ, бадай, самымі распаўсюджанымі былі калектывы агітбрыгад. Агітбрыгада ўяўляла сабой самадзейны калектыў – агітацыйна-мастацкую брыгаду, удзельнікі якой выступалі па сцэнарыі, складзеным самастойна. Агульным патрабаваннем да зместу сцэнарыя была ідэйная накіраванасць, бо самадзейныя артысты сцэнічнымі сродкамі павінны былі ажыццяўляць выхаваўчую, агітацыйную і прапагандысцкую работу. Агітбрыгада, як калектыў мабільны, адгукалася на надзённыя тэмы: прапагандавала рашэнні партыйных і савецкіх органаў, ухваляла поспехі, а магла крытыкаваць недахопы парушальнікаў савецкага ладу жыцця. Агульнаінстытуцкая агітбрыгада «Мазаіка», якая існавала напачатку 80-х гадоў, шмат сваіх выступленняў прысвяціла ахове навакольнага асяроддзя.



*Агітбрыгада студэнцкага будаўнічага атрада «Эўрыка-2», 1978 г.*

Адметнай рысай студэнцкіх агітбрыгад была, безумоўна, маладосць іх удзельнікаў. А гэта мясціла ў сабе запал, шчырасць і непасрэднасць. Кожны студэнцкі будаўнічы атрад павінен быў мець сваю агітбрыгаду, якая выступала перад насельніцтвам на месцы працы. Традыцыйнымі былі ў НПІ агляды агітбрыгад студэнцкіх будаўнічых атрадаў, якія праводзіліся ў маі. Наваполацкія агітбрыгады прымалі ўдзел і ў абласных аглядах-конкурсах. У 1980

годзе агібрыгада СБА «Эўрыка» заняла на ім 1-е месца. Паспяхова выступалі і іншыя агітбрыгады.

Па меры таго, як расла колькасць студэнцтва, расла і колькасць студэнцкіх будаўнічых атрадаў. Геаграфія месцаў дыслакацыі будаўнічых атрадаў юнакоў і дзяўчат у форме з эмблемай НПІ пастаянна пашыралася. У Смаленскай і Цюменскай абласцях, у стэпавых пасёлках Казахстана, на таёжных стаянках Сібіры, у Якуціі і Малдове ўзводзіліся школы, клубы і іншыя аб'екты. Але не толькі ўдарнай працай застаўся ў памяці студэнтаў Наваполацкага політэхнічнага інстытута трэці, працоўны семестр. Паўсюль, дзе б ні працавалі нашыя студэнты, адбываліся выступленні агітбрыгад, а значыць, пашыралася вядомасць нашага інстытута, узрастала павага да яго.

Сваё асаблівае месца ў культурным жыцці Наваполацкага політэхнічнага інстытута займалі так званыя «Агеньчыкі». На пачатку 60-х гадоў на цэнтральным тэлебачанні СССР з'явілася тэлеперадача «Блакітны агеньчык», якая адрознівалася ад іншых сваёй неафіцыйнай атмасферай, спалучаючы падзею свята з выступленнем папулярных артыстаў. Папулярнасць тэлеагеньчыкаў была каласальнай. Запазычаныя з тэлеэкрана, «Агеньчыкі» ў 60 – 70-я гг. XX ст. пайшлі «ў народ».

«Агеньчыкі» праводзіліся не як масавае мерапрыемства. На «агеньчык» збіраліся зацікаўленыя студэнты ці выкладчыкі, аб'яднаныя агульным захапленнем (паэзія, раманс, бардаўская песня). Такія «агеньчыкі» стваралі атмасферу добразычлівасці, непасрэднасці, у якой можна было праявіць свае выканальніцкія здольнасці: прачытаць верш, праспяваць песню і г.д. Памяшканне да такіх мерапрыемстваў адмыслова ўпрыгожвалі спецвыпускамі насценных газет, фотаздымкамі, малюнкамі, шаржамі. «Агеньчыкі» спрыялі развіццю этычных адносін і выхоўвалі эстэтычны густ.



*Студэнты каля стэнду факультэта грамадскіх прафесій*

Каардынуючым цэнтрам культурна-масавай работы ў Наваполацкім політэхнічным інстытуце з'яўляўся мастацкі савет, у склад якога ўваходзілі намеснікі дэканаў усіх факультэтаў, прадстаўнікі партыйнага і прафсаюзнага камітэтаў, камітэта Ленінскага камуністычнага саюза моладзі Беларусі.

Вялікую ролю ў культурным жыцці НПІ адыграў створаны ў снежні 1976 г. факультэт грамадскіх прафесій (ФГП). На гэты факультэт залічваліся студэнты, якія па жаданні маглі атрымаць і грамадскую прафесію. У 1977 г. грамадская кваліфікацыя была прысвоена 14 студэнтам, у 1981 г. – ужо 189 спецыялістам, працягваючы ўзрастаць і далей.

На сямі аддзяленнях факультэта праводзілася падрыхтоўка па 15 спецыяльнасцях. Самым запатрабаваным у тыя гады было першае аддзяленне – школа маладога лектара. Тут аваподвалі такімі грамадскімі прафесіямі, як прапагандыст, лектары па грамадска-палітычнай, атэістычнай, культурнай тэматыцы.

Слухачы другога аддзялення – школы камсамольскага актыву, рыхтаваліся стаць інструктарамі па камсамольскай рабоце ў першасных арганізацыях, рэдактарамі насценных газет, арганізатарамі аператыўных камсамольскіх атрадаў.

Трэцяе аддзяленне – школа прафсаюзнага актыву – рыхтавала інструктараў па прафсаюзнай рабоце.




*Кіраўнік аматарскай радыёстанцыі UK 2 WAR Л. А. Палякоў*

На аддзяленні арганізатараў ваенна-патрыятычнай і абаронна-масавай работы рыхтавалі арганізатараў ваенна-патрыятычнага выхавання і грамадскіх інструктараў-трэнераў па радыёспорту. Ваенна-патрыятычным выхаваннем займаўся Барыс Пятровіч Сахараў, дацэнт кафедры геадэзіі. Яшчэ ў 1957 годзе ён быў узнагароджаны нагрудным знакам Добраахвотнага таварыства садзейнічання арміі, авіяцыі, флоту (ДТСААФ) «За актыўную работу» з пасведчаннем да яго, падпісаным старшынёй ДТСААФ, маршалам Савецкага Саюза Сямёнам Будзённым. Барыс Пятровіч быў выдатным стралком і з'яўляўся суддзёй першай катэгорыі па стралковым спорце, прысвоенай ДТСААФ СССР.

Інструктараў-трэнераў па радыёспорце рыхтаваў старшы інжынер навукова-даследчага аддзела Леў Аляксандравіч Палякоў. Ён заснавальнік (снежань 1973 г.) і адзіны кіраўнік на працягу ўсіх гадоў існавання папулярнай у інстытуце аматарскай радыёстанцыі UK 2 WAR. Больш чым у 70 краінах Еўропы, Амерыкі, Азіі, Афрыкі і нават у Антаркцідзе гучалі пазыўныя нашай аматарскай радыёстанцыі, паведамляючы аб маладым горадзе Наваполацку, аб маладой навучальнай установе, і тым самым рабілі Наваполацкі політэхнічны інстытут вядомым у свеце.

Асноўным дакументам, які пацвярджаў праведзеную радыёсувязь, была картка-квітанцыя, якую пасылаў калега-радыёаматар. Засталося звыш за 20000 картак-квітанцый, атрыманых радыёстанцыяй UK 2 WAR. Гэта паштоўкі-візітоўкі кароткахвалявікоў з адлюстраваннем знакамітых архітэктурных і гістарычных помнікаў, прыгожых краявідаў сваіх краін, а таксама карткі гумарыстычнага зместу з побыту радыёаматараў, фотапартрэты і г.д. Наяўнасць картак-квітанцый давала магчымасць радыёаматарам атрымаць дыплом, які з'яўляўся аўтарытэтным сведчаннем высокага ўзроўню радыёстанцыі. Каля 400 дыпломаў з усіх рэспублік СССР, большасці еўрапейскіх краін, ЗША, Японіі – красамоўныя сведкі ўзроўню радыёстанцыі НПІ, якая неаднаразова ўваходзіла ў лік лепшых у свеце.

Аддзяленне арганізатараў турысцка-экскурсійнай работы рыхтавала інструктараў-метадыстаў па турызму і гідаў-перакладчыкаў. Пры наборы групы «гід-перакладчык» колькасць жадаючых заўжды перавышала планы набору. Вяла іх Ірына Барысаўна Дар'янава. Яна працавала інжынерам-перакладчыкам з нямецкай і англійскай моў з 1 верасня 1968 г. Пры гэтым Ірына Барысаўна нярэдка выступала ў якасці перакладчыцы з нямецкай на англійскую і наадварот для спецыялістаў-будаўнікоў з Англіі і Германіі. Яе часта запрашалі для правядзення экскурсій для замежных гасцей НПІ.




*Карткі, атрыманыя радыёстанцыяй*

Турызм у Наваполацкім політэхнічным інстытуце быў сапраўды масавым. Усе яго віды (горны, водны, пешы, вела- і мотатурызм) актыўна практыкаваліся ў НПІ. Нашыя турысты падымаліся на перавалы Каўказа, Карпат, былі на Кольскім паўвостраве, а Міхаіл Шашкоў здзейсніў 6000-кіламетровы велапрабег па Прыбалтыцы, РСФСР, Беларусі. Лепшыя студэнцкія групы, творчыя калектывы ўзнагароджваліся экскурсійнымі паездкамі ў сталіцы саюзных рэспублік: Маскву, Ленінград, Кіеў, Адэсу, Рыгу, Талін і г.д.

Аддзяленне культурна-масавай работы давала навыкі арганізацыі правядзення вольнага часу студэнцтва. Тут дапамагалі стаць арганізатарамі вакальнай групы, тэатральнай студыі, дэкламатарамі, танцорамі.

Адной з найпапулярнейшых формаў баўлення вольнага часу студэнтаў НПІ былі танцы. Аднымі з першых у НПІ сталі развівацца бальныя танцы. Гэтыя танцы, якія ў СССР доўгі час адносілі да буржуазнай культуры, пачалі распаўсюджвацца толькі з сярэдзіны 60-х гадоў, якраз падчас стварэння ВНУ ў Наваполацку.

У кастрычніку 1975 года ў інстытуце была створана школа бальнага танца пад кіраўніцтвам Аляксандра Арцёменкі. Першапачаткова ў ёй займаліся 22 студэнты. У школе танца яны авалодвалі асноўнымі рухамі праграмаў: еўрапейскай (танга, павольнага і венскага вальсаў, павольнага і хуткага факстротаў) і лацінаамерыканскай (румба, самба, ча-ча-ча, джайв, пасадобль). Быў створаны ансамбль сучаснага танца НПІ «Квік». Месяцы напружанай падрыхтоўкі далі свой плён. Пад назвай «Вясна-76» 3 красавіка 1976 года прайшоў першы конкурс выканаўцаў бальнага танца ў НПІ, у якім прынялі ўдзел ансамбль «Квік», танцоры Дварца культуры будаўнікоў Наваполацка і Дварца культуры Полацкага завода шкловалакна. Акрамя вальса, у конкурсе «Вясна-76» сваё майстэрства выканаўцы прадэманстравалі ў такіх абавязковых танцах, як «Сударушка», «Рускі лірычны», «Ча-ча-ча», «Рылё», «Вару-вару», «Беларуская полька».

На першым конкурсе адбыліся паказальныя выступленні танцораў рэспубліканскага Дома народнай творчасці і лаўрэатаў Міжнароднага і Усесаюзнага конкурсаў выканаўцаў сучаснага бальнага танца Міхаіла і Надзеі Брыруноў з Мінска.

Першымі пераможцамі ў першым конкурсе выканаўцаў бальнага танца ў Наваполацкім політэхнічным інстытуце сталі студэнты НПІ: Уладзімір Рэутаў і Надзея Баранава (1-ае месца), Валерый Чэпік і Ларыса Пятрова (2-ое месца), Аляксандр Мацулевіч і Ірына Сударгіна (3-яе месца).

Поспех конкурса «Вясна-76» на некалькі гадоў зрабіў бальныя танцы вельмі папулярнымі ў інстытуце. Леанід Мікалаевіч Фаміца, тагачасны прарэктар па вучэбна-выхаваўчай працы, садзейнічаў таму, каб удзельнікі школы бальнага танца маглі прысутнічаць на міжнародных конкурсах у Вільнюсе і Рызе. Для іх былі сшыты бальныя касцюмы.

У конкурсах бальных танцаў, якія праводзіліся ў Наваполацкім політэхнічным інстытуце ў наступныя гады, прымалі ўдзел ужо пары з Масквы, Каўнаса, Рыгі, Мінска, Ленінграда.

У 80-я гады асаблівую папулярнасць набылі дыскатэкі. Першая ў НПІ дыскатэка была арганізавана студэнтамі машынабудаўнічага факультэта Леанідам Сіманковічам, Яўгенам Дароткам і Маратам Капусціным. У інтэрнаце № 3 быў створаны сапраўдны дыскацэнтр. Дзеля гэтага студэнты самастойна сканструявалі кіруючы светапульт, збудавалі сцэну, на сценах размясцілі



*Удзельніцы ансамбля сучаснага танца «Квік»*



*На студэнцкай дыскатэцы, сярэдзіна 70-х гадоў*



*Дыскатэка «Трэк», сярэдзіна 80-х гадоў*

малюнкі і плакаты. На гэта быў патрачаны амаль год. 17 лістапада 1983 г., у Міжнародны дзень студэнта, Леанід, Яўген і Марат правялі сваю першую дыскатэку пад назвай «Трэк».

Каб атрымаць дазвол на правядзенне дыскатэк, трэба было прайсці атэстацыю абласной і рэспубліканскай камісіі. Спецыяльна для гэтага студэнты-машынабудаўнікі падрыхтавалі праграму «Па хвалях музыкі». Адбылося сапраўднае падарожжа «музыкальнай флатыліі».

Самую разнастайную тэматыку дыскатэк прапаноўвалі юнакі з машынабудаўнічага факультэта: «Сусвет і моладзь», «Творчасць вялікіх», «Мой родны кут», «Музычны побыт». На дыскатэках, якія праводзіў «Трэк», адпачывалі, танцавалі і рабілі адкрыцці новых выканаўцаў савецкай і замежнай эстрады, папаўнялі веды ў класічнай музыцы. Нярэдка іх запрашалі ў сельскія клубы для правядзення мясцовых дыскатэк.

Улетку 1984 года, калі ў складзе студэнцкага будаўнічага атрада «Механік» Леанід Сіманковіч, Яўген Даротка і Марат Капусцін працавалі ў калгасе «Камінтэрн» Шаркаўшчынскага раёна, яны неаднаразова выступалі перад вяскоўцамі. За гэта атрымалі ўзнагароды – ганаровыя граматы райкама камсамола.

Вялікай адметнасцю культурнага жыцця НПІ ў 80-я гады, калі харавое мастацтва дасягнула значнага развіцця, было заснаванне і дзейнасць новага творчага калектыву.

Па ініцыятыве Леаніда Мікалаевіча Фаміцы ў 1980 г. быў створаны мужчынскі хор выкладчыкаў і супрацоўнікаў інстытута. Ён прынцыпова адрозніваўся ад студэнцкага хора і складам, і рэпертуарам, і майстэрствам выканання. Кіраўніком быў запрошаны Мікалай Андрэевіч Калацэй, выкладчык Наваполацкага музычнага вучылішча, таленавіты хормайстар.

У склад хора ўваходзіла 30 – 35 чалавек. Для іх адмыслова былі пашыты касцюмы. Рэпертуар мужчынскага хору быў самы разнастайны, але перавага аддавалася класічным творам, народным песням славянскіх народаў, і не толькі рускім, украінскім, беларускім, але і балгарскім, чэшскім і г.д. Выконваліся і песні савецкіх кампазітараў.

У розныя гады ў мужчынскім хоры выкладчыкаў і супрацоўнікаў Наваполацкага політэхнічнага інстытута спявалі: Васіль Васільевіч Бозылеў, Віктар Уладзіміравіч Лапін, Уладзімір Іосіфавіч Ліпко, Віталій Аляксандравіч Маёраў, Яўген Міхайлавіч Найдзёнышаў, Уладзімір Мікалаевіч Нікалайчук, Фёдар Іванавіч Панцялеенка, Віктар Саламонавіч Салтанаў, Уладзімір Мікалаевіч Стахейка, Леанід Сцяпанавіч Турышчаў, Сяргей Ільіч Харошка і інш. Акрамя таго, пры хоры існаваў

квартэт у складзе Аляксандра Мечыслававіча Ніякоўскага, Аркадзія Філіпавіча Оськіна, Андрэя Мікалаевіча Панкова, Леаніда Мікалаевіча Фаміцы. Саліраваў у хоры тэнар Л. М. Фаміца.


*Мужчынскі хор супрацоўнікаў і выкладчыкаў*

Ніводная з урачыстасцяў у 80-х гадах не адбывалася без хору. Мужчынскі хор выкладчыкаў і супрацоўнікаў НПІ часта запрашалі на гарадскія мерапрыемствы, многа разоў хор выступаў у сельскіх клубах. І паўсюль – поспех. Але, безумоўна, самым вялікім поспехам і папулярнасцю хор карыстаўся ў родных сценах інстытута, асабліва сярод студэнцтва. Водгукі той славы дайшлі і да нашых дзён.

Майстэрствам, высокім узроўнем выканання адрознівалася і жаночая вакальная група пад кіраўніцтвам Валянціны Паўлаўны Антонавай, выкладчыцы музычнага вучылішча. Як і мужчынскі хор, група складалася з супрацоўніц і выкладчыц інстытута.

1 верасня 1985 года на вучобу ў Наваполацкі політэхнічны інстытут прыехала 25 замежных грамадзян. У 1987 г. быў створаны дэканат па рабоце з замежнымі студэнтамі, які ўзначаліў Валерый Віктаравіч Баранаў. Яго намаганнямі быў створаны калектыў супрацоўнікаў дэканата, праца якога была накіравана на арганізацыю вучэбнага і выхаваўчага працэсу са студэнтамі. Іх колькасць штогод павялічвалася. З 40 краін свету (Кабо-Вердэ, Ліван, Індыя, Марока, Перу, Філіпіны, Буркіна-Фасо, Чад, Калумбія, Мадагаскар і іншыя) прыехалі студэнты ў НПІ. У працы з імі неабходна было ўлічваць нацыянальныя асаблівасці, звычаі для стварэння паўнавартасных умоў для навучання.

Банзекуліваха Мухізі Жан, выпускнік НПІ 1990 г., кандыдат тэхнічных навук, дацэнт кафедры галіновага менеджмента і эканомікі ў сваіх успамінах адзначыў: «Для замежных студэнтаў Валерый Віктаравіч Баранаў быў сапраўдным бацькам. З якім бы пытаннем не звяртаўся да яго студэнт, ён імгненна яго вырашаў, выкарыстаючы ўсе магчымасці. Ён выдатна разумеў тыя складанасці, з якімі сутыкаюцца замежныя студэнты, знаходзячыся на чужой зямлі, таму ён рабіў усё магчымае і немагчымае, каб гэтая зямля стала для іх другой радзімай, і ў яго ўсё цудоўна атрымлівалася. Ён успрымаў боль замежнага студэнта як асабістую, што ўласціва не кожнаму кіраўніку...»


*Дэкан факультэта па рабоце з замежнымі студэнтамі В. В. Баранаў (другі справа)*

Адным з асноўных накірункаў выхаваўчай работы ў савецкі час было інтэрнацыянальнае выхаванне. Дзеля гэтага паўсюдна ствараліся Клубы інтэрнацыянальнай дружбы, якія спрыялі ўмацаванню сяброўскіх адносін паміж рэспублікамі Савецкага Саюза і ўсталяванню такіх адносін з замежнымі краінамі.

У лістападзе 1987 года былі складзеныя дамовы аб дружбе і супрацоўніцтве паміж

зямляцтвамі замежных студэнтаў і камсамольскімі арганізацыямі прамысловых прадпрыемстваў і арганізацый горада. Гэта рабіла жыццё замежных студэнтаў цікавым і разнастайным. Безумоўна, галоўнай справай была вучоба. Сярод афрыканскіх студэнтаў былі пераможцы і прызёры рэспубліканскіх прадметных алімпіяд «Студэнт і навукова-тэхнічны прагрэс», конкурсаў па спецыяльнасці, студэнцкіх канферэнцый (Эфрэм Рудахунга, Даніэль Мусаб'емунгу, Гілерме Массанга).

Спалучаючы вучобу з актыўнай грамадска-палітычнай дзейнасцю, замежныя студэнты ўдзельнічалі ў культурна-масавых, спартыўных мерапрыемствах.

У савецкія часы кожная навучальная ўстанова мела клуб інтэрнацыянальнай дружбы (КІД). КІДаўцы вельмі часта запрашалі замежных студэнтаў нашай навучальнай установы на свае мерапрыемствы ў школы, вучылішчы, тэхнікумы.

Вечары інтэрнацыянальнай дружбы, прысвечаныя нацыянальным святам, памятным датам у развіцці ўсіх краін, сталі ў НПІ традыцыйнымі з 1987 года. Іх удзельнікамі былі і замежныя студэнты, якія навучаліся ў Віцебскім ордэна Дружбы народаў медыцынскім інстытуце.

Актыўны ўдзел прымалі замежныя студэнты ў мастацкай самадзейнасці не толькі інстытута, але і ў горадзе. Ракутубе Мадэст, Іназ Серж, Шабан Холед Ахмед, Гассан Махамед і іншыя прынялі ўдзел у гарадскім канцэрце, прысвечаным 70-годдзю Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі.

З вялікай цікаўнасцю ставіліся замежныя студэнты да вывучэння гісторыі СССР, яе культуры, мастацтва. З гэтай мэтай для іх арганізоўваліся шматлікія экскурсіі ў Маскву, Ленінград, Кіеў, Адэсу, Рыгу, Вільнюс, Ерэван, Тбілісі.

Сотні студэнтаў з Афрыкі, Блізкага Ўсходу, Лацінскай Амерыкі, Індыі, атрымаўшы дыпломы аб вышэйшай адукацыі і вярнуўшыся ў свае краіны, з цеплынёй успамінаюць студэнцкія гады, праведзеныя ў Наваполацку. Адзін са студэнтаў з Камеруна, Моіс Мендуа, 6 сакавіка 1992 года надрукаваў у гарадской газеце «Хімік» пранікнёны верш, прысвечаны наваполацкім жанчынам:

Улыбайся, Новополочанка, ты красива.
Солнце только и ждёт твою улыбку,
чтобы освещать её.
Луна, чтобы появляться.
Звёзды ждут твоего приказа,
чтобы исполнять твои капризы.
Когда ты улыбаешься, бог тоже улыбается.
Ты просто великолепна!
Улыбайся, Новополочанка, ты красива.
Когда ты улыбаешься, птицы на небе
поют свои самые дивные мелодии.
Когда ты улыбаешься, безнадёжные сердца
видят свет на горизонте,
надежду, потерянную в былые времена.
Когда ты улыбаешься, цветы расцветают.
Ты просто великолепна!
Улыбайся, Новополочанка, ты красива.
Когда ты грустишь, зима становится холоднее,
снег превращается в лёд,
птицы в небе молчат,
деревья в лесу теряют свою листву,
природа мгновенно замирает.
Ты просто великолепна!
Улыбайся, Новополочанка, ты красива.
Стучи – тебе откроют,
проси – тебе всё отдадут,
плачь – тебя утешат.
В твоей воле – самые срочные приказы.

У тебя улыбка, открывающая все окна и двери,
от неё зависит настроение народа.
Ты просто великолепна!

У 1993 г. НПІ пераўтвараецца ў Полацкі дзяржаўны універсітэт. ПДУ становіцца значным культурным цэнтрам рэгіёна. І не толькі таму, што адукацыя, якую атрымліваюць тысячы маладых людзей, з'яўляецца неад'емнай часткай культуры. Ва універсітэце створаны ўмовы як для павышэння ўзроўню адукаванасці, так і для гарманічнага, духоўнага, творчага развіцця маладых людзей.

«З першага курса ў адукацыю, навуку, творчасць» – штогод такая выстава сустракае першакурснікаў і задае адпаведны тон іх далейшага студэнцкага жыцця...

На чым грунтуецца выбар абітурыентам той альбо іншай навучальнай установы? Першаснае ў гэтым выбары – будучая прафесія. Але немалаважнымі з'яўляюцца і шмат іншых фактараў. Не апошні з іх – знешні і ўнутраны выгляд навучальнай установы.

У часы Наваполацкага політэхнічнага інстытута існаваў, па сутнасці, адзін корпус па вул. П. Блахіна, 29, які быў пабудаваны ў адпаведнасці з нормамі савецкага часу, па тыповым праекце. Унутранае аздабленне было стандартным і несла ў сабе наглядную агітацыю па прапагандзе рэвалюцыйных, баявых, працоўных традыцый, дасягненняў у навуцы і тэхніцы.

Новы корпус політэхнічнага інстытута напачатку не адрозніваўся ад старога корпуса. Знешні від прынцыпова змянілі прыбудаваныя пазней будынкі бібліятэкі і сацыяльна-інфармацыйнага цэнтра ПДУ, якія значна ўзбагацілі архітэктуру Наваполацка.

Змяніўся характар і ўнутранага аздаблення навучальнай установы. Мастацкае афармленне новага корпуса выканалі наваполацкія мастакі Уладзімір Гавазюк і Уладзімір Шаппо.

Аўтар велічнага пано на сценах прасторнага файе – Уладзімір Іванавіч Гавазюк, сябра Беларускага саюза мастакоў. Ён працуе ў галіне манументальна-прыкладнога мастацтва. «Лёс маёй зямлі» («Лёс Беларусі», «Лёс маёй Полаччыны») – такую ўмоўную назву даў мастак сваёй працы. Левая частка пано прысвечана вялікім асветнікам Беларусі. На светлую сонечную дарогу выходзяць з Велічнай Брамы Ведаў Васіль Цяпінскі, Сімяон Полацкі, Еўфрасіння Полацкая і Францыск Скарына. Позірк Скарыны скіраваны ўдалячынь, як у будучыню, ён нібыта назірае за новым пакаленнем студэнтаў – сваіх прыхільнікаў і паслядоўнікаў. У цэнтры кампазіцыі – разгорнутая кніга – сімвал ведаў, якая лунае на чырвонай стужцы.

Правая частка пано працята ідэяй тварэння. Ад першых стваральнікаў Сафійскага сабора, будаўніка Спаса-Прэабражэнскай царквы Іаана, творцы беларускай рэліквіі – крыжа для Еўфрасінні Полацкай – Лазара Богшы пашыраецца стваральная праца, якая ператварае маленькі Полацк (план горада ў правым ніжнім кутку) у калыску беларускай дзяржаўнасці, культуры і асветы.


У. Гавазюк. Лёс маёй зямлі (фрагмент)

Цэнтральная частка пано раскрывае сутнасць цяжкага гістарычнага шляху беларускага народа. Вялікі круг сонца (у цэнтры) закрываюць трывожныя чырвоныя птушкі – сімвалы вайны і бяды. На імклівых конях ляцяць воіны, гатовыя



У. Гавазюк. Стваральнікі

ахвяраваць жыццё дзеля свабоды і незалежнасці роднай зямлі. Сутнасць жыцця – мацярынства і прадоўжанне роду (жанчына з дзіцяткам), мірная стваральная праца. Таму і ляцяць белыя птушкі – сімвал добрай надзеі.

Пано «Лёс маёй зямлі» выканана ў складанай і дарагой тэхніцы энкаўстыкі – гарачага васковага жывапісу. Матэрыялам, які звязвае фарбы, служыць тут адбелены пчаліны воск. Уся складанасць працы заключаецца ў тым, што воск на малюнак неабходна нанасіць толькі ў гарачым стане. І без памочніка тут не абыйсціся. Уладзіміру Іванавічу дапамагаў у гэтай справе наваполацкі мастак Сяргей Пятровіч Прывада.

У.І. Гавазюк з'яўляецца таксама аўтарам вітража «Стваральнікі», размешчанага ў навуковай бібліятэцы універсітэта. Перапісчык (злева) і Кнігадрукар (справа) ствараюць вечнае.

Мастацкую задумку У.І. Гавазюка ажыццявіў вопытны вітражыст з Полацка Дзмітрый Кірылавіч Каралёў. Ён па-мастацку скампанаваў кускі рознакаляровага шкла, класічным спосабам замацаваў іх свінцовым пераплётам-каркасам і такім чынам выявіў натхнёныя фігуры Стваральнікаў.

У.І. Гавазюк размаляваў асобныя дэталі эпаксіднымі смоламі, надаючы вітражу завершаную выразнасць. Мастацкія і вобразныя ўласцівасці вітража заснаваны на эфекце празрыстасці шкла. Вітраж «Стваральнікі» нібыта свеціцца мяккімі залаціста-жоўтымі, карычневымі танамі, што прыдае велічнасць, урачыстасць сюжэту. Над светлым Храмам духоўнасці, культуры і навукі схіліліся Перапісчык і Друкар, ля ног якіх галінка дуба – сімвал сілы і перамогі справы, якой яны прысвяцілі жыццё.

Супольнай працай У. Шаппо (аўтар) і У. Гавазюк ўпрыгожылі сцены бібліятэкі вялізнымі (2,10 х 8 м) мастацкімі карцінамі-пано. Для кожнае залы быў распрацаваны асобны вобраз прыроды Паазер'я ва ўсёй яе прыгажосці. Блакітна-белай паўстае перад намі «Зіма», блакітна-зялёнай – «Вясна», сонечна-жоўтым, сінім і зялёным – «Лета», яркай чырвона-аранжавай – «Восень».

У адзіным мастацкім стылі выканалі гэтыя мастакі аздабленне блока грамадскіх мерапрыемстваў інтэрната № 4 ПДУ. Мастацкія пано, скульптуры з тэмамі космаса, зямлі, маладосці ўпрыгожылі гэты комплекс.



У. Шаппо. Зіма



*У. Шаппо. Восень*



*У. Шаппо. Вясна*



*У. Шаппо. Лета*

26 верасня 2002 года адбылося адкрыццё сацыяльна-інфармацыйнага цэнтра ПДУ з удзелам ансамбля камернай музыкі ПДУ, духавога аркестра музвучылішча.

Галоўная культурная падзея Полацкага дзяржаўнага універсітэта – урачыстая перадача будынкаў былога Полацкага езуіцкага калегіума (акадэміі) у падпарадкаванне Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь адбылася 21 лютага 2003 года. Гэтай падзеі папярэднічалі гады складаных і працяглых перамоваў міністэрстваў, ведамстваў, выканаўчых камітэтаў розных узроўняў. У іх былі ўцягнуты выдатныя дзеячы культуры Беларусі. Немагчыма было зрабіць больш, чым зрабіў у гэтым працэсе былы рэктар універсітэта, прафесар Эрнст Міхайлавіч Бабенка.


ВЯРХОЎНЫ САВЕТ БССР
КАМІСІЯ ПА АДУКАЦЫІ, КУЛЬТУРЫ І ЗАХАВАННЮ ГІСТАРЫЧНАЙ СПАДЧЫНЫ

ВЕРХОВНЫЙ СОВЕТ БССР
КОМИССИЯ ПО ОБРАЗОВАНИЮ, КУЛЬТУРЕ И СОХРАНЕНИЮ ИСТОРИЧЕСКОГО НАСЛЕДИЯ

24 красавіка 1992 г.

Міністру адукацыі Рэспублікі Беларусь Гайдукевічу В.А.

На №156-02/07 АД 9.04.92 г.

Копія: Віцебская вобл., г. Наваполацк, Політэхнічны інстытут Рэктару Э.М.Бабенку

Паважаны Віктар Анатольевіч!

[illegible]

З павагай!

Старшыня Камісіі Н.С.Гілевіч

*Адно са сведчанняў вырашэння пытання аб вяртанні гістарычных будынкаў ПДУ*



*Рэканструяваны корпус былога езуіцкага калегіума (акадэміі)*

Урачыстасць па перадачы карпусоў адбылася ў Сафійскім саборы – сімвале духоўнасці і культуры Полаччыны і Беларусі. У зале храма прысутнічалі дзяржаўныя кіраўнікі, вядомыя палітыкі, дзеячы культуры (пісьменнік Уладзімір Арлоў, археолаг Сяргей Тарасаў, паэт Генадзь Бураўкін і інш.), замежныя госці, вайскоўцы начале з міністрам абароны РБ, выкладчыкі і студэнты ПДУ.

Верш Генадзя Бураўкіна, прачытаны аўтарам на ўрачыстым сходзе, быў пакладзены на музыку Віктарам Малых. Менавіта гэты тэкст стаў афіцыйным гімнам універсітэта.

Не розум Полацка віною,
Што пасля столькіх зім і лет
Паўстаў нарэшце над Дзвіною
Наш Полацкі універсітэт,

Што воляю чужых законаў
Для іншых нацый і дзяржаў
Сваіх Ньютонаў і Платонаў
Наш край наддзвінскі нараджаў.

Ім лёс такі гаротны выпаў,
Што ў храмы дальнія ішлі
Ад родных рэк, бароў і выспаў,
Ад цёплай матчынай зямлі...

Няхай жа здзейсняць сёння ўнукі
Усё, чаго не здолеў дзед,
Каб горда ўзняўся храм навукі –
Наш Полацкі універсітэт!

Хай будуць навякі вядомы,
Як неразменная казна,
З пячаткай Полацкай дыпломы –
Духоўнасці высокі знак!

Кладзі да славы пуцявіны,
Нясі свае адкрыцці ў свет,
Нашчадак мудрага Скарыны –
Наш Полацкі універсітэт!

Больш за два гады доўжылася рэканструкцыя будынкаў, перададзеных універсітэту.

Заснаваны ў 1581 г., Полацкі езуіцкі калегіум замыкаў Парадную плошчу Полацка і ствараў традыцыйны сілуэт горада XVIII – XIX стст. Са шматлікіх будынкаў, якія ўключаў у сябе комплекс, захавалася няшмат. У сувязі з тым, што рэстаўрацыя ўцалелых будынкаў немагчымая, праводзіцца іх рэканструкцыя. У працэсе рэканструкцыі захаваны знешні архітэктурны выгляд будынкаў і, па магчымасці, інтэр'еры. Пакінуты фрагменты старадаўніх будаўнічых элементаў.

1 верасня 2005 г. адбылася вялікая святочная праграма, прысвечная вяртанню студэнцтва ў Полацк. З гэтага часу пачынаецца навучанне ў Полацку. У рэканструяваных карпусах універсітэта пачалася дзейнасць гісторыка-філалагічнага факультэта ПДУ.

Першай стацыянарнай выставай, што атрымала сталую прапіску ў старых сценах гісторыка-філалагічнага факультэта ПДУ, была выстава дыпломных работ студэнтаў мастацка-графічнага факультэта Віцебскага дзяржаўнага універсітэта імя П.М. Машэрава.

19 снежня 2006 года адкрылася пастаянная выстава паштовак з гістарычнымі выявамі Полацка з калекцыі Уладзіміра Ліхадзедава. Выстава рэпрадукцый паштовак з відамі Полацка XIX – пачатку XX стст. заняла два паверхі будынка гісторыка-філалагічнага факультэта. У памяшканні чытальнай залы бібліятэкі змешчаны рэпрадукцыі карцін са знакамітых музеяў свету, прысвечаных падзеям вайны 1812 г. у Полацку.

У канферэнц-зале гісторыка-філалагічнага факультэта знаходзіцца яшчэ адна знакавая, даступная для наведвання выстава карцін заслужанага дзеяча мастацтваў Беларусі, ганаровага грамадзяніна г. Полацка Нінэль Іванаўны Шчаснай. Мастачка даўно марыла аб тым, каб яе творчасць была шырока даступна і дэмакратычна прадстаўлена ў горадзе, дзе яна нарадзілася. 1 чэрвеня 2007 года ў канферэнц-зале гісторыка-філалагічнага факультэта ПДУ адбылося адкрыццё выставы карцін Н.І. Шчаснай.



*Нінэль Іванаўна Шчасная падчас сустрэчы са студэнтамі*



*Карціны Н. Шчаснай*

Увогуле, часовыя выставы мастакоў пастаянна прапісаліся ў ПДУ і адбываюцца ў выставачнай зале бібліятэкі. У розныя гады з пачатку 90-х гг. тут праходзілі выставы знакамітых мастакоў А.М. Кашкурэвіча, В.К. Любавіцкага, А.А. Скавародкі, С.А. Цімохава, Л. і У. Кавальчукоў, В.М. Лук'янава, У.Дз. Шаппо і інш. Правядзенне падобных выставаў стала значнай падзеяй у культурным жыцці Наваполацка, яны карыстаюцца папулярнасцю сярод мастакоў, якія лічаць за гонар зрабіць выставу ў ПДУ.

Знамянальнай падзеяй у жыцці ПДУ сталася адкрыццё 25 студзеня 2008 г. Дошкі гонару Полацкага дзяржаўнага універсітэта. Яна ўключае ў сябе чатыры стэнды: «Яны стаялі ля вытокаў», «Гонар універсітэта», «Лепшыя факультэты і кафедры», «Імянныя стыпендыяты».

1 верасня 1995 г. у Полацкім дзяржаўным універсітэце атрымала прапіску творчая майстэрня «Зьніч». Як незалежная канцэртна-тэатральная арганізацыя «Зьніч» пачала сваю дзейнасць у верасні 1993 г. Узначаліў яе Анішчанка Сяргей Іванавіч. «Зьніч» дала шэраг канцэртаў, з поспехам здзейсніла пастаноўку «Эміграцыя, – альбо гульня на звонкі», удзельнічала ў Міжнародным фестывалі «Жемчужина Черного моря» (Крым, Феадосія), ініцыявала дзіцячы музычны фестываль «Халі-хало», прымала ўдзел у аднаўленні бардаўскай песні і правядзенні фестываляў «Пока горит свеча». За кароткі час ТМ «Зьніч» заваявала сімпатыю не толькі ў Наваполацку, але і ў іншых гарадах Беларусі.



*Надзея Каюкала ў спектаклі «Барбара»*

Зорным часам «Зьніча» можна лічыць пастаноўку музычна-эпічнага спектакля «Барбара», прэм'ера якога адбылася 11 красавіка 1997 года.

Ідэю спектакля выказаў Сяргей Анішчанка, як імкненне звароту да забытых старонак гісторыі Беларусі. Сцэнар напісала Надзея Каюкала, на той час студэнтка 2-га курса гісторыка-філалагічнага факультэта ПДУ (зараз выкладчыца кафедры замежных моваў). Над пастаноўкай Сяргей і Надзея працавалі разам.

У 1997 годзе, летам, у Наваполацку ўзнікае рыцарскі клуб «Жалезны воўк», узяўшы сваю назву з беларускай гістарычнай міфалогіі. Аб адказнасці падыхода да гэтай справы сведчыць тое, што на шматлікіх фестывалях, у якіх прымаў удзел «Жалезны воўк», адзначалася лепшая экіпіроўка нашых рыцараў, дасканалыя кальчугі, латы, шаломы, зброя. Так было, напрыклад, на грандыёзным Фэсце сярэднявечнай культуры «Навагрудак-2000», у якім прымалі ўдзел 500 рыцараў з Беларусі, Польшчы, Эстоніі, Латвіі і Расіі. За час свайго існавання сябры «Жалез-

нага воўка» арганізоўвалі самі і прымалі ўдзел у самых розных мерапрыемствах (выставы, паказальныя баі, культурніцкія акцыі) у Наваполацку, Полацку і іншых беларускіх гарадах, а таксама ў Міжнародных рыцарскіх фестывалях у Чэхіі, Польшчы, Літве, Расіі. Таксама клуб прымаў удзел у здымках фільма «Начны дазор» (Масква).



*Рыцары клуба «Жалезны воўк» пад Грунвальдам*

У 1998 годзе ва універсітэце ствараецца калектыў новай эксперыментальнай творчай майстэрні «CREDO». У яе асноўны склад увайшлі былыя «зьнічаўцы». Ідэю аб'яднання «CREDO» і «Жалезнага воўка» дзеля стварэння велічнага спектакля, прысвечанага Гедыміну, у якім свае творчыя магчымасці маглі прадэманстраваць абодва калектывы, выказаў Сяргей Анішчанка. Акцёры эксперыментальнай творчай майстэрні «CREDO» і рыцары ваярска-гістарычнага клуба «Жалезны воўк» стварылі гістарычна-эпічны спектакль «Гедымін» (аўтары ідэі Юрый Усціновіч, Андрэй Мікалаеў і Аляксей Галубовіч).



*Сцэна са спектакля «Гедымін»*

Пастаноўка спектакля адбылася 14 красавіка 2000 г. у актавай зале ПДУ. Пасля гэтага спектакль «Гедымін» пачынае трыумфальнае шэсце па Беларусі: праз два тыдні ён зноў ставіцца ў ПДУ, праз месяц у Беларускім дзяржаўным педагагічным інстытуце (Мінск), 10 чэрвеня – на сцэне Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага тэатра імя Я. Коласа (Віцебск) – магчыма, упершыню аматарскі калектыў выступае на прафесійнай сцэне.

Высокую адзнаку спектакль атрымаў ад вядомага беларускага рэжысёра Віктара Шавялевіча.

У час, калі гісторыка-філалагічны факультэт рыхтаваўся да пераезду ў Полацк, група ініцыятараў з творчай майстэрні «CREDO» і ваярска-гістарычнага клуба «Жалезны воўк» ствараюць новы творчы калектыў «Полацкі зьвяз». Тэатр гістарычнага строю «Полацкі зьвяз» быў утвораны ў кастрычніку 2002 г. пры Цэнтры рамёстваў і нацыянальных культур г. Полацка. Кіраўнік калектыву – Юрый Усціновіч, выкладчык гісторыі Беларусі на гісторыка-філалагічным факультэце ПДУ. Свае асобныя выступленні калектыў ладзіў на працягу 2002 г. у Асвеі, Глыбокім, Дуброўне, Зэльве і інш., арганізоўваў у Краязнаўчым музеі г. Глыбокае выставу рыцарскіх даспехаў і ўзбраення пад назвай «Зброя нашых дзядоў». У 2003 г. у Віцебску, прымаючы ўдзел у праграме Славянскага базару, тэатр гістарычнага касцюма пацвердзіў званне народнага калектыву. У тым жа годзе «Полацкі зьвяз» быў задзейнічаны ў правядзенні фэстаў сярэднявечнай культуры ў Навагрудку, Нясвіжы, Заслаўі. У 2005 г. тэатр гістарычнага касцюму «Полацкі зьвяз» падрыхтаваў адметны спектакль – «Паміж гісторыяй і мрояй». Пастаноўка складаецца з пяці харэаграфічна-гістарычных мініяцюр, у якіх праз рух, музыку, танцы і пры дапамозе каскадзёрскіх трукаў і



*Сцэна са спектакля «Шлях да велічы»*

відэараду перадаюцца асобныя аспекты з гісторыі сярэднявечнай Беларусі. Прэм'ера пастаноўкі адбылася 26 лютага 2005 г. на сцэне Палаца культуры г. Полацка. На працягу 2005 г. спектакль шэсць разоў ставіўся на сцэнах Полацка, Наваполацка і Браслава, таксама некалькі разоў прадстаўляліся асобныя мініяцюры з пастаноўкі на розных гарадскіх святочных мерапрыемствах. З восені 2005 года пачалася распрацоўка новага спектакля «Шлях да велічы», прэм'ера якога адбылася на пачатку красавіка 2006 г. Увосень клуб са спектаклем «Шлях да велічы» запрасілі да ўдзелу ў III Міжнародным фестывалі студэнцкага тэатральнага конкурса «Тэатральны куфар-2006». У фестывалі ўдзельнічалі 44 тэатральныя калектывы з Беларусі, Расіі, Польшчы, Літвы, Германіі. Спектакль «Шлях да велічы» атрымаў прыз за лепшую сцэнаграфію, а Ігар Папко за ролю «Чорнага чалавека» атрымаў дыплом за лепшую мужчынскую ролю другога плана. Наступная прэм'ера тэатра гістарычнага строю – спектакль «Слова пра Усяслава» – адбылася 7 красавіка 2007 г. Гэта была ўжо трэцяя пастаноўка тэатра.

Народны студэнцкі тэатр «АРТ» утварыўся ў кастрычніку 1999 года з прыходам рэжысёра Ганны Шэлепавай. Яго аснову склалі ўдзельнікі ўзорнага тэатральнага калектыву «Паўлінка» СШ № 9, якім дагэтуль кіравала Ганна Шэлепава: Ілля Абуховіч, Сяргей Шчарбакоў, Юлія Зэйдзіна, Аляксей Нямцоў, Сяргей Грыбаедаў, Віктар Казлоўскі.




*Калектыў «АРТ» на фестывалі маладзёжных тэатраў «Рампа» ў горадзе Днепрапятроўску*

10 студзеня 2002 года калектыву было прысвоена званне «народны». Для абароны гэтага звання рэспубліканскай камісіі быў паказаны спектакль «Я хачу жыць!» – трагікамедыя па п'есе Мікалая Эрдмана «Самагубца», прэм'ера якога адбылася 20 красавіка 2001 года. З таго часу спектакль быў паказаны яшчэ 12 разоў, яго ўбачылі жыхары Наваполацка, Мінска, Бранска, Днепрапятроўска.

22 красавіка 2005 г. спектакль «Я хачу жыць!» быў паказаны на міжнародным фестывалі маладзёжных тэатраў «Рампа» ў горадзе Днепрапятроўску (Украіна). Вынікі гэтага выступлення тэатра былі высокія. Дыпламантамі фестывалю сталі Анастасія Елукова і Алеся Беражная, лаўрэатамі фестывалю ў намінацыі «Акцёрскае майстэрства» – Альбіна Турхіна, Сяргей Шчарбакоў, Дзяніс Аўмачкін. Намінацыя «Кароль эпізоду» і дыплом лаўрэата дастаўся Дзмітрыю Лемешаву, які пад уплывам тэатра вырашыў змяніць прафесію і летам 2005 года стаў студэнтам сцэнарнага факультэта Усерасійскага Дзяржаўнага інстытута кінематаграфіі (г. Масква). Лепшую жаночую ролю другога плана выканала Ганна Шэлепава, лепшую мужчынскую ролю другога плана – Сяргей Грыбаедаў, а лепшую мужчынскую ролю – Георгій Сачкоў. Спектакль намінаваўся на прыз сімпатый гледачоў, лепшую рэжысуру, Гран-пры і атрымаў дыплом «За высокі мастацкі ўзровень спектакля». Увосень 2005 года калектыў тэатра з гэтым жа спектаклем прымаў удзел у міжнародным фестывалі «Тэатральны куфар» (г. Мінск). У выніку – намінацыя «Лепшы спектакль» і дыплом «Лепшы акцёрскі ансамбль». Артыст тэатра Дзяніс Аўмачкін быў прызнаны лепшым і атрымаў дыплом «Лепшая мужчынская роля».

15 красавіка 2005 г. у свет выйшаў яшчэ адзін спектакль – казка для дарослых «Цень» па п'есе Я. Шварца, напісанай ў 1940 г. па матывах казкі вялікага дацкага казачніка Ганса Хрысціяна Андэрсана, 200 год з дня нараджэння якога адзначалася ў красавіку.

24 лютага 2006 г. адбылася прэм'ера спектакля «Каханне. Поры года». Гэта аўтарская работа рэжысёра Ганны Шэлепавай.

У спектакль «Каханне. Поры года» ўвайшлі ўрыўкі з «Рамэа і Джульеты» У. Шэкспіра, «Антонія і Клеапатры» У. Шэкспіра, «Да поўдня ад граніцы, на захад ад сонца» Х. Муракамі, «Качынага палявання» А. Вампілава і «Ідыёта» Ф.М. Дастаеўскага.

Галоўная ідэя спектакля была дасягнута. Гледачы адчувалі пяшчоту Кахання-вясны, запал Кахання-лета, у Каханні-восені – каханне-здраду, каханне-адзіноту, а ў Каханні-зіме – каханне-слабасць.

Колькі б разоў ні праходзіў спектакль, гледачы адчуваюць першаснасць падзеі – так пераканаўча выконваюць свае ролі акцёры, раскрываючы сутнасць Кахання і Жыцця.

Наступная прэм'ера народнага студэнцкага тэатра «АРТ» – камедыйная меладрама «Чырвоны куток» па п'есе М. Разоўскага (28.02.2007).

Два лёсы – два адзіноцтвы... Саруханава, дзяўчына, жыццё ў якой не заладзілася, пачынае піць і спрабуе перавыхаваць Ліку Фёдараўну, выхавацельніцу інтэртната, жанчыну смешную са сваей верай у камунізм і калектывізм. Супрацьстаянне двух лёсаў, двух характараў у камедыйнай і трагічнай форме адбываецца на сцэне. Галоўнае, чаму вучыць гэта гісторыя – Чалавек патрэбен Чалавеку.



*Сцэна са спектакля «Чырвоны куток»*

Камедыя-фарс па п'есе М. Эрдмана «Мандат» аб падзеях 20-х гадоў XX стагоддзя – трагікамічная версія замены старога рэжыму на новы,

савецкі. Нават у свеце, дзе ўсё купляецца і прадаецца, ёсць мажлівасць заставацца чалавекам: галоўнае – умець радавацца чужому шчасцю і суперажываць чужой бядзе – гэта галоўная ідэя спектакля. Пастаноўка «Мандата» выдзяляецца сярод пастановак «АРТ» сваёй масавасцю – у ёй каля двух дзесяткаў дзеючых асоб. А яшчэ ў спектаклі шмат неардынарных персанажаў, музычна-харэаграфічных замалёвак. Прэм'ера прайшла з аншлагам.

У 2008 годзе рыхтуецца два прем'ерных спектаклі па п'есах Аляксея Арбузава і Морыса Метэрлінка. Выбар аўтараў пацвярджае, што Ганна Шэлепава, як заўжды, у творчых пошуках. А значыць, гледачоў чакаюць новыя адкрыцці, новыя пачуцці і, безумоўна, новае захапленне тэатральным відовішчам, імя якому – «АРТ».

За час існавання тэатра пастаўлена 54 спектаклі, якія паглядзелі звыш 22000 чалавек. У скарбонцы тэатра каля 40 грамат і дыпломаў. Сярод іх дыпломы «За ўвасабленне і папулярызацыю класічнай драматургіі», «За актыўны ўдзел у культурным жыцці горада», «Лепшы акцёрскі ансамбль», «Прыз сімпатый гледачоў».

Камерны ансамбль Полацкага дзяржаўнага універсітэта быў створаны ў верасні 2000 года. Мэта стварэння – даць магчымасць творчай рэалізацыі студэнтам і супрацоўнікам універсітэта, павысіць агульны культурны ўзровень, прыцягнуць цікаўнасць да шэдэўраў сусветнага музычнага мастацтва.

Кіраўнік ансамбля – Т.В. Шром, магістр мастацтваў, выпускніца Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі (клас І.В. Галачкінай, Л.М. Каліноўскай). У склад калектыву ўвайшлі студэнты і выкладчыкі універсітэта, якія маюць пачатковую і сярэдне-спецыяльную музычную адукацыю. У розны час у склад ансамбля ўваходзілі студэнты ПДУ: фінансава-эканамічнага факультэта – Я. Бальшакова (фартэпіяна, ударныя), юрыдычнага факультэта – В. Папоўскі (скрыпка), гісторыка-філалагічнага факультэта – К. Бурак (фартэпіяна), Р. Арол (віяланчэль), а таксама навучэнцы Наваполацкага музычнага вучылішча. За ўвесь час існавання ансамбля (з 2000 г. па 2007 г.) нязменнымі ўдзельнікамі творчага калектыву з'яўляюцца выкладчык кафедры эканамічнай тэорыі І.М. Шульжэнка-Суханава (флейта) і Т.В. Шром (скрыпка, альт, фартэпіяна).



*Салісткі камернага ансамбля Ірына Шульжэнка-Суханава і Таццяна Шром*

Першае выступленне ансамбля адбылося ў снежні 2000 года на навагодняй вечарыне ў актавай зале ПДУ. Ансамбль прымаў удзел у студэнцкіх святочных канцэртах, прысвечаных пачатку навучальнага года, Дню студэнта, 8 Сакавіка, дням факультэтаў; у традыцыйных гарадскіх Калядных вечарынах у дзіцячай музычнай школе і ў мерапрыемствах фестывалю «Студэнцкая вясна-2004» у Віцебску; «суправаджаў» музыкай вернісажы ў выставачнай зале бібліятэкі ПДУ; з'яўляецца ўдзельнікам праекта «Школа лідэра». Ансамбль супрацоўнічае з Клубам сяброў культуры «Вытокі», прымаючы ўдзел у музычных вечарынах у выставачнай зале бібліятэкі імя Я. Коласа Наваполацка.

Гісторыка-культурны клуб «Княжыч» быў створаны ўвосень 1995 г. па ініцыятыве выкладчыкаў кафедры гісторыі і сацыялогіі ПДУ. Працу сваю клуб распачаў пры Наваполацкім Цэнтры рамёстваў і традыцыйнай культуры. Асноўнымі накірункамі дзейнасці «Княжыча» з'яўляюцца вывучэнне і папуляры-

зацыя традыцыйнай культуры, збор фальклору, аваладанне манерай архаічнага спеву і рэканструкцыя традыцыйных святаў.



*Гурт архаічных спеваў «Княжыч»*

За час існавання на рахунку «Княжыча» – штогадовая арганізацыя традыцыйных святаў («Каляды», «Жаніцьба Цярэшкі», «Гуканне вясны», «Купалле»), этнаграфічныя экспедыцыі ў розныя раёны Віцебшчыны, удзел у разнастайных фестывалях фальклору і сярэднявечнай культуры як на Беларусі, так і за яе межамі («Купальскі парад» у Польшчы, 2000 г; фестываль «Старадаўні Нясвіж», 2003 г.; фестываль «Беларусь – мая песня», 2004, 2005 г; фестываль «Купалле ў цэнтры Еўропы», 2006 г. і інш). У 2006 г. калектыў атрымаў званне народнага.

Імкнучыся далучыць студэнтаў і супрацоўнікаў нашай навучальнай установы да шэдэўраў сусветнай музычнай класікі, паказаць узоры якаснай сучаснай музыкі, на сцэну НПІ-ПДУ запрашаліся лепшыя выканаўцы. Гэта былі самыя розныя музычныя калектывы: ад вялікага сімфанічнага аркестра «Маладая Беларусь» да калектыва джазавай музыкі «Полацк-Anima-квартэт»; ад акадэмічнага гучання беларускіх народных песень у выкананні праслаўленай Дзяржаўнай акадэмічнай харавой капэлы імя Р. Шырмы да архаічнага спеву нашага «Княжыча». А яшчэ сольныя канцэрты майстроў, якія выдатна валадаюць музычным інструментам, маюць непаўторны голас... Слухачы захапляліся непаўторным талентам сольных выканаўцаў. Сярод іх былі піяністы І. Алоўнікаў, Т. Старчанка, А. Паначэўны; скрыпачы В. Зяленін, Т. Талстых; К. Шароў (клавесін), В. Гарноўская (віяланчэль); вакалісты Т. Сапегіна (мецца-сапрана), Г. Паўлёнак, Л. Кажарскі, В. Буры, А. Шылава, У. Громаў. Гэтая канцэртная дзейнасць адбываецца ў межах клуба музычнага развіцця «Эўтэрпа», якім кіруе ўжо не адзін год музыказнаўца, выкладчыца Навапалацкага музычнага вучылішча Алена Навумаўна Васільева. Яна валодае вялікім сцэнічным вопытам, шырокімі ведамі па мастацтвазнаўству. Яркая, эмацыянальная мова і захапляльны паток інфармацыі дазваляюць ёй наладзіць кантакт з любой аудыторыяй, прабудзіць у слухачоў інтарэс да сур'ёзнай музыкі. Галоўная задача клуба – выхаванне мастацкага густу маладога пакалення праз «жывыя» музычныя ўражанні, а таксама стварэнне ўмоў для творчай рэалізацыіі. Характэрная рыса ўсіх канцэртаў, якія праводзіліся клубам, – спалучэнне музычнай падзеі і музыказнаўчага каментарыя да яго. Прасветленасць пачуццяў, душэўную дабрыню, адухатварэнне адчувалі тыя, хто бываў на канцэртах у актавай зале НПІ – ПДУ.



*Вядучая музычных канцэртаў у ПДУ А. Васільева*

Шмат год музычная гасціная нашай навучальнай установы расчыняла дзверы для ўдзельнікаў фестывалю аўтарскай песні «Пока горит свеча» («Гори, свеча!»). 14 снежня 1995 г. адбыўся першы фестываль. На ім былі закладзены традыцыі правядзення падобных фестываляў. Адметнасцю першага фестывалю стала тое, што на яго былі запрошаны ўдзельнікі першага клуба самадзейнай песні «Свеча», які існаваў у НПІ. Права адкрыцця фестывалю было дадзена яго заснавальніку Аляксею Лупа-



*Удзельнікі фестывалю бардаўскай песні*

ву. Дыплом першай ступені атрымала Таццяна Селязнёва (студэнтка 2-га курса факультэта эканомікі і права), лаўрэаты другой і трэцяй ступені Аляксей Ткачэнка (5-ты курс машынабудаўнічага факультэта) і Алена Штукіна (4-ты курс санітарна-тэхнічнага факультэта).

Поспех фестывалю бардаўскай песні быў такім вялікім, што яго пачалі праводзіць штогод да 2000 г. Так было, пакуль ён не стаў Наваполацкім адкрытым фестывалем аўтарскай песні «Гори, свеча!», які ўпершыню адбыўся 25 – 27 красавіка 2001 года. Арганізатарамі фестывалю з'яўляліся Полацкі дзяржаўны універсітэт і Віцебскі клуб аўтарскай песні «Пошук» начале з Таццянай Ліхавідавай. У конкурснай праграме прынялі ўдзел прадстаўнікі Наваполацка, Полацка, Віцебска і Мінска.

З вялікім поспехам прайшоў у сакавіку 2002 года канцэрт бардаўскай песні, на якім гучалі песні Б. Акуджавы, Ю. Візбара, С. Нікіціна ў выкананні «Тры А», які прыехаў да нас з Мінска. З дапамогай гэтага калектыва ў сакавіку 2004 г. адбыўся Рэспубліканскі фестываль аўтарскай песні «Гори, свеча!», які стаў адборачным турам Міжнароднага фестывалю «Петербургский аккорд». На гэты фэст сабраліся сорак бардаў са ўсёй Беларусі. У журы працавалі Валянцін Віхараў з Пецярбурга, Аляксандр Іваноў з Калінінграда, якіх можна назваць класікамі жанру, і беларускі дуэт – Галіна і Барыс Вайханскія – вядомыя не толькі на радзіме, але і па ўсёй Еўропе. У праграму фестывалю ўвайшлі творчыя майстэрні, на якіх прафесіяналы, выканаўцы з вялікім вопытам, дзяліліся таямніцамі жанру бардаўскай песні ў вершаскладанні, музычным і сцэнічным майстэрстве. Тое, што адбывалася ў фестывальныя дні на сцэне, сведчыла аб вялікай колькасці прыхільнікаў бардаўскай песні і яе вялікай папулярнасці як сярод моладзі, так і сярод старэйшага пакалення ПДУ.

У сценах ПДУ ладзіліся творчыя сустрэчы вядомых літаратараў: паэта і журналіста Навума Гальпяровіча («На востраве душы», 18 кастрычніка 1996 г.), старшыні Саюза пісьменнікаў Вольгі Іпатавай (22 кастрычніка 2002 года) і інш., неаднаразова – з самадзейнымі літаратарамі гг. Полацка і Наваполацка. У бібліятэцы ПДУ рэгулярна праводзіліся чытацкія канферэнцыі з абмеркаваннем літаратурных навінак, ладзіліся сустрэчы з літаратарамі мясцовых суполак «Наддзвінне», «Крыніцы», «Таварыства вольных літаратараў» і «Полоцкая ветвь». Удзельнікамі падобных сустрэч з чытачамі ў розныя часы былі Р. Барадулін, Г. Бураўкін, С. Законнікаў, У. Арлоў, П. Васючэнка, Л. Дранько-Майсюк, Г. Кірылаў, Ю. Касцюк, Л. Неўдах, Н. Гальпяровіч, І. Жарнасек, А. Аркуш, І. Сідарук.

У 1998 годзе на базе кафедры беларускай і рускай моў была створана кафедра сусветнай літаратуры і культуралогіі. Загадчык кафедры, прафесар А.А. Гугнін з'яўляецца вядомым вучоным-германістам. Канферэнцыі, на якія прафесар А. Гугнін штогод збірае айчынных і замежных літаратуразнаўцаў, літаратараў, зрабіліся буйной падзеяй у навуковым ды культурным жыцці краю. А.А. Гугнін вядомы і як паэт. Вакол таленавітага вучонага-літаратуразнаўцы гуртуецца творчая моладзь.

Выкладчыца кафедры Т. Лук'яненка ўзначальвала студэнцкі клуб «Вытокі», дзе ладзіліся літаратурныя сустрэчы. З уласнай творчасцю на пасяджэннях клуба выступалі выкладчыкі кафедры А. Зянько, С. Красоўскі, Л. Міхновіч, Т. Багарадава, артыстычна дэкламіраваў творы беларускіх і расійскіх паэтаў загадчык кафедры В. Мятла.

На кафедры айчыннай і ўсеагульнай гісторыі творчай дзейнасцю займаюцца выкладчыкі: У. Лобач – аўтар медытатыўнай лірыкі, эсэіст і празаік, В. Мішына – паэтэса, Ю. Усціновіч – паэт.

На кафедры сацыяльна-гуманітарных дысцыплін, якая існуе з 2006 года, працуюць Р. Ларына – паэтэса, І. Андрэева – лірык, аўтар кнігі вершаў, С. Шыдлоўскі – эсэіст, літаратурны крытык.

Да сталага пакалення творцаў належыць А. Ніякоўская, былая выкладчыца кафедры філасофіі і культуралогіі, паэт, перакладчык, эсэіст, зрабіўшая гонар Полацку сваёй інтэлектуальнай прозай. На перакладчыцкай ніве мае поспех былы выкладчык кафедры замежных моваў Л. Баршчэўскі, паэт, знаўца больш дзесяці моваў.

Не толькі прадстаўнікі гуманітарных навук, але і «фізікі» маюць свой унёсак у творчую біяграфію ПДУ. Так, прафесар Ф. Панцялеенка пісаў пранікнёную беларускамоўную лірыку. Кандыдат тэхнічных навук В. Грынёў выдаў кнігу вершаў «Струны» (на расійскай і ўкраінскай мовах).

На гісторыка-філалагічным факультэце ў другой палове 90-х існавала літаратурнае студэнцкае аб'яднанне «Брама», якім кіраваў полацкі літаратар Н. Гальпяровіч. Да «Брамы» належалі А. Аляксандраў, А. Храпавіцкі ды іншыя. Living Рознабаковы талент студэнта-юрыста В. Дзевятоўскага выявіўся не толькі ў высокіх спартыўных дасягненнях, але і ў галіне патрыятычнай лірыкі. Аўтарскі зборнік вершаў выйшаў у былой студэнткі гісторыка-філалагічнага факультэта В. Сакалоўскай, якая колькі разоў узнагароджвалася прызамі глядацкіх сімпатый на рэгіянальным конкурсе «Паэт-артыст», што ладзіцца БЛС «Полацкая ветвь». Прафесійна літаратурнай дзейнасцю займаецца былы выхаванец ПДУ, вядомы беларускі празаік, аўтар шматлікіх кніг Вінцэсь Мудроў. Аўтарам некалькіх паэтычных зборнікаў з'яўляецца колішняя студэнтка ПДУ Іна Снарская. На полацкай зямлі пачалі пісаць на славянскіх мовах замежныя студэнты, напрыклад, ураджэнец Камеруна Морыс Мендуа.

Сучаснае літаратурнае жыццё студэнцтва знаходзіць сваё выяўленне на старонках студэнцкай газеты «Настежь», у творчасці аб'яднання «Крылы». Першыя літаратурныя крокі моладзь робіць з дапамогай конкурсу творчасці першакурснікаў «Дэбют».

Творчасць полацкіх універсітэцкіх аўтараў займела прызнанне ў айчыннай чытацкай аўдыторыі, аб чым сведчаць публікацыі ў аўтарытэтных часопісах «Маладосць», «Нёман», «Немига литературная», «Западная Двина», «ARCHE», «Калоссе», «Правінцыя», зборніках «Полоцкий альбом» (Санкт-Пецярбург, 2004), «Анталогія сучаснага беларускага мыслення» (Санкт-Пецярбург, 2003), газетах «Чырвоная змена», «Літаратура і мастацтва», «Культура», «Знамя юности», «Вестник культуры», «Наша Ніва».

Наваполацкі інтэлектуальны клуб пры Полацкім дзяржаўным універсітэце як самастойнае аб'яднанне ў складзе студэнцкага клуба ўзнік у 1994 годзе пад кіраўніцтвам Мікалая Васільева. Сёння Наваполацкі інтэлектуальны клуб «Рубон» – гэта добраахвотнае аб'яднанне грамадзян, створанае паводле прынцыпаў самастойнасці і агульнасці інтарэсаў з мэтай развіцця, папулярызацыі і падтрымкі інтэлектуальных гульняў. Асноўны напрамак дзейнасці клуба – ажыццяўленне шэрагу праектаў, з якіх галоўны – рэгулярны чэмпіянат Полацка і Наваполацка па інтэлектуальных гульнях (гэтак званых спартыўных версіях гульняў «Што? Дзе? Калі?», «Брэйн-Рынг» і «Свая гульня»).

У 1996-ым каманда «Дойлід» на чале з Дзмітрыем Салаўёвым упершыню прадставіла клуб на знешніх турнірах і заняла 3-е месца на адкрытым кубку Віцебска ў гульні «Што? Дзе? Калі?». У 1998 г. адбыўся першы Наваполацкі агульнагарадскі турнір каманд па гульні «Што? Дзе? Калі?», на якім першае месца заняла каманда студэнтаў-гісторыкаў ПДУ «Легіён» на чале з Сяргеем Міхейкам.

У падмурак работы клуба была пакладзена салідная дакументальная база: былі прынятыя статут клуба і рэгламент рэгулярнага чэмпіянату г. Наваполацка па інтэлектуальных гульнях. У 2001 годзе каманда «Пілігрым» заняла трэцяе месца па «Брэйн-Рынгу» на Міжнародным турніры «Несцерка-2001», а ў 2002 яна стала абсалютным пераможцам нацыянальнага турніра малых гарадоў – кубка «Волака і Вісека», што праводзіўся ў Ваўкавыску, а таксама заняла першае мес-




*Каманда «Пілігрым»*

ца па «Сваёй гульні» на III рэспубліканскім чэмпіянаце па інтэлектуальных гульнях «Студэнцкія гульні БДУ».

З найвышэйшых індывідуальных дасягненняў сяброў клуба варта адзначыць поспех Дзмітрыя Когана, іграка каманды BlackDeath, які ў складзе зборнай Германіі заняў трэцяе месца ў Кубку Нацый – чэмпіянаце свету па «Што? Дзе? Калі?», які праводзіўся ў 2006 годзе ў Баку (Азербайджан).

Клуб вясёлых і знаходлівых Полацкага дзяржаўнага універсітэта таксама мае трывалыя традыцыі. Адзін з першых успамінаў пра гэтую студэнцкую гульню адносіцца да 1971 года.

Па-рознаму складвалася гісторыя юмарыстычнага жанру: былі часы бурнага росквіту, а было і зацішша, але ніколі гэты жанр не знікаў. Шмат год велізарнай папулярнасцю карыстаўся «Кангрэс смеху», народжаны на будаўнічым факультэце. Бацькам, натхняльнікам і нават адным з галоўных герояў гэтай дзеі заўжды быў спачатку дэкан, а затым і прарэктар універсітэта Леанід Сцяпанавіч Турышчаў. З лістапада 1996 г. штогод праходзяць фестывалі Клуба вясёлых і знаходлівых. У 1996 – 1998 гг. фестываль насіць назву «Гудвін», з 1999 па 2002 гг. – «Февініст», а з 2003 па 2007 – адкрыты фестываль КВЗ ПДУ. Двойчы зборныя каманды універсітэта бралі ўдзел у Міжнародным фестывалі КВЗ у горадзе Сочы. Зорным часам для каманды стаў 2001 год. Зборная каманда «911» стала ўдзельніцай фестывалю Беларускай Вышэйшай Лігі КВЗ. Ад гульні да гульні крочыла наша каманда наперад. У верасні наш універсітэт прымаў паўфінальныя гульні. У лістападзе ў Мінску адбылася фінальная гульня. Каманда «911» становіцца віцэ-чэмпіёнам Беларускай Вышэйшай Лігі КВЗ, гэта Ягор Сачкоў, Дзмітрый Есаулаў, Сяргей Грыбаедаў, Ілля Абуховіч, Аляксандр Корсак, Наталля Цернавая, Сяргей Шчарбакоў, Антон Каткоўскі.



*Каманда клуба вясёлых і знаходлівых*

І сёння КВЗ нязменна карыстаецца вялікай папулярнасцю і ў студэнцкім асяроддзі, і сярод выкладчыкаў.

У апошнія гады ва універсітэцкім клубе вясёлых і знаходлівых склаўся касцяк зборнай каманды «Алімпіяда-80», якая ў студзені 2007 года ўзяла ўдзел у фестывалі КВЗ БДУ ў горадзе Мінску, паспяхова згуляла ў сезоне і стала віцэ-чэмпіёнам.

Такім чынам, развіццё культуры ў Полацкім дзяржаўным універсітэце мае працяглыя і ўстойлівыя традыцыі. Творчыя дасягненні выкладчыкаў, супрацоўнікаў і студэнтаў універсітэта на розных этапах развіцця НПІ – ПДУ станавіліся вядомымі далёка за межамі наваполацкай навучальнай установы. Традыцыі, дасягненні, вядомасць стваралі і працягваюць ствараць умовы для развіцця паўнавартаснай, творчай асобы. Полацкі дзяржаўны універсітэт склаўся як сапраўдны цэнтр культурнага жыцця на старажытнай Полацкай зямлі.

# История развития спорта в Полоцком государственном университете (1968 – 2008 гг.)

Несмотря на довольно небольшой по меркам человеческой жизни возраст спортивная история нашего университета богата на события и достижения.

Не обладая возможностями областных, не говоря уже о столичных, вузов в плане материально-технического обеспечения, наличия спортивных сооружений, спортсмены и преподаватели института создали свою спортивную школу – имена многих из них, как спортсменов, так и тренеров, широко известны за пределами нашей Родины и являются гордостью всей Беларуси.



*Н. А. Потехин*

Несомненно, что нынешний потенциал Полоцкого государственного университета не идет ни в какое сравнение с возможностями Новополоцкого филиала БТИ им. С.М. Кирова конца 60-х – начала 70-х годов XX в., но именно тогда закладывалась база нынешних побед. Правда, тогда мы считали студентов, сдавших нормы ГТО, а теперь – призеров и чемпионов Европы, мира, Олимпийских Игр.

Почти одновременно с образованием Новополоцкого филиала начала свою работу секция физвоспитания, которую возглавил Н.А. Потехин, мастер спорта СССР по легкой атлетике.

В то далекое время из-за нехватки квалифицированных преподавателей-тренеров многие студенты, которые хотели заниматься такими видами спорта, как лыжный, волейбол, шахматы, не могли осуществить свое желание. Зал института был еще не совсем приспособлен для проведения учебных и тренировочных занятий, испытывался острый недостаток спортивного инвентаря. На первых городских спартакиадах команды института уступали техническим училищам и даже музыкальному. В то время как во всех вузах страны занятия по физическому воспитанию (обязательные и факультативные) проводились на протяжении всего срока обучения, в нашем институте в первые годы они планировались только для 1 и 2 курсов. Так, до 1970 г. не было подготовлено ни одного разрядника.

Для активизации спортивно-массовой работы среди студентов и преподавателей был образован спортивный клуб. Это была общественная организация, в которой работали люди, любящие спорт и физическую культуру. В это же время начинается строительство простейших плоскостных спортсооружений (хоккейного корта, открытой спортивной площадки), спорткомплекса, включающего лыжную базу, тир.



*П. Я. Ковалевский*

Уже в 1971 г. появились первые значимые спортивные успехи – команда хоккеистов заняла третье место, а совсем молодая команда по гандболу вышла в финал Республиканского первенства Белсовета СДСО «Буревестник» (аналог нынешней Республиканской универсиады).

В ноябре 1972 г. было избрано первое правление спортивного клуба, председателем которого на общественных началах стал мастер спорта по вольной борьбе П.Я. Ковалевский. С сентября 1975 г. должность председателя спортивного клуба включается в штат. Руководителями спортклуба в разные годы (до 1986 г.) были С.А. Якубов, В.М. Наскалов, Л.С. Зайцева, Г.Г. Шевкунов, И.Б. Белов, А.Ф. Леонов, В.М. Панкратьев.

Спортивный клуб становится первичной организацией, основным звеном физкультурно-массовой и спортивной работы в вузе. Работа спортклуба планировалась на основании календаря спортивно-массовых мероприятий. Организовывались первые секции по баскетболу (мужская и женская), гандболу (мужская), легкой атлетике и вольной борьбе.

